WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

13 ЛЮТАГА 2010 г.
СУБОТА
№ 27
(26635)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

БЕЛАРУСЬ — ГЭТА МЫ!

Сёлета такі заклік прагучыць больш як 100 разоў па ўсім свеце — ад нашай краіны да Кітая

Грамадска-культурная акцыя «Беларусь — гэта мы» стартавала ўрачыста, узнёсла і ў меру пафасна: з сустрэчы міністра культуры, кіраўнікоў вядучых установ і калектываў, папулярных артыстаў і журналістаў у Нацыянальным тэатры оперы. Аднак ужо ў найбліжэйшыя дні ініцыятыва творчай інтэлігенцыі краіны выйдзе з музычнага храма ў народ — у самым прамым сэнсе. Бо ўсё самае лепшае, што ёсць на сёння ў нацыянальнай культуры, будзе дэманстравацца на сцэнічных пляцоўках і ў выставачных залах не толькі абласных цэнтраў, але і малых гарадоў, і не толькі ў Беларусі. Цягам года пройдзе каля 100 творчых праектаў — канцэртаў, спектакляў, выстаў, аглядаў-конкурсаў прафесійнага і аматарскага мастацтва.

Сярод мэтаў акцыі міністр культуры Павел Латушка назваў не толькі дэманстрацыйную — паказаць самыя яскравыя і прафесійныя творчыя напрацоўкі апошняга часу, — але і асветніцкую — дайсці практычна да кожнага жыхара Беларусі і звярнуць увагу грамадства на тое, што «культура — вельмі важны фактар пабудовы квітнеючай, незалежнай краіны». «Культура сапраўды аб'ядноўвае грамадства, — падкрэсліў міністр, — гэта наша агульнае багацце, якое ўсе мы разам павінны захоўваць і прымнажаць».

У спісе ўдзельнікаў што ні імя ці назва — то мастацкая велічыня: Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі, Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі, народны хор імя Г. Цітовіча і народны аркестр імя І. Жыновіча, Прэзідэнцкі аркестр Беларусі, Дзяржаўны ансамбль танца, харэаграфічны ансамбль «Харошкі», салісты Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, ансамблі «Песняры», «Сябры», «Верасы», народныя артысты Беларусі Аляксандр Ціхановіч і Ядзвіга Паплаўская, заслужаныя артысты Ына Афанасьева і Ірына Дарафеева, артысты Моладзевага тэатра эстрады... Зрэшты, будзе і дастаткова шмат пачаткоўцаў, для якіх удзел у акцыі стане своеасаблівым творчым экзаменам перад публікай.

І Ў КРАМЛІ, І Ў ЛУЎРЫ

Распачнецца акцыя ўжо ў гэту нядзелю — 14 лютага ў Гомелі адбудзецца канцэрт «Я люблю Беларусь!» маладых, але ўжо добра вядомых публіцы выканаўцаў Ані Шаркуновай і Германа. «Я сапраўды вельмі люблю Беларусь, і мне здаецца, вельмі сімвалічна, што менавіта ў Дзень закаханых я скажу гэта са сцэны, бо любоў не абмяжоўваецца толькі пачуццямі мужчыны да жанчыны або маці да дзяцей. Я хачу пагаварыць з гледачамі пра любоў да роднай зямлі, да нашых малых радзімаў і да нашай Радзімы ў цэлым», — падкрэсліла спявачка.

Неўзабаве акцыю працягнуць канцэрт «Харошак» у Брэсце, канцэрт хору імя Г. Цітовіча ў Полацку (культурная сталіца Беларусі ўвогуле будзе задзейнічана ў акцыі вельмі актыўна), традыцыйны зборны канцэрт да Дня Незалежнасці ля абеліска «Мінск — горад-герой», усерэспубліканская выстава мастакоў розных пакаленняў, І Міжнародны фестываль опернага мастацтва ў сталіцы, а таксама шэраг мерапрыемстваў за межамі Беларусі.

СТАР. 2

«Ах, Валянцін, Валянцін!..»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

БЕЛАРУСЬ РАТЫФІКАВАЛА ПРАТАКОЛ ДА ПАГАДНЕННЯ З РАСІЯЙ АБ УМОВАХ ПАСТАВАК НАФТЫ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўказам ад 12 лютага зацвердзіў Пратакол аб унясенні змяненняў у Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Расійскай Федэрацыі аб мерах па ўрэгуляванні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва ў галіне экспарту нафты і нафтапрадуктаў ад 12 студзеня 2007 года.

Указам выказана згода Беларусі на абавязковасць для яе гэтага пратакола. Такім чынам, Беларусь, таксама як і Расія, своечасова выканала ўнутрыдзяржаўныя працэдуры, неабходныя для ўступлення ў сілу гэтага дакумента.

У адпаведнасці з указам Савету Міністраў Беларусі даручана прыняць меры, неабходныя для рэалізацыі пратакола.

Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Пратакол аб унясенні змяненняў у Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Расійскай Федэрацыі аб мерах па ўрэгуляванні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва ў галіне экспарту нафты і нафтапрадуктаў ад 12 студзеня 2007 года быў падпісаны ў Маскве 27 студзеня 2010 года. У адпаведнасці з гэтым дакументам вывазной мытнай пошлінай не абкладаецца нафта, якая транспартуецца з Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліку Беларусь, выходзячы з гадавога аб'ёму ўнутранага спажывання рэспублікай расійскай нафты. На 2010 год гэты аб'ём устаноўлены ў памеры 6,3 млн тон. Памер мытнай пошліны на нафту, якая вывозіцца з Расіі звыш пастаўляемага ў бяспошлінным рэжыме аб'ёму нафты, вызначаецца выходзячы са ставак, устаноўленых у адпаведнасці з заканадаўствам Расіі.

Учора завяршыў ратыфікацыю пратакола аб умовах пастаўкі нафты ў Беларусь і парламент Расіі. На пазачарговым пасяджэнні дакумент адобрыла верхняя палата — Савет Федэрацыі, крыху раней пратакол быў ратыфікаваны дэпутатамі Дзярждумы Расіі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У ВЫХАДНЫЯ — МОЦНЫЯ СНЕГАПАДЫ, А З ПАНЯДЗЕЛКА ЗНОЎ ПАХАЛАДАЕ

У суботу і нядзелю з боку Гомельскай вобласці да нас завітае моцны паўднёвы цыклон і праз тэрыторыю краіны пачне рухацца актыўны атмасферны фронт, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.

Амаль паўсюдна ў суботу пройдзе снег, мокры снег, месцамі мяцеліца, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Уначы мінус 4—10, удзень — 0—6 марозу. У нядзелю час ад часу будзе ісці снег, мокры снег, месцамі, галоўным чынам у цэнтральных рэгіёнах, моцныя снегапады, па паўднёвым усходзе галалёд, на дарогах галалёдзіца.

На працягу сутак 0—7 марозу, уначы па Віцебскай вобласці да мінус 9.

У пачатку наступнага тыдня інтэнсіўнасць ападкаў паменшыцца, толькі месцамі будзе назірацца невялікі снег. Аднак уначы пахаладае да мінус 4—11, пры праясненнях да 13 марозу, удзень — 0—мінус 6. Нейкага істотнага пацяплення сіноптыкі пакуль не бачаць, бо нават да канца лютага прагназуюць няўстойлівае зімовае надвор'е.

Сяргей КУРКАЧ.

Фота Васіля ЗЯНЬКО, г. Столбцы.

НА ПРАСПЕКЦЕ ПЕРАМОЖЦАЎ СЁННЯ МІНЧАНЕ ШЫРОКА БУДУЦЬ СВЯТКАВАЦЬ МАСЛЕНІЦУ

Наведвальнікаў кірмашу чакаюць разнастайныя бліны: з маслам і смятанай, з салам і каўбаскай, з ікрой, для ласуноў — з макам і варэннем. Пройдуць конкурсы, а таксама па лаяльных коштах будуць рэалізоўвацца паўфабрыкаты, вяндліна, каўбасы, малочныя прадукты, тарты.

Алена КЛІМКОВІЧ, «Мінск—Навіны».

Старшыня Гомельскага аблвыканкама Аляксандр ЯКАБСОН:

«ТРЭБА ПРАВОДЗІЦЬ МАЗГАВУЮ АТАКУ»

— Год быў няпросты для эканомікі, у тым ліку эканомікі Гомельскай вобласці. Тым не менш, мы дастаткова ўстойліва спрацавалі. Па асноўных вытворчых паказчыках — ёсць прырост. Не паўсюль выкананыя прагнозныя паказчыкі, але ж прырост ёсць, і гэта вельмі каштоўна, — старшыня Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Якабсон падкрэслівае, што эканоміка Гомельшчыны выглядае даволі сцвярджальна. — Першы сёлетні месяц дае надзею, што 2010 год будзе яшчэ больш станоўчым.

Аб мэтах

— Ёсць класічная схема, што трэба для таго, каб дзяржава была самадастатковай: вырабляць па 1 тоне збожжа на грамадзяніна, будаваць па 1 кв. м жылля на чалавека, мець па 1 тоне нафты на грамадзяніна або такую эканоміку, каб можна было яе купіць. Тады не страшныя ніякія катаклізмы. Мы на сваіх не вельмі багатых землях ідзём да гэтай мэты паступова. Па збожжы, па жыллі — атрымліваецца. А каб купляць нафту, трэба добра працаваць, выконваць прагнозныя паказчыкі.

Аб інвестыцыях

— Год 2010-ы абвешчаны Годам якасці, а якасць сёння — гэта канкурэнтаздольнасць прадукцыі. Калі прадукцыя будзе канкурэнтаздольнай, яна будзе прадавацца, мы будзем спраўляцца з тымі задачамі, якія перад намі ставяць кіраўнік дзяржавы і ўрад. Сёння немагчыма казаць аб развіцці эканомікі без прыцягнення і эфектыўнага выкарыстання інвестыцый у асноўны капітал. Летась у Гомельскую вобласць было прыцягнута каля 7 трыльёнаў рублёў — гэта амаль на 18 % больш, чым у 2008 годзе. Увесь бюджэт Гомельскай вобласці складае каля 2 трыльёнаў. Пры гэтым трэцяя частка сумы — каля 2,5 трыльёна рублёў — інвеставана ў асноўны капітал камунальнымі арганізацыямі вобласці. На фоне такіх гігантаў, як МНПЗ, БМЗ, Гомсельмаш, — гэта вялікія грошы і сур'ёзны ўнёсак у развіццё эканомікі невялікіх прадпрыемстваў, якія займаюцца перапрацоўкай малака, мяса, агародніны. На сёння са сваімі фінансамі і тэхналогіямі да нас прыйшоў бізнэс з 27 краін свету. Самыя актыўныя інвестары — гэта Аўстрыя, Расія, Францыя, Вялікабрытанія, Германія...

Аб дзяржаўнай маёмасці

— Яшчэ адзін важны напрамак эканамічнага развіцця — эфектыўнае выкарыстанне дзяржаўнай маёмасці. Хачу верыць, што лідзіруючыя пазіцыі ў гэтым напрамку мы зможам захаваць і ў будучыні. Сёлета 940 аб'ектаў, якія не выкарыстоўваюцца, трэба прыцягнуць у гаспадарчы абарот — кінутыя ваенныя гарадкі, аб'екты ў чарнобыльскай зоне і гэтак далей — тут яшчэ шмат працы. На Гомельскім заводзе пускавых рухавікоў ёсць дзясяткі тысяч квадратных метраў вытворчых плошчаў, якія не выкарыстоўваюцца. Завод Кірава мае такую ж пляцоўку. Усе спробы выставіць гэтыя плошчы на аўкцыён пакуль станоўчых вынікаў не даюць. Туды патрэбны магутны інвестар. Хоць, калі казаць увогуле, з прызначэннем новага кіраўніка Гомельскага абласнога тэрытарыяльнага фонду дзяржаўнай маёмасці Кацярыны Зянкевіч гэтая праца сур'ёзна пачала рухацца. Мы значна больш прадаём аб'ектаў, што не выкарыстоўваюцца.

СТАР. 2

БЕЛИНВЕСТБАНК

СООБЩАЕТ

25 февраля 2010 года в помещении Центрального банка по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 29 в 11.00 проводится внеочередное общее собрание акционеров банка в заочной форме.

В повестку дня внеочередного общего собрания акционеров банка (далее – Собрание) внесены следующие вопросы:

1. О процедурных вопросах.
2. Об утверждении изменений в Устав Открытого акционерного общества «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк».
3. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Дата формирования реестра владельцев акций, на основании которого составляется список лиц, имеющих право на участие в Собрании, – 11 февраля 2010 года.

Бюллетени для заочного голосования, иную информацию о проведении собрания лица, имеющие право на участие в нем, могут получить под роспись при обращении в банк по адресу: 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29, или в его филиалы по месту учета акций до 19 февраля 2010 года.

Окончательная дата представления заполненных бюллетеней для заочного голосования – 22 февраля 2010 года.

Телефоны для справок: (8 017) 239 01 41, 239 01 42.

www.belinvestbank.by

Открытое акционерное общество
«Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк»:
220002, г. Минск, пр. Машерова, 29. УНП 807000028.
Лицензия на осуществление банковской деятельности
Национального банка Республики Беларусь № 3 от 27.10.2006.

СЭКАНД-ХЭНД ПАД ВЫГЛЯДАМ БЯСПЛАТНАЙ ДАПАМОГІ

У выніку «прадпрымальніцкай» дзейнасці шэрагу бізнэсменаў, кіраўнікоў і службовых асобаў бюджэту Беларусі нанесены шматмільярдны ўрон

Галоўным следчым упраўленнем папярэдняга расследавання МУС нашай краіны завершана расследаванне дзвюх крымінальных спраў, звязаных з ухіленнем ад выплаты мытных пошлін і падаткаў, матэрыялы перададзеныя на разгляд у суд.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, у прыватнасці, абвінавачанне прад'яўленае некалькім індывідуальным прадпрымальнікам, а таксама кіраўнікам і службовым асобам шэрагу грамадскіх аб'яднанняў («Віцязь», «Баркос», «Садзейнічанне сацыяльнай абароне», «Крок ад Чарнобыля», «Клопат аб дзецях», Клопат аб будучым»). Як выявілася, падазроныя на працягу 2005—2007 гадоў ажыццяўлялі ўвоз на тэрыторыю краіны камерцыйных партый адзення, якое было ў спажыванні. Разам з тым, сэканд-хэнд паступаў у краіну пад выглядам замежнай бясплатнай дапамогі і з дапамогай згаданых грамадскіх арганізацый неабгрунтавана вызваляўся ад мытных плацяжоў. Бюджэт ад такога «нахабства», а таксама іншых выяўленых злачынстваў, атрымаў урон на 5 мільярдаў рублёў. Між іншым, у ходзе следства была забяспечана яго кампенсацыя ў памеры 800 мільёнаў рублёў.

Суда чакаюць яшчэ каля сарака чалавек, сярод якіх кіраўнікі структурных падраздзяленняў, іншыя службовыя асобы Ашмянскай мытні і прадстаўнікі шэрагу суб'ектаў гаспадарчай прыватнай формы ўласнасці. Гэтыя «дзялкі» на працягу 2001—2004 гадоў у складзе злачыннай арганізацыі імпартавалі ў краіну мэблю, будаўнічыя матэрыялы і іншыя тавары без платы мытных пошлін, падаткаў і збораў. Дарэчы, супрацоўнікі мытні, якія злоўжылі службовымі паўнамоцтвамі пры афармленні грузаў, атрымалі ў якасці хабару каля 400 тысяч долараў ЗША. Дзяржаўная казна ад такіх дзеянняў згубіла 19,5 мільярда рублёў, з якіх каля 2,5 мільярда кампенсавана ў ходзе следства.

Ігар ГРЫШЫН.

СТАРТАВАЎ НАЦЫЯНАЛЬНЫ АДБОР НА ДЗІЦЯЧАЕ «ЕЎРАБАЧАННЕ»

Рэспубліканскі дзіцячы конкурс, у адрозненне ад дарослага «калегі», назву і фармат не памяняў — беларускі адбор па-ранейшаму называецца «Песня для Еўрабачання» і запрашае да ўдзелу выканаўцаў ва ўзросце ад 10 да 15 гадоў. Менавіта столькі артыстам павінна быць на момант правядзення міжнароднага конкурсу. Да адбору дапускаюцца раней не апублікаваныя песні на беларускай ці рускай мове, працягласцю не больш як 2 хвіліны 45 секунд, прытым напісаныя самімі канкурсантамі (але дазваляецца і дапамога дарослых). Кандыдаты на дзіцячае «Еўрабачанне» павінны ў тэрмін да 30 сакавіка адправіць каштоўную бандэроль на адрас: 220807, г. Мінск, вул. Макаёнка, 9 з паметкай «На рэспубліканскі конкурс «Песня для Еўрабачання».

Сам конкурс традыцыйна адбудзецца ў тры этапы: адборачны тур (вынікі падводзяцца ў красавіку), паўфінал (запланаваны ў чэрвені) і фінал у форме гала-канцэрта (у верасні). Пераможца фіналу, вызначаны сумесна тэлефонным галасаваннем і галасаваннем прафесійнага журы, і прадставіць нашу краіну на дзіцячым «Еўрабачанні-2010».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 13.02.2010 г. (для б/н разлікаў)

Агенцтва УладзіміраГраўцова

1 долар ЗША	2 898,00
▼1 еўра	3 946,79
1 латвійскі лат	5 570,93
1 літоўскі літ	1 143,96
1 чэшская крона	151,91
1 польскі злоты	986,20
▼1 расійскі рубель	96,09
1 украінская грыўня	361,35

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	30,1595
10 UAH	37,5118
1000 BYR	10,4034
EUR	41,1737

ISSN 1990 - 763X

белагропромбанк
традиции будущего

ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

с 15 марта 2010 г.

Сумма депозита, ед. валюты	Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками, % годовых: Срок, дни 100	200	300	500	1 000	2 000	3 000	Вклады (депозиты) с фиксированными процентными ставками, % годовых: Срок, дни 100	200	300	500	1 000	2 000
Белорусские рубли													
1 – 1 000 000	14,25	16,25	19,00	20,00	20,50	21,00	21,50	10,50	11,80	13,60	13,90	14,20	14,50
1 000 001 – 10 000 000	14,75	16,75	19,50	20,25	20,75	21,25	21,75	10,60	11,90	13,70	14,00	14,30	14,75
10 000 001 и более	15,25	17,25	20,00	20,50	21,00	21,50	22,00	10,70	12,00	13,80	14,10	14,40	15,00
Доллары США													
1 – 500	4,25	6,25	6,75	7,25	7,75	8,05	8,35	2,50	4,00	5,50	6,00	6,50	7,00
501 – 5 000	4,75	6,50	7,00	7,50	7,90	8,20	8,50	3,00	4,50	5,75	6,25	6,75	7,25
5 001 и более	5,25	6,75	7,25	7,75	8,05	8,35	8,75	3,50	5,00	6,00	6,50	7,00	7,50
Евро													
1 – 500	4,25	6,25	6,75	7,25	7,75	8,05	8,35	2,50	4,00	5,50	6,00	6,50	7,00
501 – 5 000	4,75	6,50	7,00	7,50	7,90	8,20	8,50	3,00	4,50	5,75	6,25	6,75	7,25
5 001 и более	5,25	6,75	7,25	7,75	8,05	8,35	8,75	3,50	5,00	6,00	6,50	7,00	7,50
Российские рубли													
1 – 15 000	7,50	9,50	10,00	10,50	11,00	11,30	11,60	5,50	7,50	8,00	8,50	9,00	10,00
15 001 – 150 000	8,00	9,75	10,25	10,75	11,15	11,45	11,75	6,00	7,75	8,25	8,75	9,50	10,50
150 001 и более	8,50	10,00	10,50	11,00	11,30	11,60	12,00	6,50	8,00	8,50	9,00	10,00	11,00

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136

Время работы Контакт-Центра Банка:
8.00 - 20.00 - рабочие дни;
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ.
Звонок с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) - по тарифам операторов мобильной связи.

Подробные условия вклада «Линия роста» в газетах: «Советская Белоруссия» № 49 от 16.03.2006, «Звязда» № 50 от 04.03.2006, на сайте банка в сети Интернет – www.belapb.by и в офисах ОАО «Белагропромбанк». Сохранность средств во вкладах ОАО «Белагропромбанк» обеспечивается в соответствии с законодательством РБ. Информация о размере процентов, выплаченных по вкладам в течение последнего финансового года, – в офисах и на сайте банка – www.belapb.by. Сведения о выплаченных процентах по срочным вкладам (депозитам) ОАО «Белагропромбанк» в 2009 году в эквиваленте, млн. бел. рублей:

январь	февраль	март	апрель	май	июнь	июль	август	сентябрь	октябрь	ноябрь	декабрь	итого
17 034,9	18 992,1	22 929,6	22 257,7	20 483,6	21 032,6	20 270,5	20 059,1	19 557,1	20 205	21 320,3	22 134,4	246 277

ОАО «Белагропромбанк». Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 22.07.2009 № 2. УНП 100693551.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ МЯДЕЛЬСКОГО РАЙПО (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания магазина, расположенного по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, г.п. Кривичи, ул. 17 Сентября, 78.

Начальная цена с НДС – 12 000 000 бел. руб. Площадь земельного участка 0,0502 га. Задаток 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 5 (пяти) дней со дня подписания договора, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **16.03.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.03.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

Сусветная супольнасць не атрымала ўрокаў з афганскай вайны

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка напярэдадні Дня памяці звярнуўся да воінаў-інтэрнацыяналістаў, ветэранаў вайны ў Афганістане.

«Афганская вайна была апошняй вайной Савецкага Саюза, але не апошняй на зямлі. На жаль, сусветная супольнасць не атрымала з яе ўрокі, — гаворыцца ў пасланні. — Воіны-інтэрнацыяналісты першымі ў свеце кінулі выклік міжнароднаму тэрарызму і назаўсёды засталіся адданымі ваеннай прысязе і баявому брацтву». «Сёння мы шануем памяць загінулых у гэтай вайне. Падзяляем боль страты з усімі, хто не дачакаўся з Афганістана сваіх родных і блізкіх. Выказваем удзячнасць тым воінам-інтэрнацыяналістам, якія, вярнуўшыся на родную зямлю, занялі актыўную жыццёвую пазіцыю па падтрыманні міру і згоды ў грамадстве, патрыятычнаму выхаванню падрастаючага пакалення». Аляксандр Лукашэнка пажадаў воінам-інтэрнацыяналістам, іх родным і блізкім здароўя, шчасця, дабрабыту і поспехаў.

Віншаванне Прэзідэнта

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 12 лютага ў тэлефоннай размове павіншаваў Віктара Януковіча з перамогай на прэзідэнцкіх выбарах ва Украіне.

Субяседнікі абмяняліся думкамі па актуальных пытаннях двухбаковага беларуска-ўкраінскага супрацоўніцтва, перспектывах развіцця гандлёва-эканамічных адносінаў дзвюх краін.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Грамадска-кансультатыўны савет пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі прадоўжыць работу

Старшыня Грамадска-кансультатыўнага савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей 11 лютага завяршыў серыю кансультацый з членамі ГКС. Аб гэтым карэспандэнту **БЕЛТА** паведаміў сакратар савета Уладзімір Шпакоўскі.

У выніку праведзеных кансультацый члены савета сышліся на думцы, што існаванне ГКС апраўдала сябе. Савет стаў унікальнай пляцоўкай для ўзаемадзеяння прадстаўнікоў органаў дзяржаўнай улады і грамадскіх структур. Уладзімір Макей адзначыў, што ўсе прапановы членаў ГКС, якія паступілі ў ходзе кансультацый, будуць абагульнены і ўлічаны пры арганізацыі яго далейшай дзейнасці. Будзе ўдасканалены парадак работы ГКС, бліжэйшае пасяджэнне якога плануецца правесці ў маі 2010 года.

Аргкамітэт па падрыхтоўцы Дня беларускага пісьменства-2010 правёў першае пасяджэнне ў Хойніках

Учора адбылося першае пасяджэнне нацыянальнага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Дня беларускага пісьменства ў горадзе Хойнікі Гомельскай вобласці 5 верасня 2010 года, перадае **БЕЛТА**.

Пасяджэнне прайшло пад старшынствам намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Уладзіміра Патупчыка. У абмеркаванні па арганізацыі мерапрыемства таксама прынялі ўдзел міністр інфармацыі Алег Праляскоўскі, старшыня Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Якабсон, а таксама прадстаўнікі іншых міністэрстваў.

Паводле слоў Уладзіміра Патупчыка, свята ў Хойніках, на радзіме беларускага пісьменніка Івана Мележа, будзе адрознівацца ад падобных мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў іншых райцэнтрах. «Тут ёсць свае ўнікальныя традыцыі, якія нам хацелася б захаваць. Наша задача — раскрыць патэнцыял гэтага рэгіёну, паказаць культурныя традыцыі мясцовых жыхароў, зрабіць усё, каб удзельнікі і госці свята засталіся задаволеныя», — падкрэсліў ён. Віцэ-прэм'ер адзначыў, што рэспубліканскае мерапрыемства запатрабуе значных сродкаў на добраўпарадкаванне райцэнтра. Паводле папярэдніх даных, на фінансаванне трэба больш за Br82 млрд. Напрыклад, неабходна рэканструкцыя сядзібы XIX стагоддзя, гарадскога парку, стадыёна, Дома культуры, аддзяленняў сувязі, банка і іншых сацыяльных аб'ектаў. Акрамя таго, у парадак будуць прыведзіцца сацыяльныя аб'екты і ў вёсцы Глінішча — на малой радзіме Івана Мележа.

На працягу бліжэйшага тыдня па выніках пасяджэння будуць дапрацаваны даручэнні і план мерапрыемстваў.

Дзень беларускага пісьменства — нацыянальнае свята і праводзіцца штогод у першую нядзелю верасня ў адпаведнасці з указам Прэзідэнта Беларусі ад 26 сакавіка 1998 года № 157 «Аб дзяржаўных святах, святочных днях і памятных датах у Рэспубліцы Беларусь». У аснове канцэпцыі Дня беларускага пісьменства ідэя прапаганды здабыткаў пісьменства, культуры, пераемнасці духоўных традыцый Беларусі. Свята дае ўнікальную магчымасць сустрэцца з жывым словам, з удзельнікамі творчага працэсу па стварэнні кніг, газет, часопісаў.

Аляксандр РАДЗЬКОЎ:

«Пошук задач для суперкамп'ютара — надзвычай цікавая задача»

СУПЕРКАМП'ЮТАРНАЯ тэхніка «прапісалася» ў сценах беларускіх ВНУ! Гучыць неверагодна, аднак гэта ўжо рэальнасць. Усяго пяць—дзесяць гадоў таму суперкамп'ютары лічыліся элітнай тэхнікай, а сёння доступ да работы на іх атрымалі студэнты Беларускага і Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэтаў. Учора ўрачыстае адкрыццё суперкамп'ютарнага цэнтра адбылося ў сценах БДУ.

Трэба патлумачыць, што суперкамп'ютар «СКІФ К-1000-05» з'яўляецца сумеснай распрацоўкай вучоных Беларусі і Расіі, створаны у рамках праграмы Саюзнай дзяржавы «Суперкамп'ютарная ініцыятыва «Фенікс». Яго кошт складае каля 840 тысяч долараў ЗША. Аднак БДУ атрымаў гэту цуда-тэхніку ад Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, спецыялісты якой стварылі «разумную машыну», абсалютна бясплатна. Дарэчы, рэктар БДУ Сяргей Абламейка таксама мае самае непасрэднае дачыненне да стварэння «СКІФаў», паколькі раней узначальваў інстытут, задзейнічаны ў рэалізацыі праграмы Саюзнай дзяржавы.

— Нас не можа не радаваць той факт, што «СКІФы» перасталі быць адзінкавымі экзэмплярамі, і сёння ў нас ужо ёсць цэлае «сямейства» такіх машын, — падкрэсліў на цырымоніі адкрыцця суперкамп'ютарнага цэнтра **старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Міхаіл МЯСНІКОВІЧ**. — «СКІФы» актыўна выкарыстоўваюцца ў Аб'яднаным інстытуце праблем інфарматыкі НАН, у нашым інстытуце ў Соснах, у НДІ ЭВМ, НДУ ваенпрама, а таксама прадпрыемствамі-экспарцёрамі: МАЗам, БелАЗам, МТЗ... Адным словам, і ў рэальным сектары эканомікі, і ў акадэмічнай, а цяпер яшчэ і ва ўніверсітэцкай навуцы...

Па словах **дырэктара Цэнтра інфармацыйных тэхналогій БДУ Юрыя ВАРАТНІЦКАГА**, адна з прынцыповых задач, якія трэба будзе вырашаць у найбліжэйшы час, — інтэграцыя суперкамп'ютара ў адукацыйны працэс, навучанне студэнтаў паралельным вылічэнням і паралельнаму праграмаванню. Немалаважна, што доступ да вылічальных магчымасцяў суперкамп'ютара будуць мець усе карыстальнікі карпаратыўных інфармацыйных сетак БДУ, між іншым, гэта 4100 камп'ютарызаваных месцаў. А ў перспектыве магчымасцямі новага суперкамп'ютарнага цэнтра Белдзяржуніверсітэта змогуць карыстацца ўсе беларускія ВНУ. Для гэтага трэба толькі наладзіць на яго базе вузел нацыянальнай і міжнароднай сетак размеркаваных вылічэнняў — ГРЫД-сетак. «Сусветная ГРЫД-сетка як сродак сумеснага выкарыстання вылічальных магутнасцяў і базаў звестак ідзе на змену не заўсёды надзейнаму інтэрнэту з яго веб-паслугамі», — упэўнены Юрыя Варатніцкі.

Дарэчы, у Расіі, суперкамп'ютары ёсць толькі ў чатырох ВНУ, у тым ліку у Маскоўскім і Санкт-Пецярбургскім універсітэтах.

— Хуткасць усталяванага ў БДУ суперкамп'ютара складае 2,5 трлн аперацый у секунду — гэта фантастычная хуткасць, — падкрэсліў у гутарцы з журналістамі **міністр адукацыі Аляксандр РАДЗЬКОЎ**. — Суперкамп'ютар «СКІФ» дазваляе арганізоўваць навуковыя даследаванні паралельна па некалькіх накірунках, прычым абсалютна не звязаных паміж сабой. Напрыклад, студэнты біяфака могуць праводзіць на «СКІФе» свае даследаванні, адначасова з гэтым канструктарскае бюро завода можа праектаваць на той жа машыне нейкую суперсучасную дэталь, а студэнты-лінгвісты праводзіць лінгвістычны эксперымент. Пошук задач для суперкамп'ютара — гэта надзвычай цікавая задача, над якой таксама трэба думаць.

Чытачоў «Звязды», напэўна, цікавіць, як выглядае славуты суперкамп'ютар. «СКІФ К-1000-05» займае ў галоўным корпусе БДУ адносна невялікае памяшканне. Яго габарыты (без крыніц бесперабойнага сілкавання) складаюць 2,4 х 1,07 х 2,07 метра. Вага — 3,2 тоны. Колькасць працэсараў — 288 (144 двухпрацэсавыя вузлы на базе 64-разраднага працэсара Opteron-2200 МГц). Сумарны аб'ём аператыўнай памяці — 500 Гбайт. Сумарны аб'ём дыскавай памяці — 11 тэрабайт. Энергаспажыванне — 45 КВт. Паток паветра для ахаладжвання складае 4—8 тысяч кубаметраў у гадзіну.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Суперкамп'ютар — гэта вылічальная сістэма, якая дазваляе рабіць складаныя падлікі за кароткія прамежкі часу. Менавіта на гэту здольнасць і паказвае прыстаўка «супер». Традыцыйнай сферай прымянення суперкамп'ютараў з'яўляюцца навуковыя даследаванні: фізіка-плазмы і статыстычная механіка, малекулярная і атамная фізіка, тэорыя элементарных часціц і астрафізіка, квантавая хімія і малекулярная біялогія. Метэаролагам суперкамп'ютары дапамагаюць рабіць доўгатэрміновыя прагнозы, геолагам — знаходзіць і распрацоўваць радовішчы карысных выкапняў, хімікам — канструяваць новыя матэрыялы, напрыклад, каталізатары і звышправаднікі, фармацэўтам — ствараць новыя лекі і гэтак далей. Вынікамі суперкамп'ютарных праектаў карыстаюцца ў свеце аэракасмічная, аўтамабільная, суднабудаўнічая і радыёэлектронная галіны. Адна з першачарговых задач для беларускага суперкамп'ютара «СКІФ»— правядзенне падлікаў, звязаных з будаўніцтвам беларускай АЭС.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

«Факт адсутнасці ў рэалізацыі беларускіх яблыкаў пацвердзіўся...»

«З пачатку года не магу набыць у такіх крамах, як «Еўраопт», «Белмаркеткампані», гандлёвы цэнтр «Усход», «Белванс», «Гіпа» беларускія яблыкі. У продажы ёсць прадукцыя з Малдовы, Польшчы, Нідэрландаў, Бельгіі, Германіі, Чылі, але толькі не з нашай краіны. Польскія яблыкі прадаюцца ў неабмежаванай колькасці па прымальным для зімовага часу кошце — 3,2—3,8 тысячы рублёў за кілаграм, нямецкія — па 6—8 тысяч, галандскія — па 10 тысяч рублёў за кілаграм і г.д. Чаму немагчыма купіць айчынныя яблыкі?» Такое пытанне паступіла ў рэдакцыю ад Пятра Андрэевіча Навуменкава з Мінска.

Зазначым, што ўвосень чытач ужо звяртаўся з аналагічным пытаннем. Тады са спасылкай на словы начальніка аддзела нарыхтовак і знешнеэканамічнай дзейнасці галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Вячаслава Бахановіча мы са старонак «Звязды», у прыватнасці, паведамлялі, што на міжсезонны перыяд яблыкаў для сталіцы нарыхтавана нават больш, чым планавалася першапачаткова. Дык чаму ж тады праз такі невялікі прамежак часу (ну не паспелі ж мы з'есці ўсе тыя нарыхтоўкі цалкам яшчэ да заканчэння зімы?) мог узнікнуць дэфіцыт? У чым праблема? Гэтыя пытанні «Звязда» мусіла адрасаваць **намесніку кіраўніка адміністрацыі Першамайскага раёна Мінска Юрыю ТРУШЧАНКУ**. Неўзабаве за яго подпісам мы атрымалі афіцыйны адказ.

«Паведамляем, што спецыялістамі аддзела гандлю і паслуг адміністрацыі раёна праведзена абследаванне адзначаных у вашым звароце, і не толькі, аб'ектаў гандлю. Факт адсутнасці ў рэалізацыі беларускіх яблыкаў пацвердзіўся ў краме «Суседзі», ТАА «Магерлэнд» і «БелМаркет» ІТАА «Белмаркеткампані».

У мэтах недапушчэння ў далейшым падобнай сітуацыі кіраўнікам гандлёвых арганізацый указана забяспечыць бесперапынную наяўнасць у рэалізацыі беларускіх яблыкаў і прыняць вычарпальныя меры па насычэнні гандлёвага аб'екта таварамі айчыннай вытворчасці (мова арыгінала. — **С.Р.**)».

Ну добра, што рэкамендавана прыняць вычарпальныя меры... А ўвогуле, калі задумацца, неяк сумна робіцца. Гэтая праблема з айчыннымі яблыкамі на паліцах крамаў, на рынках, як мы пісалі раней, перыядычна ўзнікае некалькі апошніх гадоў і нават дзесяцігоддзяў. Прычым урадзілі тыя яблыкі добра ці быў неўраджай — пакупнік, падаецца, усё адно апынаецца ў аднолькавым становішчы. Дык калі назіраецца недахоп пладоў па аб'ектыўных прычынах, сітуацыю хоць зразумець можна. А тут як?..

Дарэчы, у працяг «яблычнай тэмы». Нядаўна пастановай Міністэрства эканомікі гранічная гандлёвая надбаўка на свежыя яблыкі вызначана ў памеры 500 рублёў за кілаграм да закупачных (адпускных) цэнаў сельскагаспадарчых ці аптовых арганізацый і імпарцёраў. Гэта зроблена з мэтай забеспячэння роўнай карысці для гандлёвых арганізацый пры набыцці і рэалізацыі як айчыннай, так і дарагой імпартнай прадукцыі. Раней гранічныя гандлёвыя надбаўкі на свежыя яблыкі вызначаліся ў працэнтах да адпускных цэнаў арганізацый-вытворцаў, або цэнаў, сфарміраваных юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што закупілі тавар за межамі краіны. Будзем спадзявацца, што названы дакумент нейкім чынам дапаможа змяніць сітуацыю з айчыннымі яблыкамі ў гандлі да лепшага?..

Сяргей РАСОЛЬКА.

УРОН АД КРАДЗЯЖОЎ З БАНКАМАТАЎ ПЕРАВЫСІЎ BR700 МЛН

У сённяшнім нумары на 8-й старонцы «Звязда» паведамляе аб крадзяжы ў ноч на 11 лютага з банкамата ў вёсцы Арэхава Клічаўскага раёна. Як высветлілася, сігналы аб адсутнасці грошай у банкамаце паступалі на камп'ютар банка каля а палове першай ночы і напачатку чацвёртай ночы 11 лютага, паведамляюць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі. Аднак ніякіх захадаў рэагавання не было зроблена: у Клічаўскі РАУС інфармацыя аб крадзяжы паступіла толькі ў 17.34 у чацвер.

У МУС адзначаюць і тое, што летась па выніках абследавання гэтага аб'екта з мясцовага райадзела ў тэрытарыяльнае падраздзяленне згаданай фінансавай установы была накіраваная інфармацыя пра ўстараненне прычын і ўмоў, якія спрыяюць учыненню крадзяжоў. Аднак прадстаўнікі банка, падкрэсліваюць у міністэрстве, выказалі меркаванне пра немэтазгоднасць такога кроку, «таму што наяўнасць у банкамаце застрахаваная».

У МУС таксама праінфармавалі, што па факце крадзяжу з банкамата заведзена крымінальная справа, цяпер праводзіцца праверка ў дачыненні да службовых асобаў, якія не прынялі неабходных захадаў па папярэджанні крадзяжу грошай. «Трэба адзначыць, — падкрэсліваюць у міністэрстве, — што за дапушчаныя парушэнні заканадаўства ў гэтай сферы пракуратурай ужо расследуюцца дзве крымінальныя справы па факце невыканання службовых абавязкаў службовымі асобамі банкаў».

Летась, нагадваюць у міністэрстве, у сувязі з крадзяжамі з банкаматаў былі накіраваныя прапановы пра неабходнасць аснашчэння іх тэхнічнымі сродкамі аховы кіраўнікам усіх банкаўскіх устаноў. Аднак большасць адмовілася, маўляў, на гэта патрэбныя дадатковыя фінансавыя сродкі. У МУС канстатуюць і тое, што работа банкаўскіх устаноў па абсталяванні банкаматаў тэхнічнымі сродкамі сігналізацыі праводзіцца крайне марудна, хоць урон ад учыненых злачынстваў перавысіў 700 мільёнаў.

Ігар ГРЫШЫН.

Абзац

◢ У Беларусі штогод на рак грудной залозы захворваюць каля 30—35 мужчын, паведаміў падчас анлайн-канферэнцыі на сайце Белтэлерадыёкампаніі вядомы ўрач-анколаг Леанід Путырскі.

◢ Грузавік абваліў павільён на цэнтральным рынку ў Гродне. У той момант там працавалі 4 прадаўцы. Грузавік пры манеўры закрануў павільён, плошча абрушэння склала 3х15 м. Жанчыну — індывідуальнага прадпрымальніка з закрытай ЧМТ, страсеннем галаўнога мозгу і траўмай пазваночніка шпіталізавалі. Вядзецца разбор.

◢ Супрацоўнікі МНС ліквідавалі пажар у інтэрнаце Наваполацкага ліцэя будаўнікоў. Загарэлася ў пакоі на 3-м паверсе пяціпавярховага будынка. На момант пажару ў ліцэі ішлі заняткі, таму ў інтэрнаце было толькі 8 чалавек. У пакоі закопчаныя сцены і столь, знішчана маёмасць. Жыльцоў перасялілі ў іншы пакой. Як мяркуецца, прычынай стала кароткае замыканне музычнага цэнтра.

◢ Спецыяліст па каштоўных паперах аднаго з акцыянерных таварыстваў Віцебска скраў у акцыянераў дывідэнды на суму больш за Br11 млн. Як было ўстаноўлена праваахоўныя органамі, 55-гадовы спецыяліст, у абавязкі якога ўваходзіла налічэнне і пералічэнне дывідэндаў паштовымі пераводамі, адпраўляў іх на свой адрас. Пры гэтым ён вёў улік тых акцыянераў, хто працуе на прадпрыемстве і ведае аб налічэнні даходу на акцыі, а асобна — тых, хто не працуе і не ведае. Такім чынам спецыяліст папаўняў свой бюджэт на працягу 1,5 года. Заведзена крымінальная справа.

◢ У Мазырскім раёне невядомы скраў больш як 30 вулічных ліхтароў. Ліхтары вонкавага асвятлення зніклі з лініі электрапередачы ў раёне вёскі Дразды. Урон склаў каля 6,5 млн рублёў. Ліхтары былі ўстаноўлены нядаўна. Мяркуецца, што зламыснік выкраў іх для продажу або для прамысловага выкарыстання. Вядзецца пошук падазроных.

◢ У Італіі 14-гадовую дзяўчынку паралізавала пасля прагляду фільма жахаў. Новы амерыканскі фільм жахаў «Паранармальная з'ява» выклікаў скандал у Італіі. Калі ў Брытаніі і ЗША на фільм наклалі ўзроставыя абмежаванні, то ў Італіі карціну можа ўбачыць любы ахвочы. Адразу пасля італьянскай прэм'еры ў службу выратавання сталі паступаць званкі ад аматараў кіно, якія скардзіліся на працяглыя прыступы панікі. Паводле слоў медыкаў, самым цяжкім выпадкам стала шпіталізацыя 14-гадовай дзяўчынкі ў стане паралічу. Спецыялісты канстатавалі, што нават рэкламны ролік фільма, які паказваюць па мясцовым тэлебачанні, тэрарызуе тысячы дзяцей.

Поўны абзац

◢ Паляўнічы адной куляй вырубіў дзве вёскі на Цярнопальшчыне. У выніку таго, што куля трапіла ў трансфарматар падстанцыі, без электрычнасці надоўга засталіся жыхары двух вялікіх сёлаў. Выязная аператыўная брыгада раёна электрасетак выявіла ў трансфарматары адтуліну ад кулі, праз якую, паводле папярэдніх ацэнак, выцекла паўтары тоны масла. Урон склаў 22,5 тыс. грыўняў. Энергетыкі выклікалі на месца супрацоўнікаў міліцыі, якія дасталі кулю і адправілі на экспертызу. Мяркуецца, што кулю выпусцілі паляўнічыя падчас палявання.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Ведай нашых!

Прызы — руплівым паштальёнам

...Дошка для аб'яў на новым сталічным доме з'явілася раней, чым першыя жыльцы. Тады ж забялелі абвесткі, кшталту: «Абліцоўка пліткай...», «Нацяжныя столі...», «Шафы-купэ...», «Адзенне» для вокнаў...», «Мэбля для Вас...» і гіблота іншага. У прынцыпе, чаканага.

Нечаканай была хіба пропісь: «Паважаныя навасёлы, калі Вы хочаце падпісацца на газеты і часопісы, патэлефануйце...»

Можна, маўляў, зрабіць гэта дома, не выходзячы з хаты, варта запрасіць паштальёна. І далей — яго прозвішча, імя, імя па бацьку, нумар тэлефона.

Не ведаю, ці шмат навасёлаў скарысталіся гэтай паслугай. Але яна была прапанаванай — неабыякавым, руплівым паштальёнам, які хварэе за справу, за падпіску наогул. І на нашу газету ў прыватнасці!

Каб вылучыць і заахвоціць іх, самых актыўных прапагандыстаў, яна, родная газета на роднай мове, заснавала адмысловы конкурс, у якім многія паштальёны ўжо выйгралі каштоўныя прызы. Днямі аўтарытэтная камісія пад старшынствам намесніка генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Ірыны Ігнацьеўны Саксонавай вызначыла чарговы пераможцаў. Першае месца занялі: Галіна Мікалаеўна Віктарава, паштальён аддзялення паштовай сувязі (АПС) Каплічы Калінкавіцкага раённага вузла паштовай сувязі (РВПС) (рост падпіскі на «Звязду» 25 экзэмпляраў), Жанна Міхайлаўна Мядзецец, паштальён АПС № 13 г. Полацка (рост падпіскі 24 экзэмпляры), Марыя Казіміраўна Бязродная (АПС Загорнае, Клецкага РВПС), Ганна Мікалаеўна Буйкевіч (АПС Ліпск, Ляхавіцкага РВПС), Святлана Іванаўна Герасімчык (АПС № 3 г. Шчучына), Вольга Васільеўна Савіч (АПС № 4 г. Мінска). Іх руплівая праца на карысць «Звязды» адзначана зусім не лішнімі ў гаспадарцы кухоннымі камбайнамі.

Другое месца з уручэннем новых электрачайнікаў прысуджана Вользе Уладзіміраўне Ларынай (АПС № 15 г. Полацка), Кацярыне Іосіфаўне Жагоравай (АПС Мікулічы Бярэзінскага РВПС), Тамары Аляксандраўне Мышкавец (АПС Колкі Петрыкаўскага РВПС), Сабіне Францаўне Кабак (АПС Станцыя Ашмяны), Вользе Уладзіміраўне Адашчык (АПС № 9 г. Баранавічы).

На трэцім месцы Наталля Іванаўна Кушнерава (АПС Глубоцкае Гомельскага РВПС), Тамара Паўлаўна Таболіна (АПС № 9 г. Слуцка), Надзея Іванаўна Селівонік (АПС № 23 г. Брэста). Яны будуць узнагароджаны фотаальбомам Анатоля Клешчука «Пад небам Беларусі». З аўтографам аўтара.

Па выніках працы адзначаны і лепшыя кіяскёры, у якіх, лічы, кожны экзэмпляр «Звязды» ў другім паўгоддзі 2009 года знаходзіў (і, упэўнены, знаходзіць цяпер) свайго пакупніка. Гэта Ніна Іванаўна Цзбрук (крама «Прэса», г. Брэст), Надзея Віктараўна Пчолкіна (кіёск № 81, г. Віцебск), Вольга Дзмітрыеўна Сазонава (кіёск № 6, пас. Лясны, Мінскі раён). Ім у найбліжэйшы час будуць уручаны блендары.

Другое месца ў конкурсе кіяскёраў (і электрачайнікі ў якасці прызоў) прысуджаны Ларысе Сцяпанаўне Андрушак (кіёск № 10, г. Брэст) і Іне Анатольеўне Грыбко (кіёск № 60, г. Чэрвень). Гадзіннікамі з лагатыпам найстарэйшай беларускай газеты ўзнагароджаны Ала Міхайлаўна Бахарава (крама «Планета», г. Брэст) і Ірына Чаславаўна Баўдзей (кіёск № 15, г. Маладзечна).

Забраць свае каштоўныя прызы пераможцы (калі ім выпадае) могуць у рэдакцыі (тэл. для даведак 287 17 79). Калі ж магчымасці такой няма — можна пачакаць: у газеты ёсць добрая традыцыя выязджаць на сустрэчы са сваімі сябрамі — перадаваць прызы з рук у рукі, прылюдна. Каб і іншыя ведалі: той, хто жыве са «Звяздой», заўсёды выйграе.

Як і той, хто працуе на рост тыражу, а значыць, на захаванне роднай мовы ў родным народзе.

Валянціна ДОЎНАР.

БЕЛАРУСЬ — ГЭТА МЫ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Значная іх частка адбудзецца ў межах Года культуры Беларусі ў Расіі — напрыклад, у Крамлёўскім палацы запланаваны сольны канцэрт народнага артыста Беларусі Анатоля Ярмоленкі, у канцэртнай зале імя Чайкоўскага выступіць Дзяржаўны ансамбль танца, на адной з буйнейшых маскоўскіх пляцовак будзе пастаўлены балет «Ціль Уленшпігель» славутага нашага земляка Яўгена Глебава, чый юбілей святкуецца сёлета...

«Беларусь — не толькі геаграфічны цэнтр Еўропы, мы павінны не забывацца аб важнасці нашай Радзімы і як музычнага цэнтра Еўропы», — з гэтай прамовы галоўны дырыжор Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Белдзяржфілармоніі маэстра Аляксандр Анісімаў пачаў сцісла аповед пра ўнёсак свайго калектыву ў акцыю «Беларусь — гэта мы». Планы ў аркестра, выступленні якога заўжды праходзяць з аншлагам і выклікаюць цікавасць у публікі, ужо расписаныя на год наперад — ад творчага вечара Сяргея Картэса і прэм'ер новых твораў беларускіх кампазітараў Дзмітрыя Смольскага і Вячаслава Кузняцова да традыцыйных летніх гастроляў у Швейцарыі, Германіі, Літве... «Сёння мы не дапускаем нават меркавання, што на канцэрце з твораў беларускай музыкі пры выкананні аркестрам, у якім 100 і больш музыкантаў, у зале прысутнічаюць толькі родныя і некалькі членаў Саюза кампазітараў», — без лішняй сціпласці заўважыў маэстра, акрэсліўшы задачу калектыву як прапаганду не толькі беларускай класічнай музыкі, але і беларускага выканальніцкага майстэрства.

Словы **«Беларусь — гэта мы»** пачуюць многія і ў Еўропе, і ў Азіі — Дні беларускай культуры адбудуцца сёлета ў Казахстане і ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы, традыцыйна будуць праходзіць у нашых краінах-суседках і не толькі. Напрыклад, 22 верасня плануецца адкрыць выставу знакамітага беларускага мастака Івана Хруцкага ў штаб-кватэры ЮНЕСКА, а пазней — у самім Луўры. І хоць задума гэта нятанная (толькі на арганізацыю экспазіцыі ў Луўры спатрэбіцца каля 25 тысяч долараў), але міністр культуры Павел Латушка ўпэўнены, што акрамя фінансавання з ведамасных крыніц — міністэрскай, упраўленняў культуры аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама — знойдуцца спонсары і мецэнаты, гатовыя падтрымаць акцыю. Арганізатары спадзяюцца нават на яе камерцыйную прыбытковасць — паспяховы продаж білетаў на канцэрты, спектаклі і выставы стане ці не лепшым сведчаннем поспеху ўсёй акцыі.

Дарэчы, фінішуе яна, як і папярэднія маштабныя праекты «Мы — беларусы» і «За Беларусь», вялізным гала-канцэртам у сталіцы. Плануецца, што адбудзецца ён у комплексе «Мінск-Арэна».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

РЭЗКІ ПАВАРОТ...

Кіроўца аўтамабіля не справіўся з кіраваннем і ўехаў у тралейбус, які стаяў на прыпынку грамадскага транспарту.

Фота прадастаўлена УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама.

Ад удару легкавушку адкінула на прыпынак, дзе людзі ў гэты час чакалі свайго маршруту. Пяцёра з іх атрымалі траўмы: чацвёра — сур'ёзныя, адзін, паводле папярэдніх звестак, абышоўся нязначнымі ўдарамі. Кіроўца (1988 года нараджэння) іншамаркі не пацярпеў.

ДТЗ адбылося ў 9 гадзін раніцы на скрыжаванні вуліц Сурганава і Куйбышава. Паводле слоў **інспектара аддзела агітацыі і прапаганды УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандра БРУЯ**, сутыкненнем з тралейбусам скончылася няўдалая спроба кіроўцы аўтамабіля «Ровер» здзейсніць манеўр павароту. Сапраўдныя прычыны ДТЗ установіць следства.

Надзея ДРЫЛА.

«ТРЭБА ПРАВОДЗІЦЬ МАЗГАВУЮ АТАКУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аб экспарце прадукцыі

— Эканоміка Гомельшчыны гістарычна з'яўляецца экспартаарыентаванай — 3/4 аб'ёмаў прадукцыі пастаўляецца на экспарт. Летась мы працавалі з партнёрамі са 109 краін свету. Падведамасныя толькі Гомельскаму аблвыканкаму прадпрыемствы прадстаўлены за мяжой 26 суб'ектамі тавараправодных сетак. Летась упершыню гомельскія тавары з'явіліся на рынках 13 краін, куды мы раней не пастаўлялі сваю прадукцыю: у Боснію, Герцагавіну, Ірак, Вялікабрытанію і гэтак далей. Хоць мяне не задавальняе, як вядзецца гэтая праца. Час падтрымання толькі сацыяльна-культурных сувязяў паміж рэгіёнамі закончыўся. Эканамічнае ўзаемадзеянне выйшла на першы план.

Аб мясцовых відах паліва

— Гомельская вобласць — лідар па аб'ёмах выкарыстання мясцовых відаў паліва. Больш за 20 % у нашым агульным балансе складаюць мясцовыя віды паліва — самыя разнастайныя. У Цярэшкавічах электраэнергію вырабляюць, прабачце, з гною. Сабекошт гэтай электраэнергіі значна ніжэйшы за тую, якую мы купляем у «Гомельэнерга». На ўсіх вясковых аб'ектах вельмі актыўна ўкараняюцца новыя ацяпляльныя сістэмы, якія працуюць на пелетах, на драўляных трэсках, на катахах ад кукурузы. У Рэчыцы працуе міні-ЦЭЦ на лігніце. Яго там каля 8-10 мільёнаў тон, ён дзясяткі гадоў ляжаў там — застаўся ад былога гідролізнага завода. Сёння гэты лігнін — як знаходка, яго павінна хапіць гадоў на 30.

Аб прыватным бізнэсе

— Сёння прыватны бізнэс Гомельскай вобласці — гэта амаль 8 тысяч юрыдычных асобаў і больш за 28 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў. У параўнанні з 2008 годам юрыдычных асобаў стала ў паўтара раза больш. Гэта атрымалася і таму, што спрасцілася заканадаўчая база. 15,5 % падатковых і непадатковых плацяжоў ад усіх паступленняў у бюджэт па Гомельскай вобласці ідзе ад прыватнага сектара. Але ж магло б быць і больш. У аднолькавых умовах, з той жа нарматыўнай базай, часам з горшымі ўмовамі гаспадарання, мы маем рэгіёны, дзе гэты паказчык дасягае 36 %. Гэта Лельчыцкі, Нараўлянскі, Калінкавіцкі раёны. Прыватны бізнэс развіваецца хутчэй, чым камунальны, таму і мы павінны гэтаму садзейнічаць.

Аб развіцці АПК

— У 2009 годзе пастаўлены некаторыя рэкорды ў аграпрамысловым комплексе Гомельшчыны. За ўсю гісторыю атрыманы самы высокі ўраджай збожжавых. Мы стабільна выйшлі на мільён тон збожжа, а пяць гадоў таму толькі марылі пра гэта.

Аб будаўніцтве жылля

— Жыллё — гэта адзін з прырытэтаў дзяржавы. Мы справіліся з усімі прагнознымі паказчыкамі па будаўніцтве жылля на Гомельшчыне і некалькі нават перавыканалі гадавое заданне — пабудавалі 770 тысяч кв. м жылля. Сёлета мы павінны дасягнуць 960 тысяч кв. м жылля. Задача вельмі складаная, але ж я не бачу перашкод, каб не справіцца з ёй. За наступныя 2 гады мы павінны выйсці на лічбу ў 1 мільён 300 тысяч кв. м. Што датычыцца якасці будаўніцтва, то ўзнікаюць праблемы. Я не ведаю іншага прыёму барацьбы за якасць, як з бізуном хадзіць за тымі, хто дрэнна будуе.

Аб рознічным таваразвароце

— У рознічным таваразвароце Гомельская вобласць расце не тымі тэмпамі, якімі б нам хацелася. Сёння шлях адзін — развіваць гандлёвыя сеткі і павялічваць плошчы. Мы адсталі па будаўніцтве супер-гіпермаркетаў гады на два. Практыка паказала, што калі становіцца больш сетак, прыбаўляецца таваразварот і пры гэтым ён не зніжаецца ў тых, хто існаваў дагэтуль. Таму мы цяпер будуем шэраг аб'ектаў гандлю ў Гомелі і іншых буйных гарадах.

Аб амаладжэнні кадраў

— У нас апошнія 2-3 гады адбылося сур'ёзнае амаладжэнне кіраўнікоў першага ўзроўню. Яны з задавальненнем працуюць, шукаюць новыя падыходы, актыўна займаюцца рэфармаваннем. Калі 2 гады таму ў нас было 300 суб'ектаў гаспадарання ў аграпрамысловым комплексе (так званых калгасаў і саўгасаў), то сёння іх 200. Мы іх узбуйнілі, што дазволіла сакумуляваць рэсурсы і кваліфікаваныя кадры. Да гэтага мы правялі вялікую рэканструкцыю раённага звяна — у нас цяпер усе гарады абласнога падпарадкавання і раёны аб'яднаныя ў адну адміністрацыйную адзінку. Апошнім быў Мазыр. За вельмі кароткі тэрмін раён прадэманстраваў, што гэта было правільнае рашэнне. Гэта не азначае, што мы адмовімся ад спрактыкаваных кадраў, але ратацыя кадраў будзе працягвацца.

Аб сацыяльных задачах

— Сацыяльна-арыентаванай наша эканоміка застаецца і мы не паслабляем фінансаванне сацыяльнай сферы. Наадварот, і ва ўмовах крызісу мы працягваем будаваць новыя школы, аб'екты фізкультурна-спартыўнага і аздараўленчага профілю. Што датычыцца праблемы з хворымі на сухоты, мы сёлета ў Добрушы будзем рабіць установу закрытага тыпу на базе былога прафілакторыя — для лячэння і прафілактыкі гэт

«НАШ РЭЦЭПТ ШЧАСЦЯ: КАЛІ ЎДЗЕНЬ ПАСВАРЫЛІСЯ, ТО ЎНАЧЫ МІРЫЛІСЯ!»

У Дзень усіх закаханых магілёўскія пенсіянеры адзначаць залатое вяселле!

МАРЫЯ Іванаўна і Аляксандр Юр'евіч Кушнеры пажаніліся 14 лютага паўстагоддзя таму. У 1960 годзе маладыя вяскоўцы пра Святога Валянціна нічога і не чулі.

— Гэта цяпер у моладзі такая мода! — смяецца Марыя Іванаўна. — Мы проста пражылі 50 гадоў у каханні і згодзе. Вось і шчасце наша!

Гэтая жанчына і ў свае 75 выглядае цудоўна. Але ў маладосці, калі буйніцкая дзяўчына пайшла замуж, яна была сапраўднай прыгажуняй: статная, вясёлая, з доўгімі касамі і абаяльнай усмешкай.

На старым вясельным фотаздымку, дзеля якога праз вялізныя сумёты і завею прабіваліся з вёскі ў фотаатэлье ў цэнтры Магілёва, маладая пара. Аляксандр — у строгім касцюме з вясельным упрыгажэннем на грудзях, яна — у вытанчана-сціплым белым строі з круглым каўнерыкам (гэта цяпер без нізкага дэкальтэ і гарсэта не абыдзецца ніводная нявеста), на галаве — арыгінальны какошнік, і вэлюм у падлогу.

— Тканіну пад мудрагелістай назвай крэп-жаржэт мне набылі «па блаце» ў магілёўскай краме, — ахвотна ўзгадвае залатая юбілярка. — Штучныя кветкі для ўпрыгажэнняў знайшлі на рынку, дзе за тым часам імі гандлявалі кітайцы. А вэлюм — гэта насамрэч фіранка без узору. Але атрымалася шыкоўна, ці не так?!

Вельмі дэфіцытныя туфлі мадэлі 1960 года — светлага шэрага колеру, тупаносыя і на невялікім устойлівым абцасе — модныя і сёння, праз 50 гадоў. Пасля вяселля іх насіла малодшая сястра, а потым іх выпрасіла сяброўка, якая сабралася замуж. А вось вясельная сукенка і цяпер недзе захоўваецца на гарышчы ў старым доме ў Буйнічах, які стаў сямейнай дачай.

Для таго, каб прыняць віншаванні з залатым юбілеем ад супрацоўнікаў ЗАГСа, Марыя Іванаўна апранула іншую сукенку, але ўсё ж белую, як для нявесты. Аляксандру Юр'евічу ўручылі сімвалічны медаль за доўгі і шчаслівы шлюб. Юбіляры прыгубілі шампанскага са старадаўніх чырвоных келіхаў — роўна столькі, каб не патрывожыць хваробы. І пацалаваліся пад традыцыйнае «горка!» сваякоў і гасцей.

Марыя Іванаўна ахвотна ўзгадвала сваю маладосць. Яна пазнаёмілася з будучым мужам на вясковых танцах, калі Аляксандр прыехаў у Буйніцкую школу механізатараў. Пасля навучання ён вярнуўся ў родную вёску на Клічаўшчыне, але паабяцаў каханай хутка вярнуцца. Так і здарылася.

— Дзевачкі, дарагія! Калі раскажу вам праўду пра наша вяселле, будзеце смяяцца! — казала Марыя Іванаўна. — Ён прыехаў з бацькам у сваты, прывёз гумавую грэлку з самагонкай і ладны шматок сала. А я так спужалася, што хавалася ў сяброўкі на печцы! Неяк сорамна было і няёмка. Там мяне жаніх і знайшоў! Давялося даваць тэрміновую тэлеграму маёй маці ў Маскву, куды яна паехала да свайго, каб хутчэй вярталася і рыхтавала вяселле.

— Гэта было каханне з першага позірку! — пацвердзіў Аляксандр Юр'евіч.

Люты 50 гадоў таму быў як і цяперашні — снежны і марозны. Дату вяселля выбіралі не з прадчування будучага сусветнага Дня закаханых, а са звычайных жыццёвых меркаванняў. Паводле народных традыцый, пасля каляднага посту і навагодніх святаў можна было жаніцца. А дзень 14 лютага, як і сёлета, 50 гадоў таму быў нядзеляй. Бо менавіта ў нядзелю ў вёсцы гулялі вяселле, а ў панядзелак завяршалі.

Маладыя ездзілі па вёсцы на хлебнай будцы! Вечарына была ў хаце, і людзей запрасілі болей за сотню чалавек. На стол падалі вясковыя каўбасы, каўбухі і сальцісоны, традыцыйны халадзец, бульбу, вінегрэт і аладкі. Кожнаму госцю, па мясцовай традыцыі, пяклі маленькі каравай — на памяць пра маладых.

Марыя і Аляксандр паехалі жыць у Магілёў. Працавалі на прадпрыемствах, здымалі жыллё, потым прыстасоўваліся да камуналкі і ўрэшце атрымалі сваю кватэру. Нарадзіліся сын і дачка.

— Мы 25 гадоў разам працавалі на Магілёўскім аўтазаводзе імя Кірава, — расказалі юбіляры. — Рабілі ў адным цэху, станкі побач стаялі. Разам на працу, разам з працы. І паверце, не надакучылі адно аднаму. Мы кахалі і, вядома ж, прызвычаіліся кожны дзень і ўсё жыццё быць разам.

Цяпер Кушнеры жывуць ціха і спакойна: узімку — у горадзе, улетку — у вёсцы, радуюцца дзецям, унукам і ўжо праўнучцы. Даюць парады маладым: быць цярплівымі, саступаць і паважаць адно аднаго.

— Так, і мы сварыліся калі-нікалі. Але, шчыра сказаць, калі ўдзень пасварыліся, то ўначы мірыліся.

Жадаем залатым юбілярам здароўя, і нях ай ім дапамагае ў гэтым і святы Валянцін.

— 50 гадоў у каханні і згодзе, — хістае галавой Марыя Іванаўна. — Мне нават не верыцца, што ўсё гэта было так даўно. Падаецца, што ўчора пажаніліся... А цяпер будзем жыць, як набяжыць.

Ілона ІВАНОВА.
Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ПАД ЗАСТУПНІЦТВАМ ПРАПАДОБНАЙ

Журналістка «Звязды» ўзнагароджана медалём Прападобнай Ефрасінні Полацкай

ГАЗЕТА «Звязда» бярэ ўдзел у Рэспубліканскім конкурсе на лепшае асвятленне тэматыкі праваслаўя з самага яго заснавання. Двойчы газета і яе журналісты станавіліся пераможцамі конкурсу. На гэты раз Беларуская Праваслаўная Царква ўзнагародзіла аглядальніка «Звязды» Вольгу Мядзведзеву медалём Святой Прападобнай Ефрасінні Полацкай.

Сёлета ў конкурсе «Беларускае Праваслаўе: гісторыя і сучаснасць» узялі ўдзел 73 друкаваныя і 11 тэлерадыёвяшчальных СМІ Беларусі. Дыпломам першай ступені і першай прэміяй у памеры 1,2 млн рублёў узнагароджаныя рэдакцыя газеты «Вечерний Минск» за выпуск духоўна-асветніцкай старонкі «Звоніца» і вядучы праваслаўнай духоўна-асветніцкай праграмы «Ключ разумення» Аляксандр Ялопаў (тэлерадыёкампанія «Гомель»). Дыпломам другой ступені і прэміяй у 900 тысяч рублёў узнагароджаныя рэдакцыя газеты «Астравецкая праўда» і вядучая праваслаўнай асветніцкай праграмы «Свет веры» Ефрасіння Багалюбава, а дыпломам трэцяй ступені і трэцяй прэміяй (600 тысяч рублёў) — газета «Рэспубліка» і тэлерадыёкампанія «Гродна».

— Радасна заўважыць, што, асвятляючы працу і клопат пра хлеб надзённы, вы не забываеце біблейскую ісціну: не адным хлебам жыць будзе чалавек, — падзякаваў пераможцаў конкурсу **Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі ФІЛАРЭТ**. — Уважліва пазнаёміўшыся з тэле- і радыёпраграмамі, а таксама з публікацыямі ў цэнтральнай і рэгіянальнай прэсе, мы ўпэўніліся, што тэма духоўнасці і маралі — адна з прыярытэтных у беларускай журналістыцы. Конкурс засведчыў рост журналісцкага майстэрства і таленавітую падачу інфармацыі пра жыццё Царквы.

— Сумесны конкурс Міністэрства інфармацыі і Беларускай Праваслаўнай Царквы ўжо мае сваю гісторыю і традыцыі, — сказаў на цырымоніі ўзнагароджання **міністр інфармацыі Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ**. — Ужо вызначылася кола аўтараў, якія сістэмна і прафесійна расказваюць чытачам пра жыццё праваслаўя ў Беларусі, духоўныя традыцыі і карані нашага народа. У дзяржавы і Беларускай Праваслаўнай Царквы агульныя мэты — умацаванне духоўнасці, маральных устояў і арыенціраў грамадства. Упэўнены, падобнае супрацоўніцтва будзе карысным і плённым і надалей.

Узнагарода журналісткі «Звязды» сведчыць аб прызнанні высокага ўзроўню падачы матэрыялаў духоўнай тэматыкі ў газеце ў цэлым. Медалём Святой Прападобнай Ефрасінні Полацкай узнагароджваюцца толькі жанчыны, якія зрабілі вялікі ўнёсак у маральна-духоўную асвету беларускага народа.

Няхай заступніцтва прападобнай не пакідае і выданне, і ўсіх яго чытачоў.

Ул. інф.

Зварот у карпункт

«ДАПАМАЖЫЦЕ БЯСПЛАТНА НАПІСАЦЬ ІСКАВУЮ ЗАЯВУ!»

У карэспандэнцкі пункт «Звязды» па Віцебскай вобласці звярнуўся чытач, які папрасіў дапамагчы... бясплатна напісаць іскавую заяву ў раённы суд. Такая нечаканая просьба адразу здзівіла. Усё-такі карэспандэнт — не юрыст. У раённым судзе, як растлумачыў мой суразмоўца, часова беспрацоўны мужчына перадпенсійнага ўзросту, яму сказалі, што такія іскавыя заявы (іск наконт рэгістрацыі праз суд па месцы жыхарства яго маці) пішуцца па вызначанай «форме», але нейкіх ўзораў напісання такіх іскаў, якія папрасіў чытач, у судзе няма, бо кожны выпадак індывідуальны. Таму ў судзе параілі звярнуцца ў платную юрыдычную кансультацыю. А там, паводле слоў чытача, запрасілі за дапамогу ў напісанні іску ажно 95 тысяч рублёў.

— Калі ласка, падкажыце, ці ёсць у нас нейкія кансультацыі, якія могуць бясплатна пракансультаваць такіх жа людзей, як я, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі? — пытае мяне чытач. — Я наогул не разбіраюся ў юрыдычных нюансах. Думаў, што проста напішу на паперы пра маю праблему і іск у судзе прымуць. Аказалася, што не ўсё так проста.

Хутка мне на пенсію, так здарылася, што цяпер работы не маю, доўгі час працаваў на будаўніцтве ў Расіі. Хачу зарэгістравацца ў кватэры маёй маці, якой ужо за 90 гадоў. Кватэра прыватызаваная на траіх чалавек. Маці не супраць, але брат і ягоная жонка, якія таксама ў той кватэры зарэгістраваныя, катэгарычна супраць. Доўга тлумачыць, чаму так здарылася. Выходзіць, што фактычна я — бяздомны. Ды і без грошай. Дзе мне ўзяць тыя ж 95 тысяч рублёў, каб у юрыдычнай кансультацыі дапамаглі напісаць усяго адну паперку? Больш за тое, каб потым падаць той іск у суд, трэба заплаціць каля 100 тысяч рублёў. Прыйдзецца пазычаць...

Карэспандэнт «Звязды» шчыра пастараўся дапамагчы чытачу. І, аказваецца, ёсць куды звярнуцца па дапамогу яму і такім, як ён, людзям з матэрыяльнымі праблемамі.

Пры юрыдычным факультэце Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Машэрава дзейнічае так званая прававая лабараторыя. Як растлумачылі «Звяздзе» на юрфаку, любы ахвотны можа атрымаць тут дапамогу бясплатна.

Студэнты — будучыя юрысты ўважліва выслухаюць кожнага, ўсё неабходнае запішуць, потым пры дапамозе сваіх настаўнікаў падрыхтуюць адказ. Праўда, не за адзін дзень, але, як запэўнілі карэспандэнта, шмат часу гэта не зойме — мо тыдзень.

На жаль, прававая лабараторыя не працуе кожны працоўны дзень, а толькі ў аўторак і чацвер з трох гадзін дня да сямі вечара. Лабараторыя дзейнічае ў Віцебску па адрасе: вуліца Церашковай, 25, кабінет 304. На жаль, кантактнага тэлефона ў лабараторыі няма. А чаму б не зрабіць студэнцкую «гарачую лінію» для тых, хто мае патрэбу ў прававых кансультацыях? Упэўнены, што будучым юрыстам такая практыка пайшла б на карысць. Напрыклад, можна было б рабіць своеасаблівы маніторынг прававых праблем насельніцтва Віцебскай вобласці.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

У МАГІЛЁВЕ БУДУЦЬ РЫХТАВАЦЬ БІЯТЛАНІСТАЎ

Спартыўнае таварыства «Спартак» аднавіла вучэбна-спартыўную базу па біятлоне на ўскраіне Магілёва.

Паблізу вёскі Палыкавічы Магілёўскага раёна на новай базе будуць рыхтаваць лыжнікаў і біятланістаў у нацыянальныя каманды. Аднак займацца аздараўленчымі трэніроўкамі змогуць усе, хто захоча. На базе ёсць камфартабельная гасцініца, сучасная трэнажорная зала, лазня з басейнам і більярдам.

Ілона ІВАНОВА.

ЗАТРЫМАНЫЯ ПРЫЗНАЛІСЯ Ў 18 КРАДЗЯЖАХ

Аднак крымінальнае «трыа» праваахоўнікі падазраюць ва ўчыненні яшчэ як мінімум пяці крадзяжоў у сталіцы.

Паводле звестак прэс-афіцэра Фрунзенскага РУУС Алы Галубовіч, непрацуючых раней судзімых мінчан 34, 30 і 26 гадоў затрымалі адразу пасля ўчынення чарговага крадзяжу ў мікрараёне Кунцаўшчына. Як выявілася, адметнасцю гэтых крымінальнікаў было тое, што з кватэр пацярпелых яны выносілі толькі малагабарытныя рэчы, якія можна было схаваць па кішэнях, ці пад адзеннем — ювелірныя вырабы, мабільныя тэлефоны, прадметы аргтэхнікі і грошы. А ў чужое жыллё яны забіраліся выключна праз уваходныя дзверы, праварочваючы сарцавіну замка. На гэты момант злачынцы пакаяліся ў 18 учыненых на тэрыторыі Фрунзенскага раёна кватэрных крадзяжах, аднак у следства ёсць падставы меркаваць, што на сумленні «трыа» іх больш.

«ПАПРАЦАВАЛІ» НАД ЭЛІТНЫМ БМВ

Губа не дурная ў невядомых, якія за ноч у Серабранцы разукамплектавалі адразу тры аўтамабілі: злачынцы знеслі дэталяў больш як на 10 млн рублёў.

Так, ва ўласніка элітнага БМВ з машыны зніклі заднія накладкі, датчыкі парктроніка і люстэркавыя элементы — страта ад крадзяжу склала 8 мільёнаў рублёў. У іншага пацярпелага з аўтамабіля «Мерседэс» знялі люстэркавыя элементы коштам у 1,5 мільёна рублёў. А «Хонду-Акорд» зладзюжкі пазбавілі магнітолы.

Ігар ГРЫШЫН.

Хто каго?

ЁН ПАКУЛЬ ШТО НЕ ЖАНАТЫ, І НЯМА ЯГО ВІНЫ...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Што было — было. Некалі, у мінулым веку яшчэ, на Аўцюкоўскую ферму начальства наехала, хацела разабрацца, чаму такія надоі нізкія. «А таму, — адказваюць даяркі, — што калі б за іх плацілі як след, мы б з дому на ферму малачко прыносілі, а так — з фермы нясём». «Як можна?! З гэтым трэба канчаць! Тэрмінова!» — зашумела потым начальства.

І назаўтра да таго кароўніка... ахову прыставіла.

Што далей? Ды не спіць яна, вартуе — кругласутачна! Крокі вось пачуліся. Дзед у ў крык:

— Стой! Страляць буду!

Яму ў адказ:

— Ды пайшоў ты...

— Во, — уздыхае вартаўнік, — восьмы год вакол фермы тапчуся, а пароль — не мяняецца...

Як і ў нас — правілы гульні: восьмы год, калі памяць не падводзіць, «на з'ядзенне» чытачам друкуем здымкі, а ўжо што далей...

Стаць героем «Хто каго?»
Гэта, людцы, о-го-го:
Смех пад гэту рубрыку
Ідзе на ўсю рэспубліку!..
Вы да здымка нешта склалі?
То дашліце Доўнар Валі,
І, паціснуўшы руку,
Дайце ж чарку Клешчуку! —

заклікае Міхаіл Паўлавіч Дубовік з вёскі Арэшкавічы Бярэзінскага раёна. Што... несправядліва, ну згадзіцеся! Аднаму — і руку на сяброўства, і чарку, другому... Вось таму ён (а дакладней яна) і ратуецца.

Як і трэба было чакаць, менавіта гэта ўбачыла на здымку (зверху) абсалютная большасць «падпісантаў» — аўтараў подпісаў:

...Толькі і слова, што кахае.
Грошы — усе ў кішэні пхае.
Хоць яно й нявідзіць...
Сам не дасць, ну хоць павесьце! —

апраўдвае дзеўку спадарыня Лабажэвіч з Клецка.

Таму «...узяць іх — наша задача». Іншае пытанне, як? Усім, хто яшчэ не ведае, падказка — ад спадара Гаўрыша з Пастаўшчыны:

Ясь (на фотцы) ад Яніны
Левы прыхаваў даход...
Нюх на гэта ў жанчыны:
Картка — тут жа ў палавіны,
А прыгорне, — скажа й код.

Праўда, потым, як сцвярджае спадар Дубовік з Бярэзіншчыны, можа горка пашкадаваць:

Стась бландзінку пакахаў,
Палка цалаваўся,
Раніцою лохам стаў —
Без штаноў застаўся.

Гэта, ну безумоўна ж, дрэнна, але не на столькі. Куды больш не пашчасціла герою спадара Гарачова з Іўеўшчыны:

Хлопец — хоць кладзі ў магілу, —
Кажуць так пра Кастуся,
Уміг прапала і «мабіла»,
І стыпендыя ўся...
Каб «магілай» той не звацца,
Лепш з бландзінкамі не знацца.

Яшчэ і таму, што яны, як лічыць (і хто б спрачаўся з ёй!) спадырыня Гудачкова з Жыткавічаў:

Бяруць мужыкоў без прымусу
І днём, і ў паўночную цемень —
Залезуць у вочы,
Залезуць у душу,
А потым — глядзіш — і ў кішэню.

Усё з той жа (па меркаванні спадарыні Аляхновіч са Слуцка) мэтай:

Ясь пакінуў жонку дома,
Прыгарнуў «чужынку»:
Вельмі файна ўдваіх
Крочыць у абдымку...
Яна часу не губляе, балазе,
А кішэні правярае — па чарзе.

І спадар Шчэцька з вёскі Цеснавая Стаўбцоўскага раёна лічыць, што па сённяшнім часе гэта зусім не лішняе. Разам з дзяўчынай ён услых разважае:

Шлюб... Цяпер?
Ці ранавата?
Кажа, ведаў ёсць багата...
І будуецца ўжо хата?..
— Абдымай мяне, Мішэль...
Я ж ціхутка ў кішэнь:
Бо жаніх тады харошы,
Калі мае яшчэ й грошы.

А на слова ім верыць... Ды сабе даражэй, што даўно ўжо зразумелі многія. Прынамсі, з жанчын:

Чула — хлопец ён харошы,
Зарабляе многа грошай...
Я мац-мац... І што з таго ж?
На аркане адна вош...
Мужыкі і хлопцы, вам
Я параду зараз дам:
Давярайце грошы банку,
І не злічаць іх каханкі, —

раіць гэта спадар Старых з Гомеля.

Туды ж яго земляк, спадар Сільчанка:

Стась марыў,
што хутка шчасліва ажэніцца,
У жонкі абраўшы
зладзейку-кішэнніцу...
Хай гэта ўсім стане
ўрокам наглядным —
Захоўвайце грошы
ў банку ашчадным!

Што, як сцвярджае спадар Астроўскі з Мінска, іх (тыя грошы)... не факт, што ўратуе!

Адкуль такая ўпэўненасць? Ды праверана. Прычым — на сабе, бо гэта ён, Іван Іванавіч,

Ажаніўшыся, спазнаў
(І на першым годзе!):
Дзе б заначку ні схаваў,
Жонка ўсюды знойдзе!

Пра гэта, гледзячы на здымак, папярэджвае і спадар Дубовік з Бярэзіншчыны:

Хваліць Міша жонку Маю,
Кажа: «Во рукастая:
Як зарплату атрымаю —
Умомант заграбастае!»

І як бы нават не крыўдзіцца... Ён...

У адрозненне ад Уладзіміра К. з Гродна, які прызнаецца:

Я сваю Наталію
Год не браў за талію...
А яна дык — абдымае,
Калі... грошы адымае!

Крыўдна!.. І як...

Прыкладна гэтак жа і дзеўцы, пра якую напісала нам спадарыня Лопух, што са сваёй Навагрудчыны пераехала ў Мінск і сюды ж, каб не расставацца, перавяла падпіску на газету:

У любові кляўся... Фірму мае
І баксы шуфлем заграбае...
Мне ж не дае іх — нават жмені.
Сама вось лажу па кішэнях!

Непрыемны занятак... Больш за тое, як сцвярджаюць людзі бывалыя, а менавіта спадарыня Чыгрынава з Вілейшчыны, нават марны. Бо пошукі весці трэба не там:

Хоць лісліўка, ды дзівачка —
Хто ж шукае там «заначку»?
То ж кішэні — для красы,
Зазірні лепш...

Вы здагадаліся, куды. І ведаеце, што там шмат цікавага можна ўбачыць. Але ж тады не вароньце, як раіць спадарыня Лабажэвіч. Яна пра гэту вось дзеўку, пра гэтую пару распавядае так:

...Для блізіру — ручку грэе,
А сама — ад шчасця млее...
Дам я дзеваньцы параду:
Грэй хоць спераду,
Хоць ззаду —
асцярожна...
Гэта ж порткі:
Клопат мецьмеш — хлопец вёрткі!

І чым яна, тая вёрткасць, можа абярнуцца, тлумачыць не трэба — радасцю. Калі глядзець на парачку вачыма той жа спадарыні. Калі спадара Мароза з Міёраў — то якраз наадварот!

Мілы хлопча, не варонь,
Прасачы, куды далонь
Запусціла дзеўка-краска...
Вось якая яе ласка...
І ты... можаш... неспадзеўкі
Пакапацца... у сумцы ў дзеўкі:
Хай жа зведае пралаза,
Як «прыемна», калі лазяць...

Каб нешта ўкрасці...

Рысу ж (хоць і спрэчную...) пад разважаннямі на вечную тэму мужчыны-жанчыны-грошы падводзіць спадарыня Кусянкова з вёскі Лучын Рагачоўскага раёна:

Каб мужчынам падабацца,
Дзеўкі любяць агаляцца,
Ім жа хлопец тым мілей,
Чым кішэнь яго шырэй,
Дзе вядуцца мані-мані...
Вось што любяць Мані-Тані.

Чаму? Ды, мусіць, кожная з іх хоць трохі, любіць сябе, а, любячы, як не ўсклікнуць (разам з мінчанамі Астроўскімі):

Дзеўка ўсім я хараша
І крутая змоладу,
А ў мілога — ні шыша,
З чым ісці па гораду?!

Пытанне гэта зусім не рытарычнае. Як і выснова, да якой, гледзячы на чарговы конкурсны здымак, прыйшла спадарыня Пажога з Глыбоччыны:

Чым «чапнула» Клешчука
Гэтая вось парачка?
Ды дзявочая рука
У кішэні, не на карачку...
Напарадзе жыццё чакае
Не ў казцы, а рэальнае:
Душа — духоўнае шукае,
Рука — матэрыяльнае.

А мяжу паміж адным і другім правесці складана. Куды, прынамсі, складаней, чым спадару Пяшэвічу з Жыткавіччыны выдаць (праўда, ад імя дзяўчыны):

Што мазгі сабе тлуміць,
Над чарговым здымкам?
Модна стала так хадзіць
З мілым у абдымку.
Модна грошы ў яго браць...
Ведайце навошта:
Каб «Звязду» ўсім падпісаць,
Збочыўшы на пошту!

Што, безумоўна ж, добрая справа — ухваляем!

Што да іншых... Ёсць, ёсць нядобрыя! Не паспрачаешся, прынамсі, з мінчанкай Алай Тарасік:

Людзі слаўныя ў нас
Шмат, на жаль, і дрэні:
Хто не хоча працаваць,
Лазіць па кішэнях.

Прычым робіць гэта проста па-майстэрску, што канстатуе спадарыня Гудачкова з Жыткавічаў:

Двое практыку праходзяць
Ды па спецнавуках —
Яна майстар па кішэнях,
Ну а ён — па сумках.

І колькі іх такіх... Ёсць. А будзе...

Але ж мы, як правіла, не пішам напрыканцы аб сумным, пішам аб... прыемным. Ды яшчэ і якім! Вось што ўбачыў на здымку спадар Гарбачоў з Сянно:

Дзеўка гэта й днём за справай,
Справа — дужа звычная:
Усё шукае — левай, правай —
Кропкі эратычныя.

Што, як мяркуе спадарыня Чыгрынава, не зусім правільна (днём), нават неразумна:

Не хапайце маладзіцы
Пры людзях за ягадзіцы,
Усё рабіце тэт-а-тэт, —
Захаваецца імпэт.

І, як раяць педагогі са стажам сужэнцы Астроўскія, не спяшайцеся:

Лезе дзеўка хітравата
Да хлапца абы куды.
Яно ж быццам ранавата?
Выйдзеш замуж...
Вось тады...

Што тады, ведае спадар Кабердзін з Мінска:

За кішэню мужа трэба
Час ад часу патрымаць,
Тады ён ад свайго «рэбра»
Не захоча ўцякаць.
А калі кішэня ззаду
Дык карысна ўдвая
Гляне ўбок — шчыпну заразу
Няхай помніць — жонка я.

(Хоць, гледзячы на здымак, спадар Гарбачоў з Сянно і заўважае, што гэта, магчыма, і не так:

Пазнаць цяжка без зайздросці
Хто каму з іх даражэй?
Факт, што мы ў іх узросце,
Усё ж тупіліся бліжэй!)

А тым больш, калі:

Рух у дзеўкі непрывабны,
Сорамна, але ж...
Да каленца ножка зграбна
А там далей — тэж, —

адзначае спадар Гарачоў з Іўеўшчыны.

Ад яго ж яшчэ адно прыемнае назіранне — для жаночых вачэй і вушэй:

Зноў падняў праблему друк —
Прыгажосць жаночых рук:
Ці каханка тут ці жонка,
Мерзнуць пальцы
без пярсцёнкаў!

А ўжо без заручальнага...

Але аб гэтым у іншы раз.

Гэты ж агляд хочацца закончыць проста россыпам (і без каментарыяў!) трапных, мудрых, смешных назіранняў, якія даслалі да здымка ўсё тыя ж сужэнцы Астроўскія. Лічы, кожнае з іх просіцца на сцэну. Магчыма — пад гармонік. І гэта шчасце, што нашаму фотакарэспандэнту трапіўся такі кадр, што ён выйшаў на старонкі газеты і што да яго змаглі напісацца вось такія радкі! Чытайце, спявайце, смейцеся, перадавайце далей:

Усе палітыкі пяюць,
Што народу штось даюць,
А ў маёй палітычкі —
Абабраць да нітачкі!

Век нялёгкі і шалёны —
Што ні крок — гані мільёны!
Вось і круцяцца кабеты,
Каб дабыць мільёнчык гэты!

Каб плацілі на рабоце,
Дзень пры дні мужык у поце...
На фінансы ж ё надзея
У жонак, дзевак і зладзеяў...

Я пакуль што не жанаты
І няма маёй віны,
Самі дзеўкі йдуць дахаты
Самі лезуць у штаны,

І на завяршэнне — пра адну (з іх, з тых дзевак):

А мы з ёю згодны недзе
І вось так напішам:
Лепш яна ў кішэнь хай лезе,
Чым хто-небудзь іншы!

Тлумачыць, чым канкрэтна (лепей, чым горш...) патрэбы няма: кожны можа паразважаць... Не сёння дык потым, калі будзе час. Захавайце нумар газеты. Магчыма, ён спатрэбіцца вам, каб яшчэ раз усміхнуцца, каб яшчэ раз вылучыць самыя ўдалыя радкі, каб зрыфмаваць свае, запісаць і даслаць у рэдакцыю. На конкурс «Хто каго?» (у сэнсе — пераажартуе).

Зазначым, што на папярэднім этапе сярод лепшых вялікае чытацкае журы адзначыла подпісы спадарынь Ляшкевіч са Століншчыны,Тарасік з Мінска, Бурко з Бярэзіншчыны, Кусянковай з Рагачоўшчыны, Чыгрынавай з Вілейшчыны, Лабажэвіч з Клецка, сужэнцаў Астроўскіх з Мінска, спадароў Гарачова з Іўеўшчыны і Гаўрыша...

З чым пагадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал 2010 года накіроўваецца на Пастаўшчыну...

Хочаце, каб да вас, — пішыце. Здымак, як заўжды дадаецца. Умовы ранейшыя — у кожным подпісе (іх колькасць не абмяжоўваецца) павінна быць не больш за восем трапных, дасціпных, разумных радкоў. Поспеху!

Валянціна ДОЎНАР.

P.S. **Калі вярстаўся нумар, пошта прынесла яшчэ некалькі лістоў — з крылатымі (у якасці подпісаў да здымка) «Кніжкі ў сумцы — хлопцы ў думцы», «Калі хочаш жыць у шчасці, трэба красці... І не папасці», «Тут не Сонька Залатая ручка, а яе ўлюбёнейшая ўнучка»... І нарэшце (ад спадара Федаракі са Скідаля):**

Ты студэнт, а я студэнтка
І мяне ты паважай.
Калі хочаш сёння буську,
Дай хоць тысячу на чай.

Толькі гэтай буські, здаецца, і не хапала...

P.P.S. **Шчыры дзякуй усім, хто даслаў свае варыянты. Гэткія ж шчырыя прабачэнні ўсім, чые прапановы не змешчаны. Як казалі некалі ў сталічным метро «вагончык не гумовенькі». Хоць і шкада, што не гумовенькі. І што казалІ.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ШТО ПРЫНЯСЕ З САБОЙ ВАДА?

На Палессі рыхтуюцца да паводкі

Сапраўдны паляшук — гэта, па-першае, чалавек заможны, па-другое, чалавек з гумарам. Дык вось падчас адной з камандзіровак давялося ў тым краі пачуць: «паводкі баіцца той, хто скарбонку з доларамі плыткa закапаў». Што азначае прыкладна наступнае: тутэйшы чалавек да сюрпрызаў прыроды прызвычаіўся і навучыўся іх спакойна перажываць. На шчасце, большасць вёснаў так і здараецца. Але бывала, што вясновая вада прыносіла не толькі праблемы, але і сапраўдныя беды. Таму да веснавога разліву рэк трэба быць гатовым. Толькі з-за веснавой паводкі 1999 года пацярпела 49 раёнаў краіны, больш за сем тысяч жылых дамоў было падтоплена. Найбольш тады нацярпеліся ў Столінскім і Драгічынскім раёнах.

Якой выдасца паводка гэтага года, пакуль ніхто прадказаць не бярэцца. Усё ў рэшце рэшт вырашыць надвор'е. Калі снег будзе днём раставаць, а ночку падмарожваць, то вялікай вады на Палессі, мажліва, і не здарыцца. А ў выпадку рэзкага пацяплення рэкі, вядома, пакажуць свой нораў. Тым болей, што такога снежнага покрыва, як цяпер, па звестках метэаролагаў, не было тут 15 гадоў. Шмат снегу сёлета і ва Украіне. А менавіта адтуль нясуць свае воды на Палессе Гарынь, Прыпяць, Случ.

Як расказаў карэспандэнту «Звязды» **намеснік начальніка Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Генадзь САДУРСКІ**, упраўленнем падрыхтаваны план дзеяння органаў улады, службаў у паводкавай сітуацыі. Паводле слоў Генадзя Францавіча, план прадугледжвае парадак дзеянняў кожнай службы на выпадак павышэння ўзроўню вады альбо падтаплення. МНС разам з пастамі гідраметэаролагаў вядзе пастаянны маніторынг становішча па ўсіх басейнах рэк. Калі пачынаецца ледаход на нейкай з рэк і ўзровень вады ўзнімаецца, як правіла, узнікаюць заторы і вада разліваецца на палі, ці, яшчэ горай, даходзіць да населеных пунктаў. Каб гэта папярэдзіць, падраздзяленні МНС прыступаюць да ліквідацыі заторaў. Найперш гэтым зоймуцца байцы ўзрывatэхнічнай службы Пінскага рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння. Калі ж заторы будуць настолькі вялікімі, што ліквідаваць іх не ўдасца і вада пачне заліваць вакольцы, можа паўстаць пытанне аб эвакуацыі насельніцтва, жывёлы вяскоўцаў і гаспадарак. Тады работу пачнуць каардынаваць мясцовыя органы ўлады. Кіраўнікі аўтабаз і іншых транспартных арганізацый ужо ведаюць, колькі і якога транспарту яны павінны накіраваць у зададзеныя пункты. У спажывецкіх таварыствaў ёсць дакладныя інструкцыі наконт таго, як забяспечыць харчаваннем людзей у зоне вымушанага адсялення.

Зноў жа ў выпадку таго, што пэўны населены пункт можа аказацца адрэзаны вадой ад «вялікай зямлі», першымі на дапамогу прыйдуць супрацоўнікі Пінскага атрада спецыяльнага прызначэння, бо ў іх ёсць пантонна-маставая служба. За лічаныя гадзіны яны здольныя разгарнуць часовы мост і забяспечыць сувязь, а таксама пераправу людзей, хатняй жывёлы. Атрад мае таксама службу вадалазаў-выратавальнікаў і кваліфікаваных медыкаў, якія могуць выратаваць чалавека і дапамагчы яму.

Словам, на Палессі да вялікай вады рыхтуюцца грунтоўна. У раёнах ідзе ўзгадненне ўсіх магчымых дзеянняў кожнай са службаў. Па прагнозах спецыялістаў, у найбольш паводканебяспечнай зоне могуць аказацца 15 населеных пунктаў Пінскага раёна, 10 — Столінскага, 18 — Лунінецкага раёна. Усяго ў гэтых 43 вёсках жыве каля 8 тыс. чалавек.

У Столінскім раёне, напрыклад, 11 гадоў таму падтапіла 28 населеных пунктаў. З таго часу зроблена шмат па абароне вёсак ад паводкі. Такія ж мерапрыемствы праведзены і ў іншых раёнах. На Лунінеччыне ды і ў суседніх раёнах успамінаюць паводкі 1966, 1979 гадоў, калі на лодках па вуліцах плавалі. І спадзяюцца, што цяпер так не будзе. Але ж быць гатовым трэба да ўсяго.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ТЭЛЕФАНУЙЦЕ, ДОКТАР АДКАЖА!

На будучым тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

15 лютага — галоўны ўрач 15-й мінскай гарадской паліклінікі Віялета Браніславаўна ШУРЫГІНА.

16 лютага — загадчык лабараторыі экспертызы і рэабілітацыі НДІ медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі Алена Валер'еўна УЛАСАВА-РОЗАНСКАЯ.

17 лютага — дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра оталарынгалогіі Людміла Эдуардаўна МАКАРЫНА-КІБАК.

18 лютага — галоўны ўрач Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Валерый Віктаравіч ГРЫНЬ.

19 лютага — галоўны спецыяліст сектара метадалогіі і медыцынскай статыстыкі Міністэрства аховы здароўя Аляксандра Рыгораўна ХАЛЯВІНА.

«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама 8 (017) 220 20 25

15 лютага — загадчык рэўматалагічнага аддзялення Мінскай абласной клінічнай бальніцы Яўко Я.І.

16 лютага — намеснік галоўнага ўрача Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы Кухарская Н.П.

17 лютага — загадчык дыспансэрнага аддзялення Мінскага абласнога скурна-венералагічнага дыспансэра Капылоў Н.Л.

18 лютага — загадчык 2-га туберкулёзнага аддзялення Мінскага абласнога супрацьтуберкулёзнага дыспансэра Гарнова. Н.А.

19 лютага — загадчык жаночай кансультацыі Мінскага абласнога радзільнага дома Шыкольчык Л.В.

У графіку магчымы змяненні.

Падрабязнасці

Пазбавіўся вадзіцельскіх правоў і... за руль

Восенню 2007 года ў дарожна-транспартным здарэнні загінуў чалавек. Вінаватым аказаўся 26-гадовы Сяргей Найдзюк, ураджэнец вёскі Лунна Мастоўскага раёна, які быў за рулём без вадзіцельскіх правоў. Пакаранне — пяць гадоў абмежавання волі з забаронай на гэты ж тэрмін кіраваць усімі відамі транспартных сродкаў. Аднак...

Вось што паведаміў карэспандэнту «Звязды» старшы памочнік пракурора Гродзенскай вобласці Вячаслаў ІГНАЦІК:

— У пракуратуру вобласці звярнуўся з незвычайнай заявай жыхар Гродна, сын загінулага чалавека. Ён паведаміў, што ўжо пасля вынясення прыгавора неаднойчы бачыў віноўніка трагедыі ў розных месцах горада... за рулём аўтамабіля. У такое было цяжка паверыць, але запыт у абласную Дзяржаўтаінспекцыю гэта пацвердзіў.

Аказваецца, Сяргея Найдзюка пазбавілі вадзіцельскіх правоў за кіраванне аўтамабілем у нецвярозым стане яшчэ ў кастрычніку 2004 года. Але ён не збіраўся хадзіць пехатой і працягваў ездзіць, за што 15 разоў (!) затрымліваўся супрацоўнікамі ДАІ і прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці. Заплаціў штраф і — зноў за руль. І даездзіўся да дарожна-транспартнага здарэння са смяротным вынікам, груба парушыўшы Правілы дарожнага руху на пешаходным пераходзе. Здавалася б, ужо цяпер трэба спыніцца, але дзе там...

Адбываючы пакаранне ў выглядзе абмежавання волі, Найдзюк уладкаваўся на працу і працягваў карыстацца машынамі сваіх знаёмых. Маўляў, і суд для яго не ўказ. Што было заўважана не толькі сынам загінулага чалавека, але і супрацоўнікамі Дзяржаўтаінспекцыі, якія ўжо пасля прыгавора суда склалі ў дачыненні да Найдзюка 6 (!) адміністрацыйных пратаколаў. Такім чынам, «кліент» папраўчай установы адкрытага тыпу № 25 яўна ўхіляўся ад выканання судовага вердыкту ў частцы забароны на кіраванне транспартным сродкам.

Па выніках праверкі звароту да пракурора вобласці была заведзена крымінальная справа. Новы прыгавор суда Найдзюку — штраф у памеры 100 базавых велічыняў на падставе артыкула 417 Крымінальнага кодэкса Беларусі. Да прызначанага пакарання цалкам далучана неадбытае пакаранне па папярэднім прыгаворы — 3,5 года абмежавання волі з пазбаўленнем права кіравання ўсімі відамі транспартных сродкаў на пяць гадоў. Прыгавор увайшоў у сілу.

Пакуль у пракуратуру не паступала сігналаў, што Найдзюк зноў сеў за руль. Мо, нарэшце, дайшло? Ды і ў Дзяржаўтаінспекцыі, пэўна, ён пастаўлены на асаблівы кантроль.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ОАО «ЛИДАПИЩЕКОНЦЕНТРАТЫ»
(г. Лида, ул. Тавлая, 11)

сообщает, что 12 марта 2010 года в 14.00 в помещении актового зала, расположенного по адресу: г. Лида, ул. Тавлая, 11, состоится очередное собрание акционеров.

Повестка дня:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 году и основных направлениях деятельности Общества на 2010 год.
2. Отчет Наблюдательного совета о работе в 2009 году.
3. Отчет Ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год. Ознакомление Общества с заключением аудитора.
4. Об утверждении годового отчета, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках Общества за 2009 год.
5. Утверждение порядка распределения чистой прибыли за 2009 год. О выплате дивидендов за 2009 год.
6. О направлениях использования чистой прибыли на 2010 год, размере и сроке выплаты дивидендов за 2009 год.
7. О направлении неиспользованного на 01.01.2009 года фонда накопления ОАО «Лидапищеконцентраты» на покрытие убытков присоединившегося УЧТП «Торговый Дом «Лидкон» в сумме 68 677 160 рублей.
8. О расчете части прибыли дохода Общества с предоставлением налоговой декларации в ИМНС Лидского района по истечении года и перечислении денежных средств в бюджет государства один раз в год.
9. О назначении материального вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
10. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.

Место проведения собрания — г. Лида, ул. Тавлая, 11.
Время начала проведения собрания — 14.00.

С материалами по повестке дня можно ознакомиться по адресу: г. Лида, ул. Тавлая, 11 (приемная) с 5 марта 2010 г. с 8.00 до 17.00.
Регистрация участников собрания с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания.
Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества — паспорт, представителю акционеров — паспорт и доверенность.

УНП 500021268

МГКУ ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ
ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ КОНКУРС
НА ПОСТАВКУ В 2010 ГОДУ БИТУМА НЕФТЯНОГО ДОРОЖНОГО БНД 90/130 В ОБЪЕМЕ 3000 т ЗА СЧЕТ СОБСТВЕННЫХ СРЕДСТВ ПРЕДПРИЯТИЯ

Ориентировочная стоимость закупки составляет 3 000 000 000 руб. РБ.
Конечный срок подачи конкурсных предложений – до 11.00 25.02.2010 г. По условиям конкурса и с предложениями обращаться по адресу: 213000, г. Могилев, Чаусское шоссе, 4-й км; т./ф. 8 0222 46 16 09, адрес электронной почты: **dsp-mog@tut.by.** УНН 700444528.

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ НАСТУПНЫХ ПАСАД:

- кафедра менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці: дацэнт (2);
- кафедра псіхалогіі і педагогікі: дацэнт (2);
- кафедра беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры: старшы выкладчык (2);
- кафедра замежных моў: старшы выкладчык (2);
- кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый: старшы выкладчык;
- кафедра гісторыі і музеязнаўства: дацэнт;
- кафедра тэатральнай творчасці: старшы выкладчык;
- кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: старшы выкладчык;
- кафедра тэорыі музыкі і музычнай адукацыі: дацэнт (2);
- кафедра духавой музыкі: дацэнт;
- кафедра беларускай народна-песеннай творчасці: выкладчык; дацэнт;
- кафедра харавога і вакальнага мастацтва: выкладчык;
- кафедра мастацтва эстрады: выкладчык (3);
- кафедра беларускай і сусветнай мастацкай культуры: дацэнт;
- кафедра фізічнага выхавання і спорту: старшы выкладчык (2).

УНП 100286677

Наблюдательный совет ОАО МК-93 ставит в известность, что 26.03.10 г. в 10.00 в помещении ОАО Мехколонна № 93 (3 этаж) по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 13, состоится отчетно-выборное собрание акционеров по результатам работы за 2009 год.

Повестка дня

1. Отчет о работе Наблюдательного совета ОАО МК-93 за 2009 г., *докладчик — Председатель Наблюдательного совета Михальков Н.Я.*
2. Отчет дирекции о производственно-финансовой деятельности по использованию сметы ФЭС за 2009 год и утверждение плана социально-экономического развития и сметы ФЭС Общества Мехколонна № 93 по направлению на 2010 год.
Докладчик — директор ОАО МК-93 Сосновский В.М.
3. Отчет Ревизионной комиссии ОАО о работе за 2009 год и утверждение акта аудиторской проверки финансовой деятельности ОАО Мехколонна № 93 за 2009 год.
Докладчик — Афанасьев А.П.
4. Утверждение годового баланса ОАО МК-93 за 2009 год.
Докладчик — гл. бухгалтер ОАО МК-93.
5. Определение порядка выплаты дивидендов на 2010 г.
Докладчик — Сосновский В.М.
6. Изменение и дополнение Устава ОАО МК-93.
Докладчик — Михальков Н.Я.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии по ОАО Мехколонна № 93.
Докладчик — Сосновский В.М.
8. Определение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета, Ревизионной комиссии.
Докладчик — Сосновский В.М.

Председатель Наблюдательного совета ОАО МК-93 Н.Я. Михальков

УНП 100003019

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

Продавец – Лидский районный исполнительный комитет

Аукцион состоится в 12.00 16 марта 2010 г. в г. Лиде Гродненской обл. по ул. Советской, 8

Номер лота	1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
Адрес земельного участка, кадастровый номер	г. Лида, ул. Космонавтов, У-68 423650100007000795	г. Лида, ул. Свердлова, У-69 423650100005000844	г. Лида, ул. Строителей, У-70 423650100003000968	Лидский район Третьяковский сельсовет, д. Шейбаки, У-2 423685408636000106	г. Лида, ул. Красноармейская 423650100006000482	г. Лида, ул. Крупской 423650100006000732	г. Лида, ул. Свердлова, У-81 423650100002000755	г. Лида, ул. Центральная, У-82 423650100013001823	г. Лида, ул. Красноармейская, У-182 423650100005000855	г. Лида, ул. Красноармейская, У-183 423650100005000856
Целевое назначение земельного участка	Для строительства торгово-развлекательного центра	Для строительства магазина продовольственных и промышленных товаров с кафетерием	Для строительства магазина продовольственных и промышленных товаров с кафетерием	Для строительства магазина непродовольственных товаров	Для строительства супермаркета	Для строительства станции технического обслуживания	Для строительства пункта технического обслуживания легковых автомобилей с автомоечным комплексом	Для строительства магазина продовольственных и промышленных товаров	Для строительства пункта по оказанию страховых услуг	Для строительства мини-кафе
Срок аренды земельного участка	10 лет	10 лет	10 лет	50 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет
Площадь, га	0,3037	0,2024	0,2616	0,4670	3,9344	1,9836	0,5536	0,3000	0,0036	0,0102
Форма участка	неправильная	четырехугольная	четырехугольная	трапеция	неправильная	неправильная	четырехугольная	неправильная	четырехугольная	четырехугольная
Рельеф участка	равнинный	равнинный	равнинный	равнинный	пологий	равнинный	равнинный	равнинный	равнинный	равнинный
Расположение земельного участка	Центральная часть города	Северо-восточная часть города	Северо-восточная часть города	Южнее г. Лиды, в северо-западной части д.Шейбаки	Западная часть города, в районе объездной дороги	Западная часть города	Северная часть города	Восточная часть города	Центральная часть города	Центральная часть города
Транспортная доступность	Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Космонавтов (автобус № 4) приблизительно составляет 300 м	Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Свердлова (автобус № 3) приблизительно составляет 100 м	Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Строителей (автобус № 7) приблизительно составляет 10 м	Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. 1-я Новопрудская (автобус № 1) приблизительно составляет 10 м	Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта (автобусы №№ 1, 6, 9, 12) приблизительно составляет 100 м, до стоянки автомобилей – 20 м	Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Рыбиновского (автобусы №№ 1, 6, 9, 12) приблизительно составляет 1000 м	Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Притыцкого (автобус № 3) приблизительно составляет 350 м	Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Малахова (автобусы №№ 5, 6) приблизительно составляет 900 м	Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Красноармейской (автобусы №№ 1, 2, 6, 7, 7а, 8, 9) приблизительно составляет 100 м	Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Красноармейской (автобусы №№ 1, 2, 6, 7, 7а, 8, 9) приблизительно составляет 100 м
Инженерная инфраструктура	Существует возможность подключения к городским сетям: электричество (строительство закрытой трансформаторной подстанции), тепловые сети, водопровод, канализация (в существующую самотечную канализационную сеть) с условиями	Существует возможность подключения к городским сетям: электричество, газ, водопровод, канализация (существующий самотечный канализационный коллектор) с условиями	Существует возможность подключения к городским сетям: электричество, газ, водопровод с условиями	Существует возможность подключения к городским сетям: электричество, газ, водопровод с условиями	Существует возможность подключения к городским сетям: электричество, водопровод, канализация	Существует возможность подключения к городским сетям: электричество, тепловые сети,газ, водопровод, канализация с условиями	Существует возможность подключения к городским сетям: электричество (вероятно строительство трансформаторной подстанции), канализация (очистка сточных вод на местных очистных), водопровод, тепловые сети, газ с условиями	Существует возможность подключения к городским сетям: электричество (необходимо строительство трансформаторной подстанции), газ с условиями	Существует возможность подключения к городским сетям: электричество, канализация, водопровод с условиями	Существует возможность подключения к городским сетям: электричество, канализация, водопровод с условиями
Наименование ограничений в праве	Ограничение права в пользовании частью земельного участка площадью 0,0059 га в охранных зонах линий электропередачи, площадью 0,0045 га в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадью 0,0079 га в охранных зонах магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений	Ограничение права в пользовании частью земельного участка площадью 0,0035 га в охранных зонах линий электропередачи	Ограничение права в пользовании частью земельного участка площадью 0,0250 га в охранных зонах линий электропередачи	Ограничение права в пользовании частью земельного участка площадью 0,0169 га в охранных зонах линий электропередачи, площадью 0,0310 га в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадью 0,2107 га в охранных зонах магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений	Данные отсутствуют	Ограничение в праве пользования частью земельного участка площадью 0,0822 га в охранных зонах линий связи и радиофикации; частью земельного участка площадью 0,0773 га в охранных зонах подземных кабельных линий электропередачи, частью земельного участка площадью 0,0568 га в охранных зонах магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений, частью земельного участка площадью 0,0870 га в охранных зонах водопровода	Ограничение права в пользовании частью земельного участка площадью 0,0025 га в охранных зонах линий электропередачи, площадью 0,0315 га в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадью 0,0965 га в охранных зонах магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных сооружений	нет	нет	Ограничение права в пользовании частью земельного участка площадью 0,0011 га в охранных зонах линий электропередачи
Начальная цена предмета аукциона	77 274 830	32 466 280	38 100 910	1 521 382	747 144 680	379 744 680	63 276 300	32 084 070	650 500	1 843 100
Задаток, руб.	7 727 483	3 246 628	3 810 091	152 138	74 714 468	37 974 468	6 327 630	3 208 407	65 000	184 310
Условия для победителя аукциона	Возместить: - потери сельскохозяйственного производства в сумме 5 195 140 руб.; - за проектно-изыскательские работы по формированию земельного участка на право заключения договора аренды в сумме 899 647 руб.; - за государственную регистрацию создания земельного участка и права собственности в сумме 112 000 руб.	Возместить: - потери сельскохозяйственного производства в сумме 6 762 960 руб.; - за проектно-изыскательские работы по формированию земельного участка на право заключения договора аренды в сумме 724 808 руб.; - за государственную регистрацию создания земельного участка и права собственности в сумме 98 000 руб.	Возместить: - за проектно-изыскательские работы по формированию земельного участка на право заключения договора аренды в сумме 567 682 руб.; - за государственную регистрацию создания земельного участка и права собственности в сумме 98 000 руб; - произвести благоустройство прилегающей остановки автобуса № 7 по ул. Строителей или в случае необходимости произвести перенос ее на другое место с проведением работ по благоустройству	Возместить: - за проектно-изыскательские работы по формированию земельного участка на право заключения договора аренды в сумме 527 357 руб; - за государственную регистрацию создания земельного участка и права собственности в сумме 112 000 руб.	Возместить: - за проектно-изыскательские землеустроительные работы в сумме 2 534 308 руб.; - за экспертизу материалов по предварительному согласованию, оформлению и замене документов на право пользования земельным участком в сумме 177 402 руб.; - за государственную регистрацию в сумме 27 870 руб.	Возместить: - потери сельскохозяйственного производства в сумме 29 955 070 руб.; - за оформление предварительного согласования, установление границ земельного участка в сумме 2 132 271 руб.; - за государственную регистрацию создания земельного участка и права собственности в сумме 134 071 руб.	Возместить: - потери сельскохозяйственного производства в сумме 13 243 160 руб.; - за проектно-изыскательские работы по формированию земельного участка на право заключения договора аренды в сумме 650 208 руб.; - за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него в сумме 112 000 руб.	Возместить: - потери сельскохозяйственного производства в сумме 2 654 030 руб.; - за проектно-изыскательские работы по формированию земельного участка на право заключения договора аренды в сумме 628 423 руб.; - за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него в сумме 91 000 руб.	Возместить: - за проектно-изыскательские работы по формированию земельного участка на право заключения договора аренды в сумме 543 237 руб.; - за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него, изменения границ земельного участка в связи с регистрацией создания земельного участка в сумме 133 000 руб.	Возместить: - за проектно-изыскательские работы по формированию земельного участка на право заключения договора аренды в сумме 543 237 руб.; - за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него, изменения границ земельного участка в связи с регистрацией создания земельного участка в сумме 140 000 руб.
	внесение платы за право заключения договора аренды земельного участка; возмещение расходов по публикации извещения о проведении аукциона в СМИ (по факту); заключение с райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок и ограничений прав в пользовании земельным участком; получение в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; занятие земельного участка (начать строительство, иное освоение земельного участка) в течение шести месяцев со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка, возникновения права на него и ограничений права в пользовании земельным участком; по истечении срока аренды земельного участка совместно с Лидским районным исполнительным комитетом в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования.									

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) представляют в комиссию по организации и проведению аукционов следующие документы:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона;

заверенную копию платежного поручения о внесении задатка на счет 3642261280034 в ф-ле 413 АСБ «Беларусбанк» г. Лида, код 696, получатель Лидский райисполком, УНП 500826128.

Кроме того, в комиссию представляются:

гражданином – копия документа,содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой. Условием проведения аукциона является наличие не менее двух участников.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Если победитель аукциона в день проведения аукциона не подписал протокол, результаты аукциона по решению комиссии в отношении этого победителя аннулируются. При этом внесенный победителем задаток возврату не подлежит. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявка (заявление) на участие в нем подана только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Споры, возникшие в ходе проведения аукциона, разрешаются комиссией по проведению аукциона.

Документы для участия в аукционе принимаются по адресу: г. Лида, ул. Советская, 8, каб 53 с 9.00 до 17.00 по рабочим дням.

Последний день приема документов **10 марта 2010 г.** Телефон для справок (8 01561) 34014.

Предоставление дополнительной информации о земельных участках, которые предполагается передать в аренду по результатам аукциона, и их осмотр на местности производится землеустроительной и геодезической службой Лидского района. Телефон для справок (8 01561) 26576.

АЛІМПІЙСКІ СПАКОЙ ЗАКАНЧВАЕЦЦА

Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» перадае з Ванкувера

Сёння ў канадскім Ванкуверы пройдзе ўрачыстае адкрыццё XXI зімовых Алімпійскіх гульняў. Гэта адбудзецца ў 18.00 па мясцовым часе. Праўда, з-за 10-гадзіннай розніцы паясоў — у Беларусі гэта ўжо будзе суботняя раніца.

Пасля сутачнага знаходжання ў Ванкуверы, што прызнаны самым камфортным месцам пражывання на планеце Зямля, «кайфу» не адчуваеш. Дажджлівая імгла, цёмныя хмары... Праўда, у гарадскім метро, якое на час правядзення Гульняў стала пастаянным «турыстычным» месцам для многіх гасцей і журналістаў амаль са 100 краін свету, бо грамадскі транспарт для «папарацы» на цэлы месяц бясплатны, бачыш, як радуецца мясцовы люд гэтаму грандыёзнаму алімпійскаму святу. Па першай тваёй просьбе яны гатовыя расказаць, колькі станцый трэба яшчэ праехаць і на якой абавязкова выходзіць, і могуць размаўляць з табой на тэму магчымых алімпійскіх чэмпіёнаў, асабліва ў хакеі. Зрэшты, калі раптам і прапусціш свой прыпынак, то нічога страшнага не адбудзецца. Па-першае, цягнікі метро ходзяць кожныя тры хвіліны. Па-другое, у любым выпадку пераезд зойме не больш за 20 хвілін. Па-трэцяе, метро падыходзіць прама да алімпійскага прэс-цэнтра, выйшаў — і праз хвіліну на месцы.

Паслугі для журналістаў тут традыцыйныя. Праўда, пасля летняй Алімпіяды ў Пекіне, калі кітайцы значна пакрылі свае арганізацыйныя расходы на правядзенне Гульняў коштам падключэння да інтэрнэту ў 500 амерыканскіх доларах, у гэтай сферы паслуг тут амаль нічога не змянілася. На 32 дні знаходжання і работы і ў інтэрнэце пакет з «сусветнай павуцінай» каштуе цэлых 560 канадскіх долараў, а мінімальная паслуга ў 14 дзён «цягне» на 260. З іншых «сюрпрызаў» — платная вада і іншыя напоі, за выключэннем гатаванага чаю ў пакеціках і кавы. Правоз сала і іншых прадуктаў харчавання ў Канаду строга забаронены. Але ж мы ўмудрыліся правезці ўсё без праблем, у цэласці і захаванасці, чым вельмі задаволены — сціпла перакусіць адзін раз тут абыдзецца прыкладна ў 15 канадскіх долараў.

Па шматлікіх тэлевізійных каналах, як і ў спартыўнай канадскай прэсе, народ інфармуецца аб прагнозе надвор'я па ўсёй краіне. Праўда, акцэнт на плюсавую тэмпературу Ванкувера не робіцца. Якніяк, апошняе пацяпленне такога плана ў Ванкуверы было больш за паўстагоддзя таму. Тым не менш, лічаць арганізатары і канадскія тэлевізійнікі, навошта народу галаву забіваць рознымі праблемамі. Снегу ўсё адно хопіць: калі што, на дапамогу прыйдзе снежная гармата! Лепш паглядзець на хакеістаўэнхаэлаўцаў: расіяніна Аляксандра Авечкіна і канадца Сідні Кросбі. Абедзве гэтыя зоркі гуляюць на пазіцыі форвардаў у амерыканскіх клубах «Вашынгтон» і «Пітсбург». Відавочна, што такая хакейная застаўка з'явілася падставай паказаць урачыстыя провады хакейнай зборнай ЗША ў Ванкувер. Адметнасць яе у тым, што наказ у дарогу майстрам шайбы з клюшкай на афіцыйным прыёме ў Белым доме даваў прэзідэнт ЗША Барак Абама. У якасці прэзенту за добрыя словы амерыканскія хакеісты падарылі першай асобе краіны прафесійны світэр з нумарам 44.

Асобнае месца ў тэлевізійных роліках, пакуль яшчэ не насычаных галамі, ачкамі і секундамі, займала трансляцыя трэніроўкі цырымоніі адкрыцця.

А так нічога звышдынарнага, вакол «знаёмыя ўсё тварыны» — расійскія, украінскія і малдаўскія журналісты. Напрыклад, каментатар РТР Кірыл Набутаў прапанаваў журналісту «Звязды» дыялог наконт шанцаў і медальных магчымасцяў беларускай зборнай. Класічны адказ у два залатыя медалі — біятланістка Дар'я Домрачава і мужчынскі фрыстайл на выбар — Кушнер, Дашчынскі, Грышын — яго поўнасцю задаволіў. Зрэшты, перадстартавыя падрабязнасці маглі быць і большымі. Праўда, на Алімпіядзе ў Ванкуверы праход журналістам у алімпійскую вёску, дзе жывуць спартсмены, забаронены нават пры выпісаным пропуску. Размова толькі ў міжнароднай зоне, адкуль да алімпійцаў некалькі кіламетраў. Калі што, звязвайся па тэлефоне, выклікай на гутарку. Так што інфармацыю журналістам давядзецца здабываць і нейкімі нелегальнымі шляхамі. Таму мы не сумняваемся, што ў найбліжэйшы час здолеем прарвацца да беларускіх зорак і атрымоўваць усю інфармацыю з першых вуснаў. Тут пагаворваюць, што такое табу журналістам было вынесена ў канцы пекінскай Алімпіяды, калі журналісты аднаго з неакрэдытаваных на Гульнях беларускіх тэлеканалаў пры поўнай забароне на гэта арганізавалі здымкі пад вокнамі офіса Міжнароднага алімпійскага камітэта. Рэакцыя чыноўнікаў з МАКа была імгненнай — узмацніць кантроль і не дапускаць такіх выпадкаў на будучыню.

Між тым напярэдадні ўрачыстага адкрыцця нашы ўсходнія суседзі — расіяне і украінцы — адкрылі свае алімпійскія дамы ў Ванкуверы. Калі ў жоўта-блакітных усё прайшло ціха, ніхто нават і не ўспомніў пра прэзідэнцкія выбары, то ў расіян ўсё было арганізавана з помпай. Шматлікія VIP-персоны, народныя артысты. Праўда, беларускім журналістам акрэдытацыі на гэтае мерапрыемства атрымаць не ўдалося — толькі па папярэдніх заяўках. Размах мерапрыемства ўдалося вызначыць проста: расіяне для запрошаных гасцей выклалі з канадскага лёду вароты з надпісам «Сочы-2014». Што казаць, міласці просім да нашага шалаша, і прывыкайце, шаноўныя, ужо да новых Алімпійскіх гульняў.

Здаецца, што з наступленнем Алімпійскіх гульняў іх арганізатары зменшылі ціск на прадстаўнікоў прэсы ў фінансавым плане. Яшчэ ў першы дзень вельмі актуальнай была праблема пражывання. Нягледзячы на тое, што нумары для журналістаў былі аплачаны беларускім бокам загадзя, канадцы запатрабавалі гарантыі фінансавай стабільнасці прадстаўнікоў айчынных СМІ — 100 амерыканскіх долараў дэпазіту на дзень знаходжання. Хочаш — наяўнымі, хочаш — банкаўскай карткай. Уладальнікі гатэляў такім чынам, відаць, вырашылі перанесці груз адказнасці за захаванасць казённай маёмасці ў гасцінічных нумарах з патэнцыйных буйных турыстаў-славян на журналістаў. Праблемы пражывання ўсё ж могуць напаткаць заўзятых курцоў. А такія ў журналісцкай дэлегацыі ёсць. Курэнне забаронена ўсюды. Калі што, на першы раз штраф у 150 канадскіх долараў. Праўда, мясцовыя валанцёры, значную частку якіх складаюць выхадцы з Расіі, па сакрэце сказалі: курыць на вуліцы можна. Толькі ад памяшкання неабходна адысці 6 метраў. Чаму менавіта столькі — ніхто не тлумачыць. Але ж нашы ўмудраюцца пакурваць усюды, дзе ёсць свежае паветра. У Міжнародны прэс-цэнтр уваходзіць і адкрытая набярэжная, куды можна выйсці праз дзверы шкляной вітрыны. А там на фоне воднай гладзі і гор на дэкаратыўнай агароджы пастаянна сядзяць птушкі накшталт чаек ці бакланаў. Дык вось курцы, і не толькі прадстаўнікі нашай краіны, пускаюць клубы дыму на крылатых. Відаць, да тытунёвага дыму яны ўжо прывыклі, бо вядуць сябе вельмі спакойна і не падаюць выгляду, што баяцца чалавека.

Магчыма, гэтыя канадскія птушкі — прадвеснікі алімпійскага спакою для спартсменаў. Хоць чакаць засталося няшмат. Сёння разам з адкрыццём Алімпіяды пройдуць першыя старты ў скакуноў з трамплінаў.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.
Ванкувер, Канада.

«САМАЕ ГАЛОЎНАЕ: ГОД ПАКАЗАЎ, ШТО РАСЦЕ ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ НАШЫХ ІНСПЕКТАРАЎ»

«Па ўсіх кірунках нашай дзейнасці за мінулы год мы атрымалі станоўчыя вынікі», — адзначыў на брыфінгу напярэдадні выніковай калегіі Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь яе начальнік Міхаіл АРЭШКА. — У параўнанні з папярэднім годам мы выявілі на 35 працэнтаў больш злачынстваў. У следчыя органы перададзена 675 матэрыялаў. Распачынанне па гэтых справах на сёння складае 86 працэнтаў. Гэта сур'ёзныя паказчыкі».

Што стаіць за сухімі лічбамі статыстыкі?

Гэтыя словы ў поўнай меры пацвярджаюць і іншыя лічбы. Паводле слоў Міхаіла Адамавіча, у казну было адпраўлена каля 3,2 мільярда рублёў у выглядзе штрафаў і 2,5 мільярда рублёў — у выглядзе пакрыцця шкоды, нанесенай прыроднаму асяроддзю. За мінулы год падраздзяленнямі Дзяржінспекцыі было выяўлена 13,7 тысячы парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства. Пацвярджэннем прафесіяналізму інспектараў з'яўляецца і павелічэнне на 47 працэнтаў колькасці канфіскаванай агнястрэльнай зброі, з якой 42 працэнты — незарэгістраванай. Характэрна, што колькасць канфіскаванай у парушальнікаў зброі, што выкарыстоўваецца для палявання, з года ў год няўхільна павялічваецца. «А вы ведаеце, што такое незарэгістраваная зброя ў лесе, дзе нікога няма, дзе яе можна ў любы момант выкарыстаць, пазбавіцца ад яе?».

За мінулы год на 47 працэнтаў павялічылася колькасць канфіскаванай у парушальнікаў незаконна здабытай рыбы (2009 год — 22,8 тоны, 2008 год — 15,6 тоны) і на 45 працэнтаў рыбы, канфіскаванай у раскрадальнікаў і вернутай рыбаводчым арганізацыям (2009 год — 9 тон, 2008 год — 6,2 тоны). У парушальнікаў было канфіскавана 14,7 тысячы прыладаў незаконнай лоўлі рыбы, у тым ліку 10,5 тысячы сетак. А незаконна ссечанай драўніны за азначаны перыяд па аб'ёме было выяўлена больш на 31 працэнт у параўнанні з 2008 годам. Пры гэтым часта адзначаліся выпадкі, калі супрацьпраўныя дзеянні здзяйсняліся з ведама кіруючых асобаў, закліканых якраз кантраляваць захаванне заканадаўства.

Спецыялізацыя сярод арганізаваных браканьераў

Паводле слоў начальніка Дзяржінспекцыі, сёння, акрамя выпадковых браканьераў («напіўся або па няведанні»), арганізаваныя парушальнікі пачалі ўкараняць у сваім асяроддзі спецыялізацыю. «Калі гаварыць пра лоўлю рыбы, напрыклад, дык адны яе ловяць, другія — ахоўваюць, трэція — забіраюць, чацвёртыя — прадаюць. І адносна палявання такое назіраецца, а па лесе — было і раней», — распавёў Міхаіл Арэшка. Арганізаваныя браканьеры прымяняюць найноўшае абсталяванне, напрыклад, GPS.

— Яны прытопліваюць уловы, незаконныя прылады лоўлі, а потым пры дапамозе сістэмы GPS знаходзяць. У іх магутныя рухавікі, высокай праходнасці тэхніка. Але і ў нас ёсць прыборы, у тым ліку начнога бачання і іншае, што дазваляе выяўляць і дакументаваць злосныя парушэнні, — сказаў Міхаіл Адамавіч. — Сярод планаў Дзяржінспекцыі на гэты год — якраз узмацненне барацьбы з арганізаваным замаскіраваным браканьерствам.

За мінулы год у 2,5 раза павялічылася колькасць аказання супраціву інспектарам. Часам апошнім даводзілася нават выкарыстоўваць зброю. У гэтай сувязі было адзначана, што вялікую дапамогу дзяржінспектарам аказваюць мясцовыя органы ўнутраных спраў — ад ДАІ да ўчастковых. Была адзначана і зладжаная праца з іншымі міністэрствамі і ведамствамі. «Скажу прама: павярнуліся тварам да дзяржаўнай службы і арандатары паляўнічых і рыбалоўных угоддзяў». Усё гэта разам узятае дало свой плён: у судах практычна ўсе справы праходзяць без заўваг.

«Нам моцна дапамаглі грамадзяне»

Напэўна, тут варта асобна спыніцца на той дапамозе, якую дзяржінспектарам аказвала і аказвае насельніцтва. Напрыклад, паводле слоў Міхаіла Арэшкі, з названых вышэй 675 спраў, перададзеных у следчыя органы для вырашэння пытання аб завядзенні крымінальных спраў, прыкладна чвэрць — гэта сігналы грамадзян. Гаворка ідзе пра фактычна адноўлены інстытут грамадскіх інспектараў. Крытэрыі адбору такіх людзей — самыя сур'ёзныя, аднак галоўны сярод іх — каб грамадзянін быў законапаслухмяным, адзначыў начальнік Дзяржінспекцыі, адказваючы на пытанні журналістаў. «Калі ў чалавека ёсць непагашаныя адміністрацыйныя спагнанні на працягу года — такая кандыдатура не будзе нават разглядацца». Міхаіл Арэшка паведаміў, што штат такога інстытута грамадскіх інспектараў, як плануецца, будзе створаны ў найбліжэйшы час цалкам, як мяркуецца, да наступлення тэрмінаў веснавога нерасту.

Фіш-картка ў Беларусі: пытанне адкрытае

— Мы зыходзім з прынцыпу, што не трэба кідацца ў вір галавой, а лепш гэта пытанне яшчэ паабмяркоўваць, падэбатаваць і вызначыцца з тымі асаблівасцямі, якія могуць быць у нашай дзяржаве, — сказаў на брыфінгу Міхаіл Арэшка, адказваючы на пытанне журналіста «Звязды».

Нагадаем, што пэўны час таму была агучана інфармацыя адносна магчымага ўвядзення ў нашай краіне названай фіш-карткі — білета, які дазваляў бы лавіць рыбу ў дзяржаўных рыбалоўных угоддзях і за пэўную плату — у арандаваных вадаёмах. Нехта параўнаў яго з падаткам для рыбаловаў, кшталту адзінага для індывідуальных прадпрымальнікаў. Такая практыка выкарыстоўваецца ў шэрагу краін. І як быццам бы частка айчынных рыбаловаў-аматараў, згодна з апытаннямі, гатовая плаціць за магчымасць займацца любімым хобі грошы, якія маглі б пайсці на развіццё інфраструктуры для абслугоўвання іх саміх, правядзення розных даследаванняў, рыбааднаўленчых і рыбаахоўных мерапрыемстваў. Іх пазіцыя: мы столькі выдаткоўваем на набыццё рыбалоўных прыладаў, што дзеля такой высакародная па задуме мэты адшкадуем і яшчэ пэўную суму ў год. Аднак ідэя ўвядзення фіш-карткі практычна адразу займела як прыхільнікаў, так і яе праціўнікаў. Не ўдаючыся ў нюансы, можна проста прыгадаць таго ж звычайнага рыбалова-аматара, які, па-першае, не заўсёды можа пахваліцца высокімі даходамі, па-другое, жывучы на беразе возера ці рэчкі, з дзяцінства прызвычаіўся проста дзеля адпачынку бавіць рэдкі вольны час з вудай на беразе згаданага возера ці ракі. Думаецца, патлумачыць яму, чаму ён павінен будзе за гэта плаціць нейкія грошы, нават сімвалічныя, будзе дастаткова няпроста.

— Таму калі сёння ўзяць злепак з іншай дзяржавы і перанесці гэта да нас, гэта можа прынесці не станоўчы вынік, а адмоўны, — сказаў Міхаіл Адамавіч. — У тых змяненнях і дапаўненнях, якія ўнесены ў Адміністрацыю Прэзідэнта, і якія ў найбліжэйшы час будуць разгледжаны, і, думаю, падтрыманы і зацверджаны кіраўніком дзяржавы, пакуль гэтае пытанне застаецца адкрытым.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КРЫНІЦА ВЕДАЎ

Кніжная выстава

Учора на Мінскай міжнароднай выставе быў «Дзень ведаў». Новыя слоўнікі, энцыклапедычныя выданні, навуковую літаратуру прэзентавалі беларускія выдавецтвы. Нават матэрыялы-трэнінгі для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання: выпускнікам і іх бацькам самы час прыглядацца да такіх кніжак. Але яшчэ застаюцца два дні, калі дакладна вядома, дзе іх можна набыць.

Субота абяцае быць вельмі гарачым днём на выставе, бо актыўна прадэманструюць сваю прадукцыю буйныя айчынныя кнігавыдаўцы — «Беларуская энцыклапедыя імя Броўкі» падрыхтавала шэраг выданняў на гістарычную тэму, сярод якіх ёсць нават такая: «Гісторыя беларускай кнігі. Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага». Удакладніць веды пра тое, што адбывалася 200 гадоў таму, дапаможа кніга Адама Мальдзіса «Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі. Восень пасярод вясны», якая выйшла ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». Свае кнігі прадэманструюць выдавецтвы «Беларусь» і «ЛіМ». І што цікава — амаль ва ўсіх нашых буйных дзяржаўных выдаўцоў ёсць кнігі па гісторыі і культуры беларусаў. Значыць, імкненне глыбей спасцігаць і разумець саміх сябе ў людзей яшчэ не вычарпана.

Ёсць імкненне разумець і іншых. Французаў, напрыклад. Ужо з першага дня французскія літаратары, мастакі, якія працуюць па афармленні кніг, даследчыкі і кнігагандляры не проста знаёмяць са сваімі кнігамі, яны адкрытыя да кантактаў, ахвотна раздаюць аўтографы, імкнуцца весці і сур'ёзную размову з беларускімі чытачамі і зацікаўленымі асобамі ў выдавецкай галіне пра тое, што значыць быць пісьменнікам у сучасных умовах, пра што трэба гаварыць, напрыклад, сённяшняй моладзі са старонак кніг. Бо пісьменнік не існуе без сваіх чытачоў, інакш ён проста не існуе як пісьменнік. Ці то ў Францыі, ці то ў Беларусі. І хіба недзе бывае інакш?..

— Мы спадзяёмся, што на сёлетняй выставе людзі знойдуць для сябе шмат цікавых кніг, бо мы імкнуліся задаволіць самы шырокі попыт. Таму разлічваем на добрае наведванне выставы, — сказаў выканаўчы дырэктар Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу Дзмітрый Макараў. — Што да мяне, дык наогул трошкі крыўдна, што да такога шырокага, сур'ёзнага і прадстаўнічага мерапрыемства мы вядзём падрыхтоўку вельмі доўга і адказна, а доўжыцца яно ўсяго пяць дзён.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Журботная статыстыка: 33 няшчасці на паляванні

Паводле звестак Дзяржаўнай інспекцыі па ахове жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, за апошнія тры гады на паляванні адбылося 33 няшчасныя выпадкі. У 20 выпадках людзі загінулі, у 13 — атрымалі раненні.

Толькі з пачатку гэтага года ўжо адбылося некалькі падобных здарэнняў. Як мы пісалі, у Мікашэвіцкім лясгасе адзін паляўнічы, страляючы на шорах, патрапіў карцеччу ў калегу. Потым пад стрэл ляснічага па не вельмі добра бачнай цэлі — зноў жа карцеччу — патрапіў 15-гадовы школьнік, які шукаў у лесе бацьку, што выправіўся на паляванне. Калю з паляўнічага карабіна ў грудзі атрымаў грамадзянін, які знаходзіўся ў вагончыку — пасля завяршэння палявання пры выхадзе з машыны адбыўся самаадвольны стрэл са зброі іншага паляўнічага...

У Дзяржінспекцыі лічаць: журботная статыстыка падказвае, што за парушэнне тэхнікі бяспекі трэба караць самым суровым чынам. У тым ліку і з абавязковым пазбаўленнем права займацца паляваннем. Магчыма, у гэтым выпадку, мяркуюць спецыялісты, атрымаецца знізіць гібель і траўматызм у асяроддзі паляўнічых...

Сяргей РАСОЛЬКА.

Уважаемые акционеры ОАО «ЖАБИНКОВСКИЙ САХАРНЫЙ ЗАВОД»!

ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ЖАБИНКОВСКИЙ САХАРНЫЙ ЗАВОД» ПЕРЕНОСИТСЯ С 19 ФЕВРАЛЯ 2010 г. НА 23 ФЕВРАЛЯ 2010 г.

Собрание пройдет по адресу: г. Жабинка, ул. Калинина, Дом культуры ОАО «Жабинковский сахарный завод»

Повестка дня собрания:

1. Об утверждении разделительного баланса.
2. Об уменьшении размера уставного фонда Общества.
3. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества.
4. Об определении перечня акционеров ОАО «Столичный проспект».
5. О внесении изменений в решение по шестому вопросу повестки дня общего собрания акционеров ОАО «Жабинковский сахарный завод» от 24.03.2009, протокол № 33.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: в рабочие дни (понедельник—пятница) начиная с 15.02.2010 г. по 22.02.2010 г. по месту нахождения Общества: г. Жабинка, ул. Калинина, заводоуправление (отдел кадров) с 8.00 до 16.30, 23 февраля 2010 г. по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 23 февраля 2010 года в 14.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 12 февраля 2010 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: **акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.**

УНП 200037600

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ПОСТТОРГ»

Открытое акционерное Общество «Посттторг» (г. Минск, ул. Клумова, 3)

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Собрание состоится 30 марта 2010 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Уральская, 3, РДК им. Н.Ф. Шарко.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год и основных направлениях развития Общества в 2010 году.
2. Утверждение заключения аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год, заключение Ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности Общества за 2009 год.
3. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков за 2009 год.
4. О работе Наблюдательного совета в 2009 году.
5. О распределении чистой прибыли и о дивидендах за 2009 год и направлениях использования чистой прибыли в 2010 году.
6. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.
7. Утверждение локальных нормативных актов.
8. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
9. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
10. Определение органа публикации информации ОАО «Посттторг».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Клумова, 3, комн. 21 с 22 по 30 марта 2010 года с 9.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) либо 30 марта 2010 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания в день проведения собрания с 9 часов до 9 часов 45 минут по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: **акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 10 марта 2010 года.

УНП 100036531. Наблюдательный совет

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) 17 МАРТА 2010 ГОДА

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

ПО ПРОДАЖЕ ЕДИНЫМ ЛОТОМ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО ОАО «УНР КЭУ» (ПРОДАВЕЦ). НА АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ ВЫСТАВЛЯЮТСЯ:

Наименование и характеристики имущества, входящего в состав лота	- здание лесопильного цеха, литер В 1/к, инвентарный номер 500/С-10017, общая площадь 377 кв. м; - эстакада склада леса (инв. № 204).
Местонахождение имущества	г. Минск, ул. Геологическая, д. 87.
Начальная цена лота с учетом НДС	440 000 000 белорусских рублей
Сумма задатка	10 000 000 белорусских рублей

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за объект продажи (лот). Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Аукцион состоится **17 марта 2010 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 15.02.2010 по 15.03.2010** включительно в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017)227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости» (ул. К. Маркса, 39, 220030 г. Минск);
(017)281 04 99, 385 09 30 – ОАО «УНР КЭУ» (ул. Геологическая, д. 87, 220138 г. Минск).

Сайт в интернете: www.mgcn.by

НЕКАТОРЫЯ ЖЫХАРЫ СТАЛІЧНАГА ЗААПАРКА ПРАЧНУЛІСЯ ПАСЛЯ ЗІМОВАЙ СПЯЧКІ

У Мінскім заапарку пасля зімовай спячкі прачнуліся барсучыха Фіфа і парачка янотаў. Пра гэта расказала намеснік дырэктара заапарка Наталля Лебедзева. Цяпер у жывёл нармалізаваўся апетыт, але звяркі застаюцца маларухомымі і практычна не выходзяць з дамкоў. Такім чынам яны набіраюць страчаную за час спячкі вагу. Згодна з законамі матухны-прыроды, са з'яўленнем прыкмет надыходнай вясны (нават нязначным пацяпленнем, павелічэннем працягласці светлавога дня) першымі прачынаюцца дробныя жывёлы, а пасля мядзведзі. Калі ў сталіцу не вернуцца моцныя маразы, то касалапыя жыхары заапарка Трыстан і Ізольда прачнуцца пад канец лютага.

Вераніка ЛЕБЕДЗЕВА, *«Мінск—Навіны»*.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА БЕЗ УСЛОВИЙ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ОБРАЩЕННОГО В ДОХОД ГОСУДАРСТВА

Адрес объекта и его наименование	- ангар, расположенный по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. В. Гастинец, 67, инв. № 16-00091, общей площадью 394,4 кв. м, год постройки 1979, фундамент кирпичный, стены металлические, крыша металлическая, полы бетонные. Начальная цена 135 200 000 рублей. - трехкомнатная квартира, расположенная по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Томилина, 30-2, стены кирпичные, изнутри оштукатуренные; перегородки гипсовые, оштукатуренные; полы – линолеум; двери филенчатые; общей площадью 64,8 кв. м, площадь жилых комнат 44,6 кв.м, площадь подсобных помещений 20,2 кв.м, год постройки 1974. Начальная цена 110 600 000 рублей. - одноэтажное кирпичное здание (комплекс состоит из столярного цеха, лесопильного цеха, бытового помещения, кран-балки), расположенное по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Элеваторная, 5, общей площадью 851,1 кв. м, год постройки 1976. Начальная цена 256 600 000 рублей. - бокс гаражный, кирпичный, расположенный по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Элеваторная, 5, общей площадью 92,8 кв. м, год постройки 1978. Начальная цена 29 600 000 рублей.
Продавец	Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Молодечненском райисполкоме
Организатор аукциона	СИКУП «УКС-СЕРВИС»
Сумма задатка	- ангар – 13 520 000 (Тринадцать миллионов пятьсот двадцать тысяч) рублей на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-СЕРВИС»; - квартира – 11 060 000 (Одиннадцать миллионов шестьдесят тысяч) рублей на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-СЕРВИС»; - одноэтажное кирпичное здание – 25 660 000 (Двадцать пять миллионов шестьсот шестьдесят тысяч) рублей на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-СЕРВИС»; - бокс гаражный, кирпичный – 2 960 000 (Два миллиона девятьсот шестьдесят тысяч) рублей на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-СЕРВИС»
Порядок оплаты	Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 2 месяцев и 25 дней на р/с СИКУП «УКС-СЕРВИС»
Документы, представляемые для участия в аукционе	заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, заверенные нотариально, доверенность, выданную представителю юридического лица; физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, справку ГНИ об отсутствии задолженности по подоходному налогу.
Конечный срок и адрес приема заявок	15.03.2010 г., до 16.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел. (8 0176) 75 16 09, 75 19 20 (факс)
Дата, время и место аукциона	16.03.2010 г. в 15.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, СИКУП «УКС-СЕРВИС»

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА БЕЗ УСЛОВИЙ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ОБРАЩЕННОГО В ДОХОД ГОСУДАРСТВА

Адрес объекта и его наименование	- часть здания административно-производственного, общей площадью 472,7 кв.м, расположенного по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Машерова, 10. Начальная цена 217 801 710 рублей. - здание административно-бытового корпуса, инв. № 546752, общей площадью 861,1 кв. м, год постройки 1979, количество этажей – 4, фундамент бетонный, стены кирпичные, каркас с панельным заполнением, перекрытия железобетонные, кровля рулонная, проводка внутренняя, водопровод – стальные трубы, канализация – чугунные трубы, расположено по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Замковая, 19. Начальная цена 354 823 200 рублей. - караульное помещение, инв. № 546043, общей площадью 76,3 кв.м, фундамент бетонный, дощатощитовое строение, кровля шиферная, отопление печное, количество этажей – 1, год постройки 1976, расположено по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Замковая, 19 К. Начальная цена 30 186 900 рублей. - здание участка литья пластмасс, общей площадью 187,4 кв.м, год постройки 1991, количество этажей – 1, фундамент бетонный, стены кирпичные, перекрытие чердачное железобетонное, крыша – рубероид, расположено по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Замковая, 19. Начальная цена 88 174 980 рублей. - здание столовой с подвальным помещением и помещением трансформаторной подстанции, инв. № 16-00096, общей площадью 5379,2 кв. м, год постройки 1981, количество этажей – 3, фундамент бетонный, стены кирпичные, панельные, с ж/б колоннами, крыша – совмещенная рулонная, проводка внутренняя, вентиляция принудительная, водопровод – металлические трубы, горячее водоснабжение – центральное, центральное отопление от ТЭЦ, грузовой лифт, шахты железобетонные, канализация – чугунные трубы, 2 крыльца, отмостки, балкон, износ 32,2 %; трансформатор ТМ 400/10/04, инв. № 18-00011; подстанция трансформаторная ТРП, инв. № 18-00010, расположенные по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. В. Гастинец, 67. Начальная цена 1 753 449 525 рублей. - бассейн оборотного водоснабжения, инв. № 16-00087, общей площадью 464 кв. м, материал – железобетон, расположен по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. В. Гастинец, 67. Начальная цена 64 437 930 рублей. - площадка для сбора мусора, инв. № 16-00113, общей площадью 94,2 кв. м, материал покрытия – бетонная стяжка, ограждение железобетонное и металлическое, расположена по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. В. Гастинец, 67. Начальная цена 5 137 830 рублей. - корпус 16Б, АСУП, инв. № 16-00044, общей площадью 1216,1 кв.м, год постройки 1987, количество этажей – 3, фундамент бетонный, стены кирпичные, крыша рулонная, отопление центральное, расположен по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. В. Гастинец, 67. Начальная цена 254 016 000 рублей. - помещение малярного участка, инв. № 630/С-39907, общей площадью 352,3 кв.м, год постройки 1974, количество этажей – 1, стены кирпичные, перекрытие железобетонные плиты, отопление центральное, расположено по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Промышленная, 4. Начальная цена 68 493 600 рублей.

Рэверс з сецiва

АСАДАБАДСКІ СПЕЦНАЗ ЗБІРАЕ СВАІХ ШУРАВІ

(12 снежня 2009 года)

Гэты атрад для Беларусі ўнікальны. У гады афганскай вайны пра яго даведаўся ўвесь свет.

Толькі мы дагэтуль мала ведаем пра тое, як яны ваявалі. Вясной з нагоды 25-годдзя з дня фарміравання 334-ы асобны атрад спецыяльнага прызначэння збірае ўсіх сваіх байцоў... Гэтакі атрад у Беларусі — адзіны. Сёння тыя, што засталіся жывымі, збіраюцца зноў... Яны запрашаюць на сустрэчу бацькоў і сваякоў загінулых сяброў. Яны шукаюць усіх, хто служыў у складзе батальёна...

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

@

20 гадоў нікому не паказваў сваё ветэранскае пасведчанне. Ільготы ёсць, але карыстацца імі няма ахвоты. І я не адзін такі. Лепей пераплачу за білет, чым дастану пасведчанне, убачу вочы кантралёра, а потым увесь дзень буду пра гэта думаць. Стаўленне да нас, воінаў-інтэрнацыяналістаў, у грамадстве склалася, мякка кажучы, неадэкватнае. А чаму? Ды таму, што тады, калі хлопцы пачалі вяртацца, пакалечаныя, ніхто не ведаў альбо мала што ведаў, адкуль яны, і што там рабілі. Вось і нянавісць нараджалася, і зайздрасць: чаму кватэру яму, а не мне. Які гэта ён ветэран? Такі ж, як я! А потым паліўся са СМІ бруд, вайну назвалі памылкай, і на тых, хто ваяваў, увогуле не ведалі, як глядзець. А па сутнасці, у Афгане мы ажыццяўлялі першую антытэрарыстычную аперацыю. Безумоўна, палітыкі, і бруду, і памылак хапала. Аднак да гэтага ніхто не сказаў пра гэту вайну галоўнага.

Шураві.

@

Гэтыя хлопцы, бясспрэчна, героі. Але немагчыма не думаць пра тых, хто вінаваты ў тым, што яны там гінулі. На жаль, там аказваліся самыя сумленныя, бо астатнія — «адмазваліся». Вось бы туды дзяцей тых, хто прымаў рашэнні. І вось яшчэ што крыўдна. Кажуць, сем'і тых жа маджахедаў, у выніку іх гібелі, застаюцца цалкам забяспечаныя. А ў нас? Інвалідам увогуле трэба плаціць так, каб яны ў любы момант маглі аплаціць любую дапамогу. Што ўжо і казаць пра тыя сем'і, дзе «афганцы» загінулі...

Ляксееўна.

@

І ў Афгане служылі па-рознаму, былі і тыя, хто ні разу не стрэліў, і хто не бачыў «духаў» увогуле. Адзначыліся, як кажуць, і таксама — воіны-інтэрнацыяналісты. Але тыя хлопцы, пра якіх матэрыял, — сапраўды ваявалі і гінулі. І сапраўды, нават дзеці мала што ведаюць пра сваіх бацькоў. Расказваць пра гэта няма жадання, але... ды і як пра такое расказаш? Аднак было б несправядліва, каб пра гэту вайну і тых, хто на ёй гінуў і сапраўды ваяваў, маўчалі і нічога не ведалі.

Сусед.

@

«Аддзяленне беларуса Юрыя Гаўраша, 7 чалавек, знайшлі потым за глінабітнай сцяной — дувалам. Яны адбіваліся да апошняй міны. Гэту апошнюю АЗМ-72 трымаў украінец Славік Марчанка. Калі скончыліся боепрыпасы, Славік, па агульнай дамоўленасці, прывёў міну ў дзеянне. Напярэдадні, 20 красавіка, Юрыю Гаўрашу споўнілася 19 гадоў».

ДЕВЯТНАДЦАЦЬ НЕСБЫВШИХСЯ ЛЕТ

«У тым баі мы страцілі аднаго салдата... Яму ў той дзень споўнілася дзевятнаццаць...»

(з расказа афіцэра-афганца)

«Поздравляю, сынок, — пишет мама, —
С днем рожденья...» Придет ли ответ?
Сын упал со смертельною раной
В девятнадцать несбывшихся лет.

Девятнадцать ударили пулей,
Накатили горячей волной,
Материнской слезою блеснули
На щеке бесконечно родной...

«Поздравляю, сынок, будь счастливым...» —
Пишет письма далекая мать.
Как же больно и несправедливо:
В девятнадцать — уже умирать!

В день рождения свой умирать...

P.S. *Чуў неяк па тэлебачанні... Не ведаю, ці той гэта выпадак — расказваюць афганцы скупа... Не магу спакойна ставіцца да такіх гісторый — вось і напісалася... Цэлае пакаленне пакалечылі. Кінулі ў пекла, а потым, маўляў, памылка выйшла... Вельмі дарагая памылка! Дзякуй богу — у нас зараз, здаецца, разабраліся, па-чалавечы сталі ставіцца да падзей таго перыяду і да людзей.*

Пётр Звягінцаў.

Сайт «Звязды»: www.zviazda.by

У ЗАГСах Мінска маладажоны пякуць бліны

Масленіца з даўніх часоў лічыцца адным з самых вясёлых святаў. Свята Масленіцы — гэта провады зімы і сустрэча вясны. А прыход вясны і пачатак сонечных дзён сімвалізуюць бліны. У гэты час важным абрадам лічылася ўшаноўванне маладажонаў. Гэта апошні тыдзень перад пастом, і менавіта ў гэты час заключаецца вялікая колькасць шлюбаў. Маладажонаў віншуюць, дораць ім падарункі, паджартоўваюць, качаюць іх у снезе, наладжваюць для іх розныя конкурсы і выпрабаванні, просяць пры людзях пацалавацца і інш.

Супрацоўнікі ААТ «Мінскі камбінат хлебапрадуктаў» (ТМ «Сталічны млын») таксама вырашылі наладзіць «масленічныя» выпрабаванні для маладажонаў. У ЗАГСах Ленінскага і Фрунзенскага раёнаў маладым трэба было не толькі зрабіць самы адказны крок у жыцці, але і паказаць свае кулінарныя навыкі. Адразу пасля таго, як маладажоны ставілі подпісы на шлюбным пасведчанні, нявесце прапаноўвалі спячы некалькі бліноў і накарміць імі жаніха і сваіх гасцей. Удзельнікі дзейства былі ў захапленні і з задавальненнем каштавалі бліны нявесты, а фатографы радаваліся выдатным кадрам. 13—14 лютага падобныя кулінарныя выпрабаванні ад ААТ «Мінскі камбінат хлебапрадуктаў» чакаюць маладажонаў у ЗАГСах Савецкага і Заводскага раёнаў.

Таццяна КАБАНАВА.

ПАЛАЦ, ШАМПАНСКАЕ, РАМАНСЫ

Сёння ў Крычаўскім палацы Пацёмкіна адчыніцца музычны салон

Каліські палац, які Кацярына падарыла Пацёмкіну, быў вядомы вытанчанымі музычнымі вечарынамі. Цяпер у адноўленым помніку архітэктуры аддзел культуры Крычаўскага райвыканкама імкнецца адрадзіць старадаўнюю традыцыю і прыцягнуць увагу крычаўцаў да класічнай музыкі.

Першую вечарыну выратавана прысвяціць рамансам: прагучыць музыка Глінкі, Чайкоўскага, Аляб'ева і цыганскія рамансы. Іх выканаюць лепшыя прафесійныя спевакі Крычава.

Білеты на музычны салон каштуюць 4,5 тысячы рублёў. Але ўпершыню для публікі ўведзены дрэс-код і патрабуюцца вечаровыя строі. Атмасфера будзе адпаведная: гасцей сустрэнуць келіхамі шампанскага. Парадная зала ў палацы, белы раяль, свечкі... Адным словам, адпачынак для душы.

Музычны салон будзе штомесячным. Пасля рамансаў крычаўцам прапануюць вечарыну вальса. Плануецца запрасіць польскіх музыкантаў для выканання твораў Шапэна.

Ілона ІВАНОВА.

З нагоды

«Пісьмова абяцаю захаваць каханне!»

14 лютага ва ўсіх рэгіёнах Беларусі пройдзе рэспубліканская інфармацыйна-асветніцкая акцыя Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа «Беражы каханне!».

Каля дзесяці тысяч маладых людзей будуць праінфармаваныя аб шляхах перадачы ВІЧ-інфекцыі, спосабах абароны ад яе, важнасці праходжання добраахвотнага медыцынскага кансультавання і тэставання на ВІЧ. Акцыі адбудуцца ў грамадскіх месцах, а таксама па месцы вучобы і на прадпрыемствах Брэста, Лунінца, Баранавічаў, Віцебска, Гомеля, Гродна, Мінска, Жодзіна, Стоўбцаў, Слуцка, Барысава і Магілёва. Валанцёры Чырвонага Крыжа прапануюць маладым людзям прайсці таінства абяцання — у пісьмовым выглядзе паабяцаць захаваць каханне, вернасць, здароўе і павагу адно да аднаго на доўгія гады. Пары атрымаюць нават спецыяльнае пасведчанне аб праходжанні незвычайнага таінства, буклеты з карыснай інфармацыяй і чырвоную стужку на запясце — абярэг кахання.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ПРАЕЗД ЗАБАРОНЕНЫ ЎСІМ, АКРАМЯ ВЯСЕЛЬНЫХ КАРТЭЖАЎ

У самым цэнтры Віцебска, па вуліцы Гогаля, якая вядзе да будынкаў Віцебскага аблвыканкама, учора замацавалі па-свойму ўнікальную інфармацыйную таблічку для аўтамабілістаў, якая паведамляе, што праезд забаронены ўсім, акрамя вясельных картэжаў.

Ініцыятарам з'яўлення, бадай першай у краіне, дарогі для вясельных картэжаў стаў **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр КОСІНЕЦ**. Адзін з будынкаў аблвыканкама — помнік архітэктуры пачатку XX стагоддзя. Да рэвалюцыі тут размяшчалася жаночае епархіяльнае вучылішча. Маладыя з задавальненнем фатаграфуюцца і здымаюцца на відэа на фоне прыгожага будынка. Маці з каляскамі, пенсіянеры любяць прагульвацца ў раёне аблвыканкама. І, зразумела, закаханыя. Панарама тут вельмі прыгожая. Адсюль, калі паглядзець уніз, убачыш знакаміты Летні амфітэатр, вельмі добра бачны і гістарычны цэнтр старога горада: ратуша, адноўленая царква.

Што датычыцца службовых аўто тых жа прадстаўнікоў улады, губернатар лічыць, што ніякіх праблем не ўзнікне, калі яны будуць пад'язджаць да аблвыканкама з іншага боку.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Навеяла

ЛЕПШЫЯ Ў СВЕЦЕ...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Па выхадных часта назіраю адну
і тую ж карціну: з кватэры насупраць
выходзяць тата з сынам,
трымаючы ў руках канькі ці лыжы
(летам — валейбольны мяч
ці тэнісныя ракеткі), збягаюць навыперадкі
на першы паверх, а потым крочаць
у бок школьнага стадыёна...
Хлопчыка я ведаю, можна сказаць,
з першых дзён яго нараджэння — рухавы такі,
бойкі, гаваркі. І для сваіх васьмі гадоў
вельмі самастойны — сам разаграе сабе
перад школай ежу, сам збірае ранец,
самастойна ходзіць у прадуктовую краму
і нават ездзіць да бабулі, якая жыве
на другім канцы горада. Часам ён забываецца
з раніцы пакласці ў кішэню ключы ад кватэры
і, вярнуўшыся са школы, спачатку настойліва
і доўга трызвоніць у свае дзверы. А потым,
зразумеўшы, што дома нікога няма — у нашы.
Атрымаўшы запрашэнне зайсці,
акуратненька ставіць на паліцу
ў вітальні свае рэчы, мые рукі,
просіць уключыць яму тэлевізар —
спартыўны канал, і да прыходу бацькоў
сядзіць ціха, быццам бы яго і няма.

«Ф Ёдар, вячэраць будзеш?» — пытаюся. «Не! — катэгарычна адмаўляецца ён. — А то тата пакрыўдзіцца. Мы з мамай заўсёды яго чакаем і вячэраем разам».

Тата для яго, бясспрэчна, аўтарытэт. Аднойчы Фёдар па вялікім сакрэце расказаў мне, як, гуляючы з бацькам восенню па бярозе Свіслачы, узлез на парапет, паслізнуўся і зваліўся ў ваду. Тата, скінуўшы куртку, адразу ж скокнуў за ім, выцягнуў, закруціў у гэтую самую куртку, узяў на рукі і пабег дадому — балазе, дом знаходзіўся ў двух кроках ад парку.

«Уляцела вам, напэўна, ад мамы?» — «Зусім не. Мы ж нічога ёй не сказалі, каб не расстройваць. Гэта наш сакрэт. Усё роўна мой тата самы лепшы».

Асабіста мне вельмі падабаецца гэта новая «фармацыя» мужчын з актыўнай бацькоўскай пазіцыяй. Прычым актыўнасць прачынаецца ў іх яшчэ на стадыі ўнутрывантробнага развіцця дзіцяці. Яны суправаджаюць будучых мам у жаночую кансультацыю, не баяцца задаваць пытанні ўрачам, штудзіруюць спецыяльную літаратуру, наведваюць заняткі па партнёрскіх родах... І пазней, пасля з'яўлення дзіцяці на свет, не адгароджваюцца ад гары пялёнак і іншых праблем новым дэтэктывам Дэна Браўна, а актыўна ўмешваюцца ў «працэс»... Мама для малога — гэта, безумоўна, вельмі важна, але выхаванне, пабудаванае выключна на стасунках з ёю, мае шмат падводных «цячэняў». Гэта як паліваць хатнюю расліну толькі з аднаго боку. Ці пастаянна трымаць яе на сонцы.

Наяўнасць жа «мужчынскага складніка» нівелюе ўсе залішнія «сюсі-пусі», уносіць у цяплічную атмасферу элементы добрага драйву. Усе дзеці ведаюць, што таты не баяцца пераходзіць вуліцу, калі восьвось павінна загарэцца чырвонае святло, што яны не робяць трагедыі з мокрых боцікаў і рукавічак, што дазваляюць запіваць чыпсы кока-колай і ніколі не гавораць: «Ну вось, я ж цябе папярэджваў!». Увогуле, таты схільныя даваць большую прастору асобе дзіцяці, часцей выпускаць яго з поля зроку. А мамы, калі іх карапуз сутыкаецца з чымсьці або кімсьці непрывычным (незнаёмы чалавек, новая цацка, суседскі сабака), адразу напружваюцца, інстынктыўна стараюцца апынуцца бліжэй, як бы паказваючы, што дзіця знаходзіцца пад аховай.

Калі я бачу дзе-небудзь у парку чародку маладых мужчын з каляскамі, — так бы мовіць, «клуб па інтарэсах», члены якога жыва, з натуральнай зацікаўленасцю абмяркоўваюць асаблівасці характару і паводзінаў сваіх малых — далібог, хочацца падысці і ўсіх расцалаваць. Таму што для большасці мужчын выхад з каляскай на вуліцу — гэта нешта накшталт подзвігу. У іх заўсёды знойдзецца з дзясятак неадкладных спраў, у параўнанні з якімі «выгульванне» нашчадка не ўяўляе асаблівай цікавасці. Не часта сустрэнеш асобаў мужчынскага полу, здольных падысці да гэтага працэсу творча — замест таго, каб тупа цягнуць за сабой каляску, усім сваім выглядам дэманструючы пакорлівасць лёсу, узяць дыспеч маламу песеньку ці расказаць казку. Або, на крайні выпадак, гісторыю з уласнага жыцця, «перакладзеную» на дзіцячую мову. Дарэчы, казкі, якія расказваюць мужчыны дзецям — гэта нешта. Ніякіх вам прымітыўных Калабкоў ці Чырвоных Каптуркоў. Казкі маюць рэальную аснову і рэальных жа персанажаў («у адным цёмным-цёмным пад'ездзе старога-старога дома жыў-быў страшны барадаты дзядзька Міша»). Другі варыянт — расказанае нагадвае карціну ваенных дзеянняў, дзе станоўчы (у татавым разуменні) герой знішчае антыгероя (інакш кажучы, усіх астатніх). Карапузы мала што ў гэтым разумеюць, затое іх зачароўвае сам працэс: як тата ўваходзіць у ролю, як змяняецца выраз яго твару... А яшчэ ім падабаюцца незнаёмыя словы накшталт «бабах!», «хрась!», «трах!» і г.д.

Знаёмая мамачка пастаянна скардзілася на капрызы сваёй трохгадовай дачкі: маўляў, ні адна нянька не можа даць рады. І аднойчы з малой застаўся тата, у якога па шчаслівым збегу абставінаў адмянілася камандзіроўка... Якім жа было маміна здзіўленне, калі, вярнуўшыся вечарам з працы, яна пачула з парога... не, не плач, а гучны рогат і тупат. Яшчэ больш уразіла ўбачанае: бацька бегаў па кватэры на карачках, на яго спіне падскоквала дачка і, «прышпорваючы» тату пяткамі, віскатала ад задавальнення. Дзіцяці відавочна падабаліся «вострыя адчуванні», якія ніякая нянька, зразумела, не магла б забяспечыць.

Яшчэ адзін бацька, застаючыся з дзіцем (таксама дачкой) самасам, у якасці заспакаяльнага сродку выкарыстоўваў... стары добры рок. Практычна седзячы на гаршчку, дзяўчынка спасцігла і «Багемскую рапсодыю» гурта «Куін», і «Вецер пераменаў» гурта «Скорпіянс», і «Яшчэ адну цагліну ў сцяне» (адпаведна, «Пінк флойд»)... Мама даведалася аб гэтым праз некалькі гадоў — калі зайшла з дачкою ў краму, дзе прадаваліся дыскі. Яна прапанавала малой выбраць мульцікі для хатняга прагляду, а тая ўпэўнена пацягнула яе да суседняй паліцы і тыкнула пальчыкам у дыск гурта «Аэрасміт»... Дарэчы, пазней дзяўчынка пайшла ў школу з музычным ухілам. Яе калекцыі дыскаў — ад класічных арый да сучасных рок-кампазіцый — пазайздросціў бы і заўзяты меламан.

Ёсць таты, якія збіраюць разам з дзецьмі забаўляя каляндарыкі, паштоўкі, наклейкі, сувеніры, значкі, калекцыянуюць цікавыя гісторыі і фотаздымкі, малююць карыкатуры і сяброўскія шаржы, складаюць вершыкі, робяць хатнія сценгазеты і нават вядуць сямейны «летапіс»...

А ёсць іншыя. Да гэтага часу ўспамінаю, як аднойчы позна вечарам у нашу кватэру нехта пазваніў. Адкрыла — на парозе, хістаючыся, стаяў мужчына з маленькім зарумзаным хлопчыкам на руках. «Ваш?» — збянтэжыў ён пытаннем. Атрымаўшы адмоўны адказ, выляяўся. Сказаў, што больш за гадзіну шукае патрэбны дом і не можа знайсці... Аказалася, што раніцай ён зазірнуў да сябра, які жыве ў гэтым раёне. Пасядзелі — і пайшлі «прагуляцца». Сябар узяў з сабой маленькага сына. Па дарозе забеглі ў кавярню «купіць дзіцяці штонебудзь смачнае». Замест гэтага так падчахліліся, што сябар не змог устаць з-за стала — вывелі яго міліцыянеры і, натуральна, забралі з сабой. А майго «начнога госця» адпусцілі, каб адвёз чужое дзіця дадому. Той і павёз — прычым нумар кватэры, дзе жыў сябар, ён памятаў добра, а вось месцазнаходжанне самога дома — не вельмі. Прыйшлося наўздагад абыходзіць з малым некалькі шматпавярховікаў...

Дзякуй богу, мужчына ўспомніў нумар хатняга тэлефона сябра (мабільнікі тады яшчэ не былі распаўсюджаныя). Мы пазванілі, і праз хвілін дзесяць прыбеглі мама і бабуля дзіцяці (уяўляю, што яны перажылі за гэты вечар).

Так што таты бываюць розныя. Многія жанчыны нават лічаць, што галоўная якасць для бацькі сямейства — каб ён увогуле... меўся ў наяўнасці. Каб існавала ў межах кватэры пэўная мужчынская істота, якая ходзіць на працу, прыносіць грошы і як мінімум раз на год вывозіць сям'ю на адпачынак. А ўсё астатняе — не яго справа.

Самае крыўднае, што мужчыны на гэта гаджаюцца. Стаяць убаку, назіраюць здалёк... Чакаюць, пакуль нашчадак падрасце і з ім можна будзе размаўляць «на роўных». А нашчадак тым часам называе бацьку не інакш як «наш кашалёк» і ўспамінае пра яго толькі ў выпадках невырашальных фінансавых праблемаў. Зразумела, уласных...

Наталля УЛАДЗІМІРАВА.

ЧАМУ СТУДЭНТЫ ПАМІРАЮЦЬ НА ЗАНЯТКАХ ПА ФІЗКУЛЬТУРЫ?

ЛЕТАСЬ двое беларускіх студэнтаў раптоўна загінулі на ўніверсітэцкіх спартовых пляцоўках. Абодва хлопцы выглядалі абсалютна здаровымі. Такіх, на першы погляд, хоць у алімпійцы рыхтуй, хоць у спецназаўцы аддавай. Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Яўген ВАЛОШЫН высвятляў, чаму загінулыя студэнты мелі асноўную групу здароўя і не абмяжоўваліся ў фізічных нагрузках.

«Падчас прабежкі Міша паваліўся, перастаў дыхаць...»

Гэта здарэнне шакіравала ўсіх без выключэння студэнтаў і выкладчыкаў Мінскага інстытута кіравання. У верасні 2009 года студэнт трэцяга курса факультэта правазнаўства Міхаіл памёр на занятках па фізвыхаванні. Здарылася гэта, калі хлопец бег кароткі трэніровачны крос.

— Міша бег другі круг і раптам паваліўся, здарылася гэта ў раёне баскетбольнай пляцоўкі, прама пад кольцам. Яго абступілі студэнты, фізрукі, нехта пабег па медсястру, — узгадвае Павел, відавочца трагедыі. — Спрабавалі рабіць штучнае дыханне, медсястра прынесла нейкія пігулькі... «Хуткая» прыехала хвілін праз 15, але рэанімаваць Мішу не змаглі, не было нават дэфібрылятара. Тут жа прыехала рэанімацыйная брыгада, але дапамагчы не атрымалася.

Высветлілася, што Міша займаўся ў асноўнай групе па фізкультуры. Яго раптоўная смерць і сёння не ўкладваецца ў галовах сяброў.

— Ён хадзіў у трэнажорную залу, ніколі не прапускаў заняткі па фізкультуры. Быў актыўны і жыццярадасны чалавек, — кажа Саша, якая ведала памерлага студэнта. — Пазней казалі, што ў той дзень Міша кепска сябе адчуваў, але ён быў не з тых, хто любіць пажаліцца на дрэнны стан здароўя, асабліва выкладчыкам. Многія наракалі на першую «хуткую», у якой не аказалася рэанімацыйнага абсталявання. Але нічога вярнуць ужо немагчыма.

Ці можа са здаровым чалавекам здарыцца раптоўная смерць? У пракуратуры Заводскага раёна Мінска, дзе праводзілі праверку па факце здарэння, высветлілі, што ў студэнта быў цэлы шэраг прыроджаных парокаў.

— Гэта парокі раздзіцця сэрца і буйных сасудаў, хранічная вірусная інфекцыя галаўнога мозга і шмат чаго іншага, — перакананы **Павел ЧУХОЛЬСКІ, следчы пракуратуры Заводскага раёна Мінска.** — У сукупнасці гэта ўсё і прывяло да смерці.

— Але чаму медыкі своечасова не выставілі хлопцу дыягназ, чаму ён займаўся ў асноўнай групе па фізкультуры?

— Ва ўсіх медыцынскіх дакументах пазначалася, што скаргаў на здароўе няма. Часам урачу складана выставіць правільны дыягназ, асабліва калі ад яго нешта хаваюць.

Пасля здарэння ў студэнцкай паліклініцы № 33 правялі так званую «ўрачэбную канферэнцыю па разборы выпадку смерці». Ні супрацоўнікі «хуткай», ні медыкі з паліклінікі, якія даследавалі стан здароўя Мішы, не былі пакараныя.

«Канферэнцыя» прыйшла да дзвюх дзяжурных высноў: першая — даваць рэкамендацыі па абмежаванні фізічных нагрузак, калі вызначаецца група па фізвыхаванні, другая — правесці дадатковыя медагляды, каб пераправерыць групы здароўя студэнтаў.

На жаль, ад фармальнага падыходу ў выстаўленні дыягназаў адышлі не ўсе нашы медыкі. І гэта праблема.

— Напрыклад, калі прыходзіш у прыёмны пакой бальніцы і кажаш, што цябе ванітуе, галава ідзе кругам і ты да гэтага стукнуўся галавой, то адразу ж выставяць дыягназ «чэрапна-мазгавая траўма», — разважае следчы Павел Чухольскі. — Хоць і для выстаўлення гэтага дыягназу неабходны сур'ёзныя даследаванні. А ёсць дыягназы, якія можна канстатаваць толькі пасля смерці. Гэта якраз выпадак з памерлым студэнтам.

Цяжкія хваробы студэнта БНТУ хавалі бацькі?

Смяротны выпадак на занятках па фізкультуры здарыўся некалькі гадоў таму і ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце. Падчас бегу студэнт як падкошаны паваліўся на зямлю — раптоўна спынілася сэрца. Дапамагчы хлопцу было немагчыма.

Праверка высветліла, што і гэты хлопец займаўся ў асноўнай групе па фізкультуры.

— І сам студэнт, і яго бацькі хавалі праблемы з сэрцам, і вось да чаго гэта прывяло, — узгадвае **старшыня кафедры фізічнага выхавання БНТУ Іван БЕЛЬСКІ.**

Падчас бегу студэнт як падкошаны паваліўся на зямлю — раптоўна спынілася сэрца. Дапамагчы хлопцу было немагчыма.

Многія вядуць сядзячы ці ляжачы лад жыцця, кураць. Усё гэта прыводзіць да сасудзістых захворванняў. У гэтым выпадку любая нагрузка можа прывесці да сумных наступстваў. Адпаведна, калі ты шмат рухаешся, то больш пражывеш.

Зноў жа выявіць парокі сардэчна-сасудзістай сістэмы не змаглі ні афіцыйныя школьныя медагляды, ні камісіі ў ваенкамаце.

Першакурсніка Андрэя забіла футбольнымі варотамі

Гэта трагедыя здарылася каля інтэрната № 3 Белдзяржуніверсітэта мінулай вясной. Былі майскія святы, але першакурснік механіка-матэматычнага факультэта БДУ Андрэй не паехаў да бацькоў у Капыльскі раён. Хлопец рыхтаваўся да залікаў і аднойчы вырашыў пагуляць у футбол разам з іншымі інтэрнацыянальнымі хлопцамі.

— Падчас матча Андрэй, відаць, вырашыў дадаткова размяцца, павісець на папярэчыне футбольных варотаў, — узнаўляе падзеі таго трагічнага дня Сяргей, відавочца здарэння. — Ён разбегся і скокнуў на папярэчыну, як гэта часам робяць футбольныя галкіперы. Андрэй падцягнуўся, хацеў, напэўна, зрабіць пад'ём з пераваротам, і вароты нечакана пахіснуліся. Андрэя прыціснула папярэчынай, за якую ён трымаўся. Адбылося гэта вельмі хутка, ён папросту не паспеў зрэагаваць. З вушэй, рота палілася кроў. Потым сказалі, што была зламана шыя. На гэтым жа футбольным полі Андрэй і памёр. За тое, што вароты не замацавалі, ніхто не адказаў.

Трагічны выпадак трактавалі як няшчаснае здарэнне. Старшыні спартовай кафедры БДУ вынеслі вымову. Хоць здарэнне адбылося не на плановых занятках па фізкультуры.

КАМПЕТЭНТНА

Андрэй АРАМНАЎ, алімпійскі чэмпіён: «З непрывычкі любая нагрузка можа прывесці да ліха»

Знакаміты беларускі штангіст лічыць, што людзі ўсё менш і менш займаюцца фізічнай культурай, з-за гэтага больш хварэюць і менш жывуць.

— Многія вядуць сядзячы ці ляжачы лад жыцця, кураць. Усё гэта прыводзіць да сасудзістых захворванняў. У гэтым выпадку любая нагрузка можа прывесці да сумных наступстваў. Адпаведна, калі ты шмат рухаешся, то больш пражывеш.

Людзям, якія са спортам не сябруюць, але хочуць паправіць сваё здароўе, Андрэй Арамнаў раіць наступнае:

— Раніцай варта рабіць зарадку: пацяснуцца, зрабіць нахілы, каб хутчэй прачнуліся сасуды. Вельмі карысна лёгкая прабежка. Але бегаць трэба ў задавальненне, каб аніякай лішняй нагрузкі не было. Наступны этап, калі чалавек рэгулярна наведвае спартовую залу. Вы самі адчуеце, як пасля трэніроўкі паляпшаецца настрой, а цела прыводзіцца ў тонус.

КІНО Ў КРЭДЫТ. У КРЭДЫТ ДАВЕРУ

ПАСЛЯ таго, як чарговы фільм чарговага амерыканскага рэжысёра збярэ ў пракаце непрыстойную суму зноў жа амерыканскіх грошай, да галавы неадвязна лезе адна і тая ж думка: «А дзе ж нашае, беларускае?.. Ці то не ўмеем, ці то не можам?» І ўмеем, і можам не горш за Галівуд, упэўнены Уладзімір ЗАМЯТАЛІН, генеральны дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм», які агучыў шмат актуальных тэмаў:

НОНСЭНСЫ МІНУЛЫЯ І СУЧАСНЫЯ

— Існуе розніца паміж перыядамі да 1999 года і цяперашнім часам, якая заключаецца ў тым, што раней Дзяржкіно СССР рабіла заказ, перадавала гэты заказ «Беларусьфільму», фінансавала і забяспечвала пракат фільма. Пракат у замкнутай прасторы на 6-й частцы Зямлі, дзе нельга было паказваць ніякае іншае кіно, рабіў сваю справу — амаль усё кіно СССР акуплялася. Дзяржкіно было адной з самых багатых арганізацый у СССР. Уся прэса працавала на гэтую структуру. А пасля 90-х усяго гэтага не стала. Знік заказчык, менеджар і прадзюсар, пракат стаў існаваць сам па сабе. І засталася толькі кінастудыя, якая сёння адна выконвае ўсе вышэйазначаныя функцыі. Сама вырашае, што здымаць, сама здымае і прадае прадукт, а гэта — нонсэнс. У такім нонсэнсе мы і жывём. І з-за таго, што СМІ не могуць зразумець гэтую простую схему, у наш адрас гучыць пытанне — чаму мы здымаем дрэннае кіно?

НОВЫЯ РУБЕЖЫ

— Калі я прыйшоў на студыю, тэхналогія поўнага кінапрацэсу была забяспечана толькі на 40 %, сёння — гэта 100 %. Кінастудыя сёння можа здымаць па тэхналогіях Галівуда, маніпулюючы і лічбавай тэхналогіяй, і стандартнай плёначнай. На кінастудыі зроблена адна з лепшых лабараторый камп'ютарнай графікі ў СНД. Кінастудыя з 2007 года па сёння апрабавала магчымасці ўсіх рэжысёраў: тых, хто вучыўся ў Турава, у Пташука, рэжысёраў, якія не здымалі доўгі час і якія вярнуліся з-за ўсходняй мяжы. Такім чынам, у нас дакладнае ўяўленне, хто на што здольны.

З кастрычніка мінулага года кінастудыя не звяртаецца па дапамогу ні ў якую замежную кінавытворчую арганізацыю, робіць усё сама. Напрыклад, фільм «Дняпроўскі рубеж» цалкам зняты на «Беларусьфільме», у ім была задзейнічана найбольшая колькасць масоўкі за ўсю гісторыю кінастудыі. Фільм быў зняты ў кліпавай манеры, як робяць у Галівудзе. Калі б мы яшчэ «памыліліся» і прадублявалі яго на англійскай мове — з'елі б з вантробамі і ўвогуле пішчалі б па ўсіх кінатэатрах: «Якое кіно»!

СВЕТЛЫ ВОБРАЗ КІНАВЫТВОРЦЫ

— У нас на кінастудыі стала значна менш п'янак. На жаль, раней сітуацыя была вельмі непрыглядная. Так часта бывае ў творчым асяроддзі. Цяпер усё змянілася, і не таму, што я кажу не піць, альбо піць толькі ваду. Проста цяпер усе загружаныя працай. Калі я ўпершыню патрапіў на кінастудыю ў 2007 годзе, сярэдняя зарплата была 300 тысяч беларускіх рублёў. Цяпер — каля 1,5 мільёна, у залежнасці ад прафесіі і спецыяльнасці.

Але мы разумеем, што рэсурс кадраў абмежаваны, разумеем таксама і тое, што ў нашай Акадэміі мастацтваў студэнты на 3-м, 4-м курсах ні разу не здымалі ніякай кантрольнай працы, звязанай з кінавытворчасцю. Мы выдатна ведаем, што на аператарскім аддзяленні няма ніводнай аператарскай камеры...

РАЗУМЕННЕ І ПАРАЗУМЕННЕ

— Безумоўна, нас ёсць за што крытыкаваць. Нас крытыкуюць за тое, што мы здымаем шмат фільмаў, а не акумулюем сілы на адной добрай стужцы. Але за 3 гады мы знялі ў 2,5 раза больш фільмаў, чым кінастудыя зняла за часы існавання суверэннай дзяржавы. Нашы сцэнары і нават задумы стужак набываюць расійскія каналы па вельмі высокіх коштах.

Такім чынам, мы просім даць нам крэдыт даверу на пэўны час. Просім, каб вы нас пачулі і падказалі пракатчыкам, што нацыянальнае кіно трэба паказваць пасля 19.00, а не з 12 да 16 гадзін дня. Цяпер мы разумеем, што здымаць, у якой колькасці і якіх жанрах.

ЧАС ЗБІРАЦЬ КАЛАСЫ

Наталля СЦЯЖКО, галоўны рэдактар кінастудыі «Беларусфільм», сказала, што ў кінастудыі вельмі амбітныя планы: здымаць кіно розных жанраў. На серыялах зарабляць грошы (кажуць, што нашы серыялы добра купляюцца!). Аднак жа будзе і нацыянальнае кіно: па замове Міністэрства культуры будзе зроблены 4-серыйны мастацкі фільм па творчасці Янкі Купалы, а таксама фільм да 80-годдзя Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім».

Летась фільмы з кінастудыі «Беларусфільм» удзельнічалі ў 25 міжнародных фестывалях. Гэта магчымасць прасунуць фільмы, наладзіць кантакт з дыстрыб'ютарамі і прадзюсарамі. За 2009 год рэжысёры прывезлі больш за 30 узнагарод з розных міжнародных фестываляў.

На пытанне, чаму ў Беларусі адна дзяржаўная арганізацыя — кінастудыя, не можа дамовіцца аб пракаце фільмаў з іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі — тэлеканаламі, Уладзімір Замяталін толькі і адказаў: «Гэта насамрэч вельмі цікавае пытанне...»

Вольга БАРАНЧУК.

АДМЫВАЎ ДАХОДЫ

Упраўленне фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці накіравала ў суд справу ў дачыненні да дырэктара камерцыйнай структуры, які аказваў «паслугі» пабочным суб'ектам гаспадарання па абнаяўліванні грашовых сродкаў.

Гэта рабілася шляхам пералічэння грошай на разліковыя рахункі падкантрольных яму прадпрыемстваў. Выкарыстоўваючы гэтыя рахункі і беставарныя накладныя, ён правёў незаконных фінансавых аперацый больш чым на два мільярды рублёў з ухіленнем ад выплаты падаткаў у асабліва буйным памеры.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ЗЛОСНЫМ НЕПЛАЦЕЛЬШЧЫКАМ ДАЛІ ПРАЦУ

Магілёўскі цэнтр гарадскіх інфармацыйных сістэм прапанаваў працу на незвычайных умовах. Прэтэндэнт на месца павінен мець вялікую запазычанасць за камунальныя паслугі і жаданне вярнуць іх.

— Мы добра ведаем усіх нашых хранічных неплацельшчыкаў, — сказаў **дырэктар цэнтра Аляксандр СЕЛЯЗНЁЎ**. — Адны з іх не плацяць, таму што беспрабудна п'юць гарэлку, а іншыя — таму што сапраўды трапілі ў складаную жыццёвую сітуацыю. Вось апошнім мы хочам дапамагчы, таму і запрасілі іх да сябе на сур'ёзную гутарку.

Даўжнікі будуць працаваць на будоўлі. Будаўнічай арганізацыі, якая рэканструюе разлікова-касавы цэнтр у Магілёве, спатрэбіліся падсобныя рабочыя. У выніку гутаркі працу на здзельнай аснове атрымалі 7 чалавек.

Справа працаўладкавання злосных неплацельшчыкаў — новая і, калі шчыра, даволі рызыкоўная. Цяжка прадказаць, ці буду

БРАЎ І КАНВЕРТЫ, І «КУРВУАЗЬЕ»

АПЕРАТЫЎНАЯ група Камітэта дзяржаўнай бяспекі ў маі мінулага года злавіла на месцы злачынства пасля атрымання хабару начальніка Мінскага гарадскога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Сямёна Санько. Суд Партызанскага раёна г. Мінска прыгаварыў палкоўніка ўнутранай службы да 9 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці і пазбаўленнем звання.

У прэс-службе Камітэта дзяржбяспекі паведамляюць, што інфармацыя аб спробах вымагання буйных грашовых сумаў начальнікам Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС пачала паступаць да аператыўнікаў ведамства дзесьці з 2005 года. Дарэчы, на той момант яшчэ дзейнічала заканадаўчая норма адлічэння ў МНС 5 працэнтаў ад каштарыснага кошту любога пабудаванага аб'екта. Мяркуецца, што гэта норма магла спрыяць атрыманню рэгулярнага дадатковага да заробку «прыбытку» спадаром Санько. Праўда, дакладных звестак у той час аператыўнікам атрымаць не ўдалося. Паўторна і ўсур'ёз начальнік упраўлення трапіў у поле зроку КДБ на пачатку мінулага года.

— На жаль, у нас не было заяўніка, а значыць, заставалася пайсці на аператыўны эксперымент, — расказвае распрацоўшчык аператыўнага мерапрыемства, супрацоўнік Камітэта дзяржаўнай бяспекі. — За час назірання за Санько ўдалося зафіксаваць некаторыя факты атрымання ім грашовых узнагароджанняў, матэрыяльных каштоўнасцяў. Быў выяўлены механізм атрымання хабару, схілення да перадачы тых жа грашовых сродкаў. Як толькі мы гэта выявілі, стварылі аналагічную мадэль...

Аператыўнікі спраектавалі сітуацыю: як быццам адной з мінскіх фірмаў неабходна выдаліць пэўныя недахопы па прадпісанні інспектара МНС на працягу канкрэтнага тэрміну. Сітуацыю вырашана было «ўзмацніць» тым, што ў фірмы заканчваецца тэрмін ліцэнзіі, а працягнуць яе нельга, пакуль не будзе закрытае прадпісанне. Далей псеўдапрадпрымальнік, які пагадзіўся выступіць у якасці прадстаўніка гэтай камерцыйнай структуры, быў уведзены ў круг кантактаў Санько, што стала магчымым не з першай спробы. Апошні меў справу толькі са знаёмымі або з тымі, каго тыя рэкамендавалі. У рэшце рэшт Сямён Санько пагадзіўся заняцца «гэтым пытаннем».

Кошт падобных пытанняў пачынаўся для начальніка ўпраўлення ад сумы ў 200 долараў. Што да апошняй «здзелкі», то яе спрыяльнае вырашэнне некалькі разоў пераносілася, а адбылося ў рэстаране «Астара», дзе Санько атрымаў 2800 долараў. Дарэчы, на ўзроўні аператыўнай інфармацыі фігуруюць і большыя памеры хабару. Падчас расследавання высветлілася: начальнік Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС прымаў не толькі грашовыя паднашэнні ў канвертах. Нягледзячы на тое, што сам ён аддаваў перавагу сухім вінам, аснову хатняй калекцыі склалі моцнаградусныя напоі, сярод якіх аказаліся каньякі «Хенесі», «Курвуазье» і іншыя элітныя напоі коштам да некалькіх соцень долараў за бутэльку. Падчас 8-гадзіннага апісання маёмасці 6 з іх аператыўныя работнікі затрацілі на апісанне толькі бара, які фактычна быў памерам... з дзве шафы-купэ. Калі арыентавацца на кошт напояў у сетцы дзьюці фры, бар цягнуў мінімум на 15 тысяч долараў.

Нягледзячы на шырокую практыку хабарніцтва па месцы працы, 48-гадовы парушальнік закона пражываў у 2-пакаёвай кватэры, іншай нерухомасці не меў, ездзіў на не новым «Мерседэсе», на банкаўскіх рахунках трымаў не больш за 1,5 тысячы долараў і каля 2 мільёнаў беларускіх рублёў. У кватэры ж падчас апісання былі знойдзены 12 тысяч долараў, мерныя залатыя зліткі, залатыя пластыкавыя карткі элітных установаў сталіцы, пяць тэлевізараў, некалькі швейцарскіх гадзіннікаў і DVD-прайгравальнікаў, прычым сам гаспадар карыстаўся яшчэ касетным відэамагнітафонам.

Тым не менш, за кароткі час назірання за Санько аператыўнікі КДБ зафіксавалі шэраг фактаў паднашэнняў — гэта былі і грошы, і спартыўны інвентар, і алкагольныя напоі, і іншае. Толькі ў дзень затрымання начальнік упраўлення меў пры сабе каля 4 тысяч долараў. Па справе ж праходзіла ўсяго два факты хабарніцтва — з-за адсутнасці, як было заўважана вышэй, заяўнікаў. Наша насельніцтва па-ранейшаму не надта ахвотна ідзе на супрацоўніцтва з органамі. Хоць, паводле заканадаўства, асоба, якая заявіла аб дачы хабару, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці.

Да моманту вынясення прысуду Сямён Санько адмаўляў сваё дачыненне да злачынстваў. Нягледзячы нават на прад'яўленыя суду зробленыя з некалькіх пунктаў у працоўным кабінеце і згаданым рэстаране «Астара» відэаздымкі з гукавым суправаджэннем. Санько казаў, што гэта мантаж і мяняў паказанні. То гаварыў, што рука — не ягоная, то — ягоная, але гэтай рукой ён адпіхваў хабар і адмаўляўся ад паднашэння, то сцвярджаў, нібыта знаходзіўся ў прыгнечаным стане, што, па сутнасці, не адпавядала рэальнасці...

Аўдыё- і відэаматэрыялы прайшлі экспертызу і прызнаныя сапраўднымі. Наогул усе запісы правадзіліся, як належыць, з санкцыі пракурора.

Рашэнне раённага суда Сямён Санько збіраецца абскарджваць.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Кантрабанда: гарэлка, спірт і дызельнае паліва

10 лютага на беларуска-расійскім памежжы, каля вёскі Каськова Мсціслаўскага раёна супрацоўнікі РАУС спынілі грузавы аўтамабіль "Фальксваген", які ехаў з Расіі. У аўтамабілі знайшлі 945 літраў спірту, 258 бутэлек гарэлкі вядомай расійскай маркі і 135 літраў дызельнага паліва. Аўтамабіль належыць жыхарцы Бабруйска, а кіраваў ім 44-гадовы бабруйчанін, які нідзе не працуе. Акцызных марак на алкаголі не было, як і суправаджальных дакументаў. Груз затрыманы, міліцыя робіць праверку.

Алена КАЗЛОВА.

Минский городской центр недвижимости

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 25 ФЕВРАЛЯ 2010 ГОДА 96-ГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже права заключения договоров аренды (сроком на 5 лет) зданий, сооружений и помещений коммунальной собственности г. Минска

№ лота	Адрес, тип помещения, целевое назначение	Арендуемая площадь, кв. м	Начальная цена, тыс. руб.
КУП «ЖРЭО Заводского района г. Минска», тел. 285 56 02			
1	Ул. Варвашени, 15, четыре комнаты цокольного этажа, имеется естественное освещение, отопление, санузел. Под административные цели (офис), склад.	106,3	1 900
2	Ул. Голодеда, 11, помещение на первом этаже, имеется отдельный вход, отопление, естественное освещение, санузел. Под парикмахерскую.	68,4	5 000
3	Ул. Красина, 25, блок А, помещение на втором этаже, имеется естественное освещение, отопление, общий вход с другими арендаторами. Под административные цели (офис).	16,1	300
4	Ул. Красина, 27, блок Б, помещение на первом этаже, общий вход с другими арендаторами, санузел совместного пользования. Под торговый объект непродовольственной группы товаров.	70,75	3 000
5	Пр. Партизанский, 110, помещение на первом этаже, имеется естественное освещение, отопление, санузел. Под административные цели (офис), склад.	64,9	1 200
6	Ул. Уборевича, 6, помещения подвала и первого этажа, имеется естественное освещение, отопление, санузел совместного пользования. Под административные цели (офис), склад.	125,5	2 200
КУП «ЖРЭО Ленинского района г. Минска», тел. 223 35 03			
7	Ул. Комсомольская, 27, помещение на первом этаже, имеется естественное освещение, отопление, водоснабжение, вход через подъезд жилого дома. Под образовательные, воспитательные и научные цели.	48,1	900
8	Ул. Я. Лучины, 60, помещение на втором этаже, имеется естественное освещение, отопление, вход совместно с другими арендаторами. Под административные цели (офис).	32,9	600
КУП «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска», тел. 224 53 76			
9	Ул. Асаналиева, 28, помещение цокольного этажа жилого дома, санузел совместного пользования. Под административные цели (офис).	12,5	300
10	Ул. Асаналиева, 28, помещение цокольного этажа жилого дома, санузел совместного пользования. Под административные цели (офис).	12,0	300
КУП «ЖРЭО Партизанского района г. Минска», тел. 294 01 11			
11	Пер. Броневой, 4, помещение на первом этаже жилого дома, требуется ремонт и обустройство отдельного входа. Под административные цели (офис).	15,0	300
12	Ул. Долгобродская, 30, помещение на первом этаже, имеется отопление, водоснабжение, канализация. Под административные цели (офис).	44,1	800
13	Ул. Щербакова, 32, помещение на втором этаже, имеется отопление, водоснабжение, канализация. Под административные цели (офис).	37,6	700
14	Ул. Фрунзе, 3, помещение цокольного этажа, имеется отопление, водоснабжение, канализация. Под торговый объект, объект по оказанию бытовых услуг.	76,5	5 000
15	Ул. Первомайская, 18, помещение на третьем этаже, имеется отопление, водоснабжение, канализация. Под административные цели (офис).	44,1	800
КУП «ЖРЭО Первомайского района г. Минска», тел. 285 72 92			
16	Ул. Руссиянова, 24, подсобное помещение на первом этаже, имеется отопление, санузел, вход совместно с жильцами дома. Под административные цели (офис), склад.	16,0	300
17	Пр. Независимости, 131, корп. 1, площадь в холле на втором этаже. Для размещения автомата по продаже горячих напитков.	2,0	420
КУП «ЖРЭО Советского района г. Минска», тел. 292 74 31			
18	Ул. Некрасова, 22, помещение на первом этаже, имеется отдельный вход, отопление, санузел, требуется ремонт. Под административные цели (офис).	36,6	700
19	Ул. Восточная, 190, помещение на втором этаже, имеется отопление, санузел, общий вход с другими арендаторами. Под административные цели (офис).	8,8	200
КУП «ЖРЭО Фрунзенского района № 2 г. Минска», тел. 253 03 26			
20	Ул. Кальварийская, 52, помещение на первом этаже жилого дома, требуется ремонт и обязательное обустройство отдельного входа. Под торговый объект непродовольственной группы товаров.	133,3	3 000
КУП «Минская спадчина», тел. 226 53 04, 226 47 34			
21	Пл. Свободы, 4, блок из трех комнат и вспомогательных помещений на втором этаже, имеется естественное освещение, отопление, санузел. Под административные цели (офис).	74,65	1 500
22	Ул. Герцена, 10, две комнаты и вспомогательные помещения в подвале жилого дома, имеется отопление, санузел, душевая кабина, гардероб. Под тренажерный зал.	126,2	2 300
23	Ул. Герцена, 10, блок из восьми комнат на втором этаже, имеется отопление, санузел, общий вход с другими арендаторами. Под административные цели (офис).	179,3	3 200
24	Ул. Герцена, 10, помещение на первом этаже, имеется отопление, санузел, общий вход с другими арендаторами. Под туристические, риэлтерские и другие услуги, кроме парикмахерских и медицинских услуг.	31,0	600
25	Ул. Герцена, 10, помещение на первом этаже, имеется отопление, санузел, общий вход с другими арендаторами. Под туристические, риэлтерские и другие услуги, кроме парикмахерских и медицинских услуг.	28,7	600
26	Ул. Герцена, 10, помещение на первом этаже, имеется отопление, санузел, общий вход с другими арендаторами. Под туристические, риэлтерские и другие услуги, кроме парикмахерских и медицинских услуг.	20,5	400
27	Ул. Герцена, 10, помещение на первом этаже, имеется отопление, санузел, общий вход с другими арендаторами. Под туристические, риэлтерские и другие услуги, кроме парикмахерских и медицинских услуг.	27,1	500
28	Пл. Свободы, 2, помещение на втором этаже. Под административные цели (офис).	13,1	300
29	Ул. Старовиленская, 10, отдельно стоящее здание ресторана в стадии проведения работ реконструкции; договор аренды будет заключен с момента ввода объекта в эксплуатацию при условии финансирования за счет средств арендатора: части проектных работ по приспособлению помещений по целевому назначению (220 000 000 руб.), интерьерной отделки помещений, технологического оборудования. Под объект общественного питания.	2037, 0	35 700
КУП УДМСиБ Мингорисполкома, тел. 203 13 73			
30	Ул. Смоленская, 49. Под административные цели (офис).	16,9	300
31	Ул. Короля, 4. Под административные цели (офис).	31,2	600
ЖЭУ УДМСиБ Мингорисполкома, тел. 200 26 10			
32	Ул. Короля, 9, комната № 144 на первом этаже общежития. Под оказание услуг проживающим в общежитии, кроме ремонта обуви и услуг, требующих водоснабжения.	14,37	300
33	Ул. Короля, 9, комната № 144а на первом этаже общежития. Под оказание услуг проживающим в общежитии, кроме ремонта обуви и услуг, требующих водоснабжения.	14,4	300
34	Ул. Короля, 9, комната № 105 на первом этаже общежития. Под оказание услуг проживающим в общежитии, кроме ремонта обуви и услуг, требующих водоснабжения.	14,24	300
35	Ул. Короля, 9, комната № 130 на первом этаже общежития. Под оказание услуг проживающим в общежитии, кроме ремонта обуви и услуг, требующих водоснабжения.	13,38	300
36	Ул. Короля, 9, комната № 142 на первом этаже общежития. Под оказание услуг проживающим в общежитии, кроме ремонта обуви и услуг, требующих водоснабжения.	14,29	260
УП «Минский городской центр недвижимости», тел. 328 51 00			
37	Пр. Победителей, 5, комната № 52 на пятом этаже. Под административные цели (офис).	16,0	300
ТКУП «Минский оптовый рынок», тел. 279 40 79			
38	ТЦ «Купаловский», торговое место № 26. Под торговый объект непродовольственной группы товаров.	9,0	500
39	ТЦ «Купаловский», торговое место № 89. Под торговый объект непродовольственной группы товаров.	4,5	250
40	ТЦ «Купаловский», торговое место № 103. Под торговый объект непродовольственной группы товаров.	6,0	400
ТКУП «Минский комаровский рынок», тел. 331 84 00			
41	Ул. В. Хоружей, 8, киоск на территории сезонного рынка, сектор 1, ряд 12, павильон 2. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами.	3,8	300
42	Ул. В. Хоружей, 8, киоск на территории сезонного рынка, сектор 3, ряд 11, павильон 8. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами.	3,7	300
43	Ул. В. Хоружей, 8, киоск на территории сезонного рынка, сектор 3, ряд 11, павильон 10. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами.	3,7	300
44	Ул. В. Хоружей, 8, киоск на территории сезонного рынка, сектор 1, ряд 12, павильон 7. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами.	3,8	300
45	Ул. В. Хоружей, 8, киоск на территории сезонного рынка, сектор 2, ряд 10, павильон 3. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами.	3,6	300
46	Ул. В. Хоружей, 8, киоск на территории сезонного рынка, сектор 2, ряд 11, павильон 11. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами.	4,0	300
47	Ул. В. Хоружей, 8, киоск на территории сезонного рынка, сектор 3, ряд 10, павильон 2. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами.	3,6	300
48	Ул. В. Хоружей, 8, киоск на территории сезонного рынка, сектор 3, ряд 10, павильон 4. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами.	3,6	300
49	Ул. В. Хоружей, 8, киоск на территории сезонного рынка, сектор 3, ряд 10, павильон 8. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами.	3,6	300
50	Ул. В. Хоружей, 8, торговый павильон 62 на антресольном этаже крытого рынка. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами.	10,3	600
51	Ул. В. Хоружей, 8, торговый павильон 68 на антресольном этаже крытого рынка. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами.	10,3	600
52	Ул. В. Хоружей, 8, специфическое сооружение 70.1 на антресольном этаже крытого рынка. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами, оказание услуг.	До 8,0	450
53	Ул. В. Хоружей, 8, торговый павильон 88 на антресольном этаже крытого рынка. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами.	19,6	1 200
54	Ул. В. Хоружей, 8, торговый павильон 110 на антресольном этаже крытого рынка. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами.	10,0	600
55	Ул. В. Хоружей, 8, торговый павильон 120 на антресольном этаже крытого рынка. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами.	10,4	600
56	Ул. В. Хоружей, 8, торговый павильон 121 на антресольном этаже крытого рынка. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами.	18,4	1 200
57	Ул. В. Хоружей, 8, помещение № 6 административно-хозяйственного корпуса на первом этаже. Под склад, хранение, кроме свежей плодоовощной продукции, при условии осуществления торговой деятельности на территории УП «Минский комаровский рынок».	16,4	900
58	Ул. В. Хоружей, 8, помещение № 7 административно-хозяйственного корпуса на первом этаже. Под склад, хранение, кроме свежей плодоовощной продукции, при условии осуществления торговой деятельности на территории УП «Минский комаровский рынок».	17,3	1 200
59	Ул. В. Хоружей, 8, помещение № 8 административно-хозяйственного корпуса на первом этаже. Под склад, хранение, кроме свежей плодоовощной продукции, при условии осуществления торговой деятельности на территории УП «Минский комаровский рынок».	8,8	600
60	Ул. В. Хоружей, 8, блок помещений административно-хозяйственного корпуса на первом этаже. Под оказание услуг населению, парикмахерскую.	41,75	3 500
61	Ул. В.Хоружей, 8, торговый павильон № 14 на территории сезонного рынка, сектор 5. Под торговлю продовольственными товарами, организацию общественного питания.	90,3	5 000
КУП «Бизнесцентр «Столица», тел. 203 79 66, 306 28 41			
62	Пр. Победителей, 59, помещение № 303 на третьем этаже, имеется естественное освещение, водоснабжение, энергоснабжение, санузел. Под административные цели (офис).	9,5	200
63	Пр. Победителей, 59, помещение № 408 на четвертом этаже, имеется естественное освещение, водоснабжение, энергоснабжение, санузел. Под административные цели (офис).	42,9	800
64	Пр. Победителей, 59, помещение № 212 на втором этаже, имеется естественное освещение, водоснабжение, энергоснабжение, санузел. Под административные цели (офис).	45,6	800
65	Пр. Победителей, 59, помещение № 301 на третьем этаже, имеется естественное освещение, водоснабжение, энергоснабжение, санузел. Под административные цели (офис).	98,9	1 800
УБОН Мингорисполкома, тел. 200 99 90			
66	Ул. М. Богдановича, 78, помещение на первом этаже, имеется отопление, энергоснабжение. Под услуги по ремонту бытовой техники, радиоэлектронной аппаратуры или под услуги проката, кроме проката видеопродукции.	107,3	1 900
УП «Городские бани», тел. 222 73 60			
67	Ул. Московская, 7а, баня № 7, часть холла на первом этаже, имеется естественное освещение. Под размещение аппарата по приготовлению кислородных коктейлей.	2,0	420
68	Ул. Сухаревская, 33, часть холла на первом этаже, имеется естественное освещение. Под размещение аппарата по приготовлению кислородных коктейлей.	2,0	420
69	Ул. Космонавтов, 56, БОК «Малиновка», часть холла на первом этаже, имеется естественное освещение. Под размещение аппарата по приготовлению кислородных коктейлей.	2,0	420
ГПО «Коммунальное хозяйство Мингорисполкома», тел. 233 74 31			
70	Ул. Кижеватова, 65б, комната в одноэтажном здании, имеется отдельный вход, отсутствует естественное освещение, отопление. Под склад.	26,7	500
МВД ГУ внутренних дел Мингорисполкома, тел. 229 49 08			
71	Пр-т Дзержинского, 3, помещение в здании УГАИ Мингорисполкома. Под объект общественного питания.	113,7	1 200
Главное управление потребительского рынка, тел. 203 79 66, 306 28 41			
72	Торговый центр «Партизанский», подземный переход перед универмагом «Беларусь», помещение № 4. Под розничную торговлю непродовольственными товарами, реализацию билетов на концертно-зрелищные мероприятия.	6,8	600
УП «Бытэкс», тел. 203 79 66, 306 28 41			
73	Ул. Плеханова, 20, первый этаж комбинат бытового обслуживания, четыре смежных помещения №№ 1, 2, 24, 25 (в том числе № 24 – без естественного освещения). Под бытовые услуги, за исключением ремонта обуви, пошива и ремонта одежды, парикмахерских услуг (маникюр, педикюр).	46,5	900
74	Ул. Московская, 20, три смежных помещения №№ 1, 51, 51а на первом этаже в здании Дома быта, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение. Под прием заказов на ремонт и изготовление мебели.	43,49	800
75	Ул. Я. Лучины, 64, помещение № 69а в специализированном здании бытового обслуживания населения, отсутствует естественное освещение, имеется отопление, энергоснабжение. Под прием заказов на ремонт одежды.	3,72	100
76	Ул. Московская, 20, два смежных помещения № 16, 17 на втором этаже здания Дома Быта, имеется отопление, энергоснабжение, отсутствует естественное освещение. Под административное использование (офис), склад.	10,9	200
77	Ул. Кульман, 5, помещение № 45 на третьем этаже здания Дома быта. Под склад.	15,4	300
КУП «Белизна», тел. 281 37 59, 281 48 42			
78	Ул. Кнорина, 55, помещения на втором этаже под административные цели (офис), в том числе склад – без естественного освещения (27.9 кв.м).	64,8	1 200
ОАО «Строительный трест № 1», тел. 294 21 35			
79	Пр. Машерова, 20, к. 404, помещение на четвертом этаже. Под оказание услуг проживающим.	12,3	300
80	Ул. Пугачевская, 1, комната № 77 на четвертом этаже. Под оказание услуг проживающим.	18,8	400
81	Ул. Пугачевская, 1, комната № 91 на четвертом этаже. Под оказание услуг проживающим.	17,7	400
ГДУП «Городские парки «Минскзеленстроя», тел. 281 65 46			
82	Пр. Независимости, 84, территория парка им. Челюскинцев, 84, специфическое сооружение (площадка № 2) для установки кислородного бара и реализации окси-коктейлей.	4, 0	840
83	Пр. Независимости, 84, территория парка им. Челюскинцев, 84, специфическое сооружение (площадка № 3) для установки кислородного бара и реализации окси-коктейлей.	4,0	840
84	Пр. Независимости, 84, территория парка им. Челюскинцев, 84, специфическое сооружение (площадка № 4) для установки кислородного бара и реализации окси-коктейлей.	4,0	840
85	Пр. Независимости, 84, территория парка им. Челюскинцев, 84, специфическое сооружение (площадка № 1). Для реализации сувениров, сувениров-розыгрышей.	4,0	840
86	Ул. Фрунзе, 2, территория центрального детского парка им. Горького, специфическое сооружение (площадка № 3) для установки кислородного бара и реализации окси-коктейлей.	4, 0	840
87	Ул. Фрунзе, 2, территория центрального детского парка им. Горького, специфическое сооружение (площадка № 4) для установки кислородного бара и реализации окси-коктейлей.	4, 0	840
88	Ул. Фрунзе, 2, территория центрального детского парка им. Горького, специфическое сооружение (площадка № 5) для установки кислородного бара и реализации окси-коктейлей.	4, 0	840
89	Ул. Фрунзе, 2, территория центрального детского парка им. Горького, специфическое сооружение (площадка № 2) для установки аттракциона по раскрашиванию гипсовой скульптурки и лица детей красками.	2,0	420
90	Ул. Фрунзе, 2, территория центрального детского парка им. Горького, специфическое сооружение (площадка № 6) для реализации сувениров, сувениров-розыгрышей.	4,0	840
91	Ул. Фрунзе, 2, территория центрального детского парка им. Горького, специфическое сооружение (площадка № 1) для установки аттракциона 4D стерео-кинотеатр (экран-полусфера 180°)	100,0	2 000
УО «Минский государственный дворец детей и молодежи», тел. 233 70 29			
92	Ул. Старовиленский тракт, 41, площадь на первом этаже с левой стороны мраморного зала. Под объект по продаже кислородных и фруктовых коктейлей.	8,0	1 600
93	Ул. Старовиленский тракт, 41, площадь на первом этаже с левой стороны мраморного зала. Под объект по продаже развесного мороженого.	10,0	2 000
УЗ «3-я городская клиническая больница им. Е.В. Клумова», тел. 222 27 95			
94	Ул. Ленина, 30, место в вестибюле первого этажа хирургического корпуса. Под аппарат по реализации средств гигиены, товаров хозяйственного обихода, парфюмерно-косметической продукции, товаров культурно-бытового назначения.	1,0	210
УЗ «Амбулатория № 2», тел. 298 81 91, 223 59 47			
95	Ул. Я. Лучины, 6, площадь, расположенная в холле первого этажа амбулатории. Под размещение торгового объекта по реализации оздоровительного питания и лечебной косметики.	5,42	1 100
УЗ «26-я городская поликлиника», тел. 256 81 90, 223 59 47			
96	Ул. Кунцевщина, 8, площадь, расположенная в холле четвертого этажа педиатрического отделения поликлиники. Под размещение детских кресел-качалок с электроприводом.	4,0	840
УЗ «34-я центральная районная клиническая поликлиника», тел. 292 00 43			
97	Ул. Кульман, 22, площадь, расположенная в холле первого этажа поликлиники. Под торговый объект по реализации оздоровительного питания и лечебной косметики.	5,6	1 100
КУП «Специальный дом для ветеранов, престарелых и инвалидов № 1», тел. 214 83 32, 214 83 34			
98	Пр-т Рокоссовского, 50, помещение № 34. Под административные цели (офис).	9,4	200
99	Пр-т Рокоссовского, 50, помещение № 32, встроенная охлаждаемая камера.	6,8	200
100	Пр-т Рокоссовского, 50, помещение № 27, встроенная охлаждаемая камера.	7,0	200
КУП «Гаражи, автостоянки и парковки», тел. 252 20 98			
101	Территория Подземные переходы, д. 13 – общественно-торговый центр с паркингом, имеется отопление, энергоснабжение, вентиляция, отсутствует естественное освещение. Для размещения торгового объекта по реализации кислородных коктейлей.	1,5	300
УП «Минсккоммунтеплосеть», тел. 267 64 02			
102	Ул. Нестерова, 9, помещение № 1. Под производственное использование, при условии согласования с санэпидемстанцией и МЧС.	104,9	1 900
103	Ул. Бельского, 39а, помещение в производственном здании. Под производственное использование при условии согласования с санэпидемстанцией и МЧС.	119,4	2 100
ЭКУП «СоколКоммунСервис», тел. 279 61 27			
104	Ул. Барамзиной, 12а, площадь на первом этаже административного здания в фойе отделения общей практики. Под салон сотовой связи.	8,0	1 600
Филиал «Минский автовокзал», автовокзал «Восточный», тел. 219 36 59			
105	Место в зале ожидания на третьем этаже, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение. Под букмекерскую контору.	5,0	1 000
Филиал «Троллейбусный парк № 4», диспетчерская станция «Сухарево», тел. 204 79 15			
106	Ул. Лобанка, 92, часть помещения в здании диспетчерской станции на первом этаже. Для размещения аппарата по продаже горячих напитков.	1,5	300
Филиал «Троллейбусный парк № 4», диспетчерская станция «Масюковщина», тел. 204 79 15			
107	Ул. 1-я Радиаторная, 126, часть помещения в здании диспетчерской станции на первом этаже. Для размещения аппарата по продаже горячих напитков.	1,5	300
Филиал «Троллейбусный парк № 4», тел. 204 79 15			
108	Ул. Харьковская, 16, изолированное помещение на первом этаже административно-бытового корпуса № 2, имеется энергоснабжение, отопление, санузел совместного пользования, требуется косметический ремонт. Под непроизводственное – офис.	15,5	300
Филиал «Автобусный парк № 4», диспетчерская станция «Славинского», тел. 294 20 52			
109	Ул. Славинского, 18, помещение в отдельно стоящем одноэтажном здании, имеется отопление, водоснабжение, энергоснабжение. Под административные цели (офис).	32,4	600
Филиал «Автобусный парк № 7», диспетчерская станция «Зеленый луг-6», тел. 261 51 53			
110	Ул. Мирошниченко, 57, часть помещения в здании диспетчерской станции. Для размещения аппарата по продаже горячих напитков.	1,5	300
КПУП «Минскреклама», тел. 252 20 89			
111	Ул. Гурского, 38, производственное помещение (оформительский цех). Под склад.	100,8	1 800
112	Ул. Захарова, 76, помещение в блоке вспомогательных производств. Под склад.	51,2	900
113	Ул. Захарова, 76, помещение в блоке вспомогательных производств. Под производство по обработке стекла.	65,36	1 200
ТКУП «Универмаг Беларусь», тел. 295 00 87			
114	Ул. Жилуновича, 4, площадь для реализации билетов на концертно-театральные мероприятия.	2,7	550
115	Пер. Толстого, 12, комната № 3 на первом этаже. Под ксерокопирование.	15,8	1 500

Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.

Аукцион состоится 25 февраля 2010 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Документы на участие принимаются с 15 по 23 февраля 2010 г. в рабочее время, 24 февраля 2010 г. с 9.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота на расчетный счет № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости». Перечень и порядок подачи документов для участия в аукционе определены Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 23.09.2009 № 250.

Осмотр объектов недвижимости, право заключения договоров аренды которых выставлено на аукцион, обеспечивают арендодатели.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. Договор аренды с победителем аукциона заключается в срок, установленный законодательством и решением Мингорисполкома о сдаче в аренду.

Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан возместить УП «Минский городской центр недвижимости» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под роспись.

Телефон для справок (017) 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by.

ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА ЛЮТЫ

13 лютага. Сённяшняя стрыжка зробіць вас не толькі больш прывабнымі, але і прыцягне ўдачу.

14 лютага. Стрыжка, зробленая ў гэты дзень, пойдзе на карысць не толькі вашай знешнасці, але і духоўнаму свету. У вас абвострыцца інтуіцыя і ўзмоцніцца праніклівасць розуму.

15 лютага. Сёння можаце смела накіроўвацца да цырульніка. Зробленая сёння стрыжка зменіць ваша жыццё да лепшага. У найбліжэйшыя месяцы пачнуць адбывацца спрыяльныя змены ў асабістым жыцці, кар'еры і стане здароўя.

16 лютага. Сённяшні дзень выдатна падыходзіць для змены іміджу. Зробленая сёння стрыжка ўзбагаціць вас не толькі эстэтычна, але і практычна: ваша фінансавае становішча істотна палепшыцца.

17 лютага. Стрыжка валасоў у гэты дзень можа пагоршыць ваш стан здароўя. Сёння лепш пазбягаць змянаў знешняга выгляду.

18 лютага. Стрыжка, зробленая ў гэты дзень, пойдзе на карысць не толькі знешнасці, але і вашаму духоўнаму свету. У вас абвострыцца інтуіцыя і ўзмоцніцца праніклівасць розуму.



19 лютага. Сёння можаце смела накіроўвацца да цырульніка. Стрыжка зменіць ваша жыццё ў лепшы бок. У найбліжэйшыя месяцы станоўчы ўплыў адаб'ецца на здароўі, асабістым жыцці і працы.

20 лютага. Сёння можаце смела накіроўвацца да цырульніка. Стрыжка станоўча адаб'ецца на вашым матэрыяльным становішчы.

21 лютага. Сёння вельмі неспрыяльны дзень для наведвання цырульні. Стрыжка валасоў прыцягне да чалавека шмат праблем, хваробаў і сварак.

22 лютага. У выніку стрыжкі валасоў вы прыцягніце ў сваё жыццё удачу і радасць.

23 лютага. Вельмі дрэнны дзень для стрыжкі валасоў: могуць з'явіцца розныя захворванні. Калі хочаце пазбегнуць праблем са здароўем, трымайцеся сёння далей ад цырульні.

24 лютага. Сённяшняя стрыжка прынясе задавальненне ўласнай знешнасцю і ўдачу.

25 лютага. Сёння ад стрыжкі лепш устрымацца, інакш могуць узнікнуць праблемы ў розных галінах жыцця. Негатыўныя звычкі і парокі праявяцца ў поўнай меры, узрасце цяга да алкаголю, а магчымасць кантраляваць свае эмоцыі, наадварот, зменшыцца.

26 лютага. Гэты дзень быццам бы створаны для візіту да цырульніка. Зробленая сёння стрыжка прыцягне паляпшэнне фінансавага становішча, павелічэнне ўласнасці і прыхільнасць начальства.

27 лютага. Стрыжкай, зробленай у гэты дзень, будзеце задаволеныя і вы, заўважаць яе і навакольныя.

28 лютага. Выдатны дзень для наведвання цырульні: новая стрыжка прыцягне ўдачу і дабрабыт.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Блізнятам варта прыслухацца да голасу інтуіцыі, а Дзевам давядзецца разлічваць толькі на свае сілы

ВАЕН. На шляху да ажыццяўлення планаў будзе шмат спакус, здольных адвесці вас убок. Будзьце больш асцярожнымі, калі дзейнічаеце на падставе нядаўна атрыманай інфармацыі, таму што вераградныя пэўныя скажэнні, якія могуць увесці вас у зман. Калі галава перапоўненая ідэямі, паспрабуйце пакуль не прымаць ніякіх сур'ёзных рашэнняў — неабходна дачакацца важных навінаў. Тым, хто апынецца далёка ад дома, неабходна пазбягаць малазнаёмых кампаній.

ЦЯЛЕЦ. Надыходны тыдзень, хутчэй за ўсё, будзе насычаны падзеямі, а вынікі будуць залежаць ад вашай разважнасці і ўмення імгненна рэагаваць на раптоўныя змены. У панядзелак непажаданая паспешнасць у рашэннях. У гэты дзень галоўнымі якасцямі павінны стаць акуратнасць і інтэлект. Аўторак спрыяльны для змены працы. Пятніца — неспрыяльны дзень для вандраванняў. Пажадана праводзіць вольны час з карысцю для дома або для здароўя.

БЛІЗНЯТЫ. Калі пераможаце залішні скептыцызм і празмерную разважлівасць, справы пойдуць на лад — вось тады і адкрыеце для сябе цікавыя прапановы. Больш прыслухоўвайцеся да голасу інтуіцыі. У пачатку тыдня, асабліва ў панядзелак, давядзецца адстойваць свае пазіцыі. Рашэнне, прынятае ў сераду, будзе спрыяць вынікам, якія пацешаць. У сярэдзіне тыдня магчымае павышэнне па службе або прэмія. Блізкі чалавек можа прыгатаваць прыемную неспадзеўку.

РАК. Паспрабуйце атрымаць задавальненне нават ад бягучых спраў, адкрыйце сваё жыццё для новых магчымасцяў і сустрэч. У аўторак падумайце пра будучыню. Зоркі прадказваюць, што перыяд сварак з партнёрамі можа скончыцца ў любую хвіліну, так што вашай задачай стане ісці насустрач, працаваць над адносінамі. У сераду не купляйцеся на шчодрыя абяцанкі — толькі тады апыняцеся ў выйгрышы. У другой палове тыдня ёсць верагоднасць клопатаў і хваляванняў, якія будуць звязаны з праблемамі сяброў. Паспрабуйце разабрацца ў сваім асяроддзі: не выключана, што вас выкарыстаюць.

ЛЕЎ. Навакольныя пачнуць разумець, чаго вы насамрэч вартыя. Так што не расчаруйце іх, праявіце свае ўтоеныя і ўжо тым больш агульнавядомыя таленты. Чым больш актыўны стыль жыцця вы для сябе выбераце, тым лягчэй усё будзе атрымлівацца. Асабліва напружанымі могуць апынуцца панядзелак і пятніца. У панядзелак пажадана праяўляць асцярожнасць ва ўсіх справах: хоць у большасці выпадкаў гэта будзе безгрунтоўным, але часам вельмі да месца. У аўторак могуць адбыцца доўгачаканыя прыемныя падзеі. Паспрабуйце выхадныя дні прысвяціць хатнім справам.

ДЗЕВА. Тыдзень спрыяльны для завяршэння назапашаных спраў. Праявіце ўласцівую вам добрасумленнасць і пунктуальнасць, звярніце пільную ўвагу на дробязі — тады не давядзецца выпраўляць памылкі, таму што іх проста не будзе. Паспрабуйце менш крытыкаваць калегаў — яны і так усё зразумеюць. Можаце разлічваць толькі на свае сілы, бо сябры не заўсёды змогуць дапамагчы.

ШАЛІ. Паспрабуйце праявіць мэтанакіраванасць і рашучасць. Не сумнявайцеся ў пастаўленых мэтах — для іх дасягнення можна выкарыстоўваць амаль усе легальныя сродкі. Вось толькі прыйсці да рашэння пастаўленых задач будзе няпроста. Аналізуйце свае памылкі і ідзіце наперад, узброіўшыся новымі ведамі. Паспрабуйце надаць дастаткова ўвагі сваякам, у адваротным выпадку ў сям'і магчымы разлад.

СКАРПІЁН. Вас чакае вельмі шмат працы. Калі і справіцеся з ёй, то толькі дзякуючы добраму стаўленню тых, каго можаце паклікаць на дапамогу. Маштабнасць ідэй можа перашкодзіць рэальна ацаніць свае магчымасці. Абмеркаванне праблем у вышэйстаячых інстанцыях у другой палове тыдня будзе паспяховым. Паспрабуйце хоць трохі часу прысвяціць утульнасці ва ўласным доме, каб мець магчымасць адпачыць у ім пасля цяжкай працы.

СТРАЛЕЦ. Важнай будзе вонкавая рэспектабельнасць, а справы не дадуць забыцца аб заўтрашнім дні. Абвострыцца інтуіцыя — не выключана, што нават дапаможа выбытацца з вельмі няпростай сітуацыі. Людзі, з якімі працуеце, будуць аказваць на вас вялікі ўплыў, што не вельмі пажадана цяпер. У пятніцу сустрэча са старым сябрам, якую вы даўно адкладалі, нарэшце адбудзецца і прынясе пэўную карысць. У нядзелю будзьце больш акуратнымі ў словах і ўчынках, інакш у вашых руках замест традыцыйнай сініцы (аб журавлі зоркі і не заікаюцца) апынецца зусім іншы, значна менш прывабны прадстаўнік фаўны.

КАЗЯРОГ. Можаце ўздыхнуць спакойна, асабліва калі вырашылі ўсе або амаль усе назапашаныя праблемы і засталіся толькі малаважныя недаробкі. Прысвяціце больш часу адпачынку. Яшчэ лепш было б узяць водпуск і паехаць куды-небудзь на мора, да цяпла і сонца. Актыўны адпачынак — цудоўны сродак, які дазваляе назапасіць сілы і сканцэнтравацца на будучых здзяйсненнях. У аўторак можа паступіць цікавая і важная інфармацыя. Удалай ідэяй стане любое супрацоўніцтва. Серада і чацвер добрыя для заключэння партнёрскіх дамоў. Супрацьпаказаныя справы, звязаныя з агнём, металам і вострымі прыладамі. У пятніцу верагодна павышэнне працаздольнасці — можаце паспець практычна ўсё, што запланавалі, і нават больш.

ВАДАЛЕЙ. Паспрабуйце не вельмі выхваляцца сваімі магчымасцямі і вартасцямі. Бываюць моманты, калі сціпласць таксама становіцца ўпрыгажэннем, і якраз адзін з іх цяпер наступіў. Першая палова тыдня больш за ўсё падыходзіць для завяршэння і выпраўлення недапрацовак у любой сферы. Чым больш альтруізму і падтрымкі праявіце па стаўленні да навакольных, тым больш пазітыўнымі будуць змены ў вашым жыцці. З'явяцца новыя праекты і планы, якія паспяхова рэалізуюцца ў будучыні. У чацвер могуць паступіць прапановы і парады, якія пададуцца дзіўнымі. Не адмаўляйцеся адразу, варта ўзважыць усе «за» і «супраць». Ваша асноўная каштоўнасць будзе заключацца ва ўменні арганізоўваць любую справу.

РЫБЫ. Давядзецца адстойваць сваё меркаванне і прынцыпы. Не варта недаацэньваць сілу ўласнай прывабнасці: з яе дапамогай зможаце раззброіць апанентаў. У панядзелак непажадана марнаваць час і нервы на плёткі. У аўторак менш гаварыце, больш слухайце. У канцы тыдня можаце атрымаць нечаканую і неацэнную падтрымку сяброў або заступнікаў. У выхадныя дні надайце належную ўвагу сям'і і дому — і пераканаецеся, што блізкія здольныя зрабіць больш, чым вы чакаеце.



Шаноўнага **Міхаіла Уладзіміравіча МІРОНЧЫКА** са знамянальнай для яго датай — **Днём памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў** — віншуюць калектыў і адміністрацыя гімназіі № 56 г. Мінска.

Натхнення зычым мы і творчага ўзлёту,
Дзён сонечных і зорных вечароў,
Здароўя моцнага, душы палёту,
Найлепшых вучняў зноў і зноў.

У КЛІЧАЎСКІМ РАЁНЕ АБРАБАВАЛІ БАНКАМАТ

У аграгарадку Арэхаўка ў ноч з 10 на 11 лютага абрабаваны банкамат ААТ «Белаграпрамбанк». Невядомыя зладзеі пранікліў адміністрацыйны будынак саўгаса «Дабраволец», дзе не было ахоўнай сігналізацыі. Яны выставілі акно, узламалі банкамат і скралі 28 мільёнаў рублёў. Міліцыя шукае злачынцаў.

Алена КАЗЛОВА.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.





Ну што, паважаныя мае кулінары, адпачылі крыху, час зноў надзяваць фартухі — і да пліты! Як гаворыцца ў вядомым мультфільме — на носе Масленіца, якая сёлета супала з Днём усіх закаханых. Таму сённяшняе меню ўгадаць не цяжка. Будзем пячы бліны і гатаваць рамантычную вячэру для каханых. Дарэчы, Масленіца заўсёды была самым вясёлым і любімым славянскім святам. Нястрыманае абжорства і весялосць разглядаліся як гарантыя будучага дабрабыту, працвітання і поспеху. Таму гатуйце шмат і смачна, будзьце шчаслівыя і ў нядзелю абавязкова даруйце мне ўсё!

СЫРНЫЯ БЛІНЫ

Вазьміце: *2,5 шклянкі мукі, 5 яек, 100 г цукру, 200 г алею, 3 шклянкі малака, 3/4 чайнай лыжкі солі і 300 г сыру.*

На дробнай тарцы надзерці сыр. Аддзяліць жаўткі ад бялкоў. Узбіць жаўткі з малаком, дадаўшы туды ж надзёрты сыр, муку і соль. Узбіць бялкі і дадаць атрыманую бялковую пену ў цеста. Абсмажваць у алеі да атрымання залацістай хрумсткай скарыначкі. Пры гэтым блінчыкі павінны быць невялікімі.

МАННЫЯ БЛІНЧЫКІ З РАЗЫНКАМІ

Нам спатрэбіцца: *250 г манных крупаў, 200 г здробненага цёмнага шакаладу, 2 яйкі, 100 г разынак, соль, алей для запякання.*

У малацэ размяшаць яйкі, манныя крупы і дадаць соль. Масе даць пастаяць нейкі час, каб крупы разбухлі. Затым усыпаць прамытыя разынкі, добра размяшаць. Прыгатаваную масу з маннымі крупамі можна наліваць лыжкай на добра разагрэтую бляху з кіпячым топленым маслам або алеем і выпякаць. Спечаныя блінчыкі накалоць відэльцам і зноў паставіць у духоўку на некалькі хвілін. Падаваць, пасыпаўшы цукровай пудрай.

САЛАТА З КУРЫЦЫ З ВІНАГРАДАМ «ПЯШЧОТНАЕ СЭРЦА»

Нам спатрэбіцца: *1 курыная грудка, 1 шклянка грэцкіх арэхаў, 100 г цвёрдага сыру, 4 яйкі, маянэз, 400—500 г вінограду.*

Курыную грудку адварыць да гатоўнасці, астудзіць, нарэзаць дробнымі кавалкамі. Арэхі грэцкія здрабніць. Сыр надзерці на дробнай тарцы. Яйкі адварыць і дробна натаркаваць. Кожную вінаградзінку разрэзаць напалам, выдаліць костачкі. Салату выкласці на вялікую пасудзіну слаямі ў форме сэрца, кожны са слаёў прамазваючы маянэзам.

ЦЁПЛЫ ШАКАЛАДНЫ КЕКС

Вазьміце: *6 ст. лыжак сметанковага масла, 200 г здробненага цёмнага шакаладу, 2 яйкі, 2 яечныя жаўткі, 1/2 шклянкі цукру, 1,5 ст. лыжкі кававага лікёру, 1/3 шклянкі мукі.*

Нагрэйце духоўку да 200 °С. Формачкі для кексаў змажце маслам і пасыпце мукой, перакуліце і крыху пастукайце аб стол, каб выдаліць лішнюю муку (замест мукі можна выкарыстаць манку). На паравой лазні растапіце масла і шакалад. Зніміце з агню і пакуль адстаўце ўбок. У вялікай місцы ўзбіце яечныя жаўткі і 1/3 шклянкі цукру. Уліце ў атрыманую масу 1 ч. лыжку лікёру. Цяпер уліце шакаладную масу, затым дадайце муку. Раскладзіце цеста ў формачкі, пастаўце іх на бляху і запякайце ў духоўцы на працягу 9—11 хвілін. Дастаньце з духоўкі і дайце астыць на працягу 10 хвілін. Атрымліваецца 6 смачных кексаў.

Ядомы анекдот

На Масленіцу ў Цэнтральным гарадскім парку культуры і адпачынку прайшоў традыцыйны конкурс на лепшага спевака і танцора. Пераможцы... дастаўленыя ў выцвярэзнік.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

Дыета для закаханых

Афрадызіякамі (рэчывы, якія ўзмацняюць любоўную цягу) могуць быць не толькі траўкі і эфірны алей, але і ежа. І калі на Усходзе жонкі гатуюць сваім мужам вельмі спецыфічныя стравы, то мы з вамі можам абысціся больш даступнымі і не менш эфектыўнымі сродкамі. Нават звычайны жытні хлеб ці сухарыкі з яго могуць павысіць любоўнае жаданне, бо, як кажуць, было б жаданне, а спосаб яго павысіць заўсёды знойдзецца.

Прадукты, якія распальваюць «любоўны агонь», можна раздзяліць на некалькі катэгорый.

У першую чаргу гэта доўгі спіс садавіны, прычым у гэты спіс увахо-дзяць не толькі такія экзатычныя экзэмпляры, як авакада ці ананасы, але і прывычныя ўсім вінаград, дыні і персікі. А калі казаць шчыра, то любая садавіна вельмі карысная ў любоўнай справе, бо яна змяшчае не толькі шмат вітамінаў і мінеральных рэчываў, але і духмяны эфірны алей, які стымулюе цэнтры задавальнення ў арганізме, паляпшае настрой. Не забывайце і пра сухафрукты, у якіх карысныя рэчывы зна-ходзяцца ў канцэнтраваным выглядзе, таму ў суткі дастаткова з'ядаць жменю фінікаў, курагі, чарнасліву ці разынак.

Ёсць свае фаварыты і сярод агародніны, і асабліва славіцца цыбуля рэпка. Сырая, вараная і печаная цыбуля — надзейны сродак павышэн-ня патэнцыі ў мужчын, ды і жанчынам не пашкодзіць іншы раз ужыць гэты вітамінны прадукт. Часнок, спаржа, шпінат і сельдэрэй — таксама ўваходзяць у спіс узбуджальных сродкаў.

Наступны пласт карысных прадуктаў — гэта разнастайныя арэшкі і семкі, якія змяшчаюць такія незаменныя амінакіслоты, што ніводна-му віду мяса і не снілася. Асабліваю ўвагу звярніце на грэцкія арэхі і семкі гарбуза.

Любая любоўная дыета павінна ўключаць у сябе мёд і розныя мё-дапрадукты, а яшчэ марскую рыбу (асабліва ласось, фарэль, камбалу), крэветкі, вустрыцы, крабы. З бялковых прадуктаў вельмі добрыя сыр, грыбы (перавагу аддавайце лісічкам і шампіньёнам), рэкардсменамі ж па папулярнасці сярод аздараўляльных прадуктаў з'яўляюцца перапя-ліныя яйкі. Для дасягнення прыкметнага выніку дарослому чалавеку трэба з'ядаць па пяць яек тры разы на дзень. Курс прыёму перапялініых яек цудадзейна ўздзейнічае як на любоўныя жаданні, так і на здароўе ў цэлым. У вас палепшыцца знешні выгляд, валасы і пазногці стануць мацнейшымі, прыбавіцца сілаў і энергіі.

Розныя пікантныя дабаўкі таксама значна павялічаць эфектыўнасць іншых прадуктаў. Да іх адносяцца многія прыправы і спецыі, у тым ліку кардамон, каляндра, гваздзіка і аніс, а яшчэ размарын, шафран, перац, імбір, мускатны арэх і, вядома, хрэн.

САМІ З РУКАМІ

Сардэчная кішэнька

Прыгожы і карысны падарунак да Дня святога Валянціна можна зрабіць сваімі рукамі.

Для работы спатрэбіцца: *шчыльная тканіна (лепш фетр) чырвонага колеру — 20х20 см; залацісты шнур — 1,5 м; жалезны кручок для вязання; шыла; кравецкая крэйда.*



Выражце з паперы сэрцайка (гл. схему). Пры дапамозе гэтага шаблону намалюйце крэйдай на тканіне дзве дэталі. Выражце іх строга па контуры. Складзіце загатоўкі разам, пракаліце шылам на адноль-кавай адлегласці адтуліны і прашыйце залацістым шнурам з дапамогай кручка. Прымацуйце дзяржанне, упрыгожце банцікам. «Сардэчная» кішэнька гатовая.



-2634-

МАЛЕНЬКІЯ ХІТРЫКІ

Каханне на снеданне

Само сабой зразумела, што сняданне ў Дзень усіх закаханых павінна быць асабліва паэтычным, таму сурвэтка ў форме сэрца стане пікантным упрыгажэннем святочнага стала. Складзіце сурвэтку трохвугольнікам, скруціце ў трубачку, надайце форму сэрца і замацуйце тасьмой.

Сардэчныя булачкі

Падсаладзіць адносіны раім смачным печывам.

Для цеста: *3 шк. мукі, 2 яйкі, 1 ст. лыжка сухіх дражджэй, 1 шк. малака, 0,5 шк. цукру, 50 г масла.*

Для ўпрыгажэння: *1 яйка, 0,5 пліткі малочнага шакаладу, 100 г масла, 100 —150 г мукі, 1/3 шк. цукру.*

Замясіце дражджавое цеста і пакіньце на 30 хвілін, каб цеста падняло-ся. Раздзяліце на невялікія кавалачкі, сфармуйце з іх сэрцайкі, пакладзіце на прамасленую бляху (можна скарыстаць, калі ёсць, фор-мачкі ў выглядзе сэрцайкаў).

Узбіце яйка, змажце булачкі. Для салодкай пасыпкі разатрыце масла з мукой і цукрам, абсыпце частку булачак. Пастаўце булачкі ў духоўку на 30—40 хвілін.

Растапіце на вадзяной лазні шакалад, астудзіце, каб ён стаў густым, выкладзіце на паперу ў выглядзе маленькіх конусаў. Прыбярыце ў халадзільнік, каб застылі. Гатовыя булачкі астудзіце, упрыгожце не-абсыпаныя булачкі пірамідкамі.

ВАРТА ПРЫСЛУХАЦЦА

Прывабліваем рамантыку

Вы жывяце ў чаканні цудоўнага прынца (прынцэсы), але ён (яна) усё не з'яўляецца. Вы ходзіце ў спартзалу, і ваша фігура ўжо даўно нагадвае мадэльную, наведваеце бібліятэку і нават праславіліся як цікавы суразмоўца, аднак усё гэта не дапамагае, быццам другая палавінка недзе згубілася. Магчыма, у гэтым выпадку вам дапаможа кітайская навука фэн-шуй? Менавіта яна дае парады, як прывабіць рамантычныя адносіны ў ваша жыццё. Такім чынам...

● Агледзьце сваю кватэру — ці не занадта шмат у ёй аднастайнай энергіі? Калі вы жанчына, то не застаўляйце памяшканне вазачкамі і статуэткамі з выявамі жанчын, не завешвайце рушамі і кветкамі ці карцінамі з дзяўчатамі. Калі ж вы мужчына, то сачыце за тым, каб у пакоі прысутнічалі не толькі нажы, паляўнічыя стрэльбы і мадэлі машын. У першым выпадку ў кватэры перавага аддадзеная жаночай пасіў-най энергіі (інь), якая проста перашкаджае мужчынам увайсці ў ваша жыццё (пагадзіцеся, сярод суцэльных ружовых навалачак і рушачак любы мужчына адчуе сябе няўтульна), а ў другім выпадку асноўнай у доме з'яўляецца мужчынская энергія (янь), лішак якой не дае ўпусціць у жыццё мужчыны жанчыну.

● Пастаўце ў спальні якія-небудзь прыемныя дробязі парамі (на-прыклад, падсвечнікі ці проста свечкі), павесьце карцінку з дзвюма птушачкамі ці пастаўце парную статуэтку мужчыны і жанчыны — гэта хутчэй дапаможа вам знайсці сваю пару.

● Калі ж у вас ужо ёсць другая палавінка, аднак у вашых адносінах з'явіліся праблемы, то звярніце ўвагу на... матрац — ён павінен быць суцэльным. Калі вы спіце з жонкай ці мужам на розных матрацах, то гэта аказвае раз'яднальнае дзеянне, гэтак жа, як і два ложкі, нават калі яны стаяць побач.

● Сачыце за тым, каб над ложкам не было столевых бэлек і кніжных паліц, бо яны энергетычна ціснуць на вас, прыгнятаючы, і гэта не можа не адбіцца на настроі і самаадчуванні.

-2635-

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.34	17.14	9.40
Віцебск —	7.27	17.01	9.34
Магілёў —	7.24	17.04	9.40
Гомель —	7.16	17.05	9.49
Гродна —	7.48	17.30	9.42
Брэст —	7.45	17.35	9.50

Месяц

Маладзік 14 лютага.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Віктара, Івана, Кіра, Клаўдзія, Мікіты, Нікіфара.*

К. *Арлеты, Катарыны, Рыгора, Юльяна.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра



13 лютага

Дзве даты

1705 год — нарадзілася Радзівіл Францішка Уршуля, вядомая пісьменніца і драматург. Прадстаўніца старажытнага княжацкага роду Вішнявецкіх, якім належалі шырокія зямельныя ўгоддзі і маёнткі ва Украіне і ў Беларусі (у тым ліку Брагін, Столін, Хойнікі, Целяханы), была жонкай Міхала Казіміра Рыбанькі з роду Радзівілаў. Францішка Уршуля лічылася адной з самых адукаваных жанчын свайго часу. З 1725 года жыла ў Нясвіжы, дзе па яе ініцыятыве ў 1740 годзе быў заснаваны першы ў гісторыі славян Нясвіжскі прыдворны тэатр Радзівілаў, які існаваў больш як 50 гадоў. Для яго яна напісала 16 драматычных твораў і оперных лібрэта, рабіла пераклады твораў Мальера і Вальтэра. Памерла княгіня Францішка Уршуля ў 1753 годзе. Дзейнасць гэтай неардынарнай жанчыны яшчэ па-сапраўднаму не ацэнена, не ўсвядомлена, хоць яе спадчына — вялікая, разнапланавая, цудоўная — сапраўдны гонар беларускай і польскай літаратур.

1633 год — інквізіцыя ў Рыме арыштавала астранома Галілея Галілея.

Цытата дня:

«Не наракайце на надвор'е — дзевяць з дзесяці чалавек не змаглі б пачаць няўдалую размову, калі б надвор'е не мянялася».

Хабард Кін (1868-1930), амерыканскі пісьменнік.

ДАРАВАЛЬНАЯ НЯДЗЕЛЯ

Свет і сусвет чалавека

Дагарэла святочнае вогнішча. Агульны лямант, жарты, песні заціхлі. Заўтра пачнецца пост, які накладваў на паводзіны чалавека, сям'і і ўсёй вёскі цэлы шэраг даволі жорсткіх абмежаванняў. Своеасаблівым пераходным мастком у Вялікі пост была апошняя святочная вячэра, якая атрымала назву «загавіны». Дзе-нідзе «ў загавіны» збіралася вясковая моладзь або прыходзілі суседзі, але найчасцей гэта была ўласна сямейная вячэра. Яна была сціплай і стрыманай па характары. Пасля яе трэба было вельмі старанна вымыць посуд, каб ад тлушчу і следу не засталося (ні на талерцы, ні на патэльні).

● Святочная трапеза заканчвалася выключным па змесце абрадавым дзеяннем, якое дало назву ўсяму дню — «даравальная нядзеля». Заўтрашні дзень распачне новы год, новы цыкл жыццёвых падзей, чарговы колаварот земляробчых спраў. Пачнецца ўзнаўленне новай мадэлі сялянскага свету. Каб ён атрымаўся прывабным, жыццяздольным і гарманічным, пачынаць «новабудоўлю» трэба было з выканання адпаведнага абрада калектыўнага духоўнага ачышчэння.

● Заключны этап святочнай вячэры пераносіўся ў сакральную зону хаты — у чырвоны кут. Пад абразамі садзіўся гаспадар, чытаў малітву і прасіў прабачэння ў сваіх «радзіцеляў» — дзядоў і прадзедаў. Затым па чарзе, пачынаючы ад старэйшага, на сярэдзіну хаты выходзілі сыны і дочкі і таксама прасілі прабачэння ў бацькі: «Даруй, бацька родны, калі чым саграшыў перад табою, справай ці языком». Апошняй прасіла прабачэння маці вялікага сямейства. Пасля гэтага ўсе дамачадцы садзіліся на лавы (хлопцы справа, дзяўчаты злева), бацька выходзіў на сярэдзіну хаты, тройчы нізка кланяўся ўсяму сямейству і таксама прасіў дараваць за нядобрае слова або благі ўчынак.

● Самым высокім статусам дараванне быў надзелены абрад ачышчэння ў цэрквах, дзе напрыканцы богаслужэння святар прасіў прабачэння ва ўсіх прыхаджан. У адказ на яго словы ў храме гучаў сакральна-магічны рэфрэн «Бог даруе! Бог даруе! Бог даруе»!

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

Калі дзіця слухае бацькоў, то яно думае пра нешта сваё.

Калі жонка слухае мужа, то ён кажа пра павышэнне зарплаты.

Калі муж слухае жонку, то футбол ужо скончыўся, а навіны яшчэ не пачаліся.

Калі цешча слухае зяця, то гэта чужы зяць.

Калі зяць слухае цешчу, то ён працуе ў спецслужбе.

☺

Экзаменатар і студэнт:
— Ведаеш?
— Ведаю.
— Што ведаеш?
— Прадмет ведаю.
— Які прадмет?
— Які здаю.
— А які здаеш?
— Ну гэта вы чапляеце-ся!

☺

НЗ на дзіцячым ра-нішніку — хлопчык у касцюме грыбніка біў нагой хлопчыка ў касцюме мухамора.

☺

Бацька — дачцэ:
— Не раскідвай смецце, паважай чужую працу!
— Мама мне не чужая!

☺

Палюбоўніку ад цябе трэба толькі адно, а мужу падавай і першае, і другое, і кампот.

— Фіма, на візу знімеш?
— Тры селядцы — і едзьце хоць у Амерыку!..

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 724. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12